КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 31 (1261) 30 ліпеня 2016 г.

Актуальна

ШТО ДАЕ НАМ КОДЭКС?

Як у старадаўнія часы на нашых землях калісьці нарадзілася першая на еўрапейскай прасторы Канстытуцыя — Статут ВКЛ — так і сёння краіна Беларусь стала першай у свеце, дзе з'явіўся яшчэ адзін унікальны гістарычны дакумент, які не мае аналагаў.

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў прыняты Палатай Прадстаўнікоў і адобраны Саветам Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры. Выпуск грандыёзнага выдання будзе ажыццяўляць Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі краіны.

Падпісанне беспрэцэдэнтнага дакумента выклікала шмат водгукаў найперш дзеячаў нацыянальнай культуры. Адзін з іх мы сёння і друкуем.

Алесь СУША,
намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь



Па-першае, больш сістэмнасці ў заканадаўстве. Нормы большасці законаў і падзаконных нарматыўна-прававых актаў, якімі кіраваліся бібліятэкі, уключаныя ў склад Кодэкса, структураваныя, сістэмна скампанаваныя. Дзесьці выключанае дубляванне, дзесьці закрытыя лакуны ў заканадаўстве.

Па-другое, зручнасць. Цяпер замест вялікай колькасці розных нарматыўна-прававых актаў, зацверджаных Прэзідэнтам, Палатай прадстаўнікоў, Міністэрствам культуры ці іншым дзяржаўным органам — замест усяго гэтага мы маем адзін Кодэкс, у якім па магчымасці сабрана ўсё разам.

Па-трэцяе, стабільнасць заканадаўства. У 1990 — 2000-я заканадаўства змянялася досыць часта, некаторыя акты перапісваліся ледзь не штогод. Сёння ж мы нарэшце выпрацавалі не скажу дасканалую, але досыць якасную сістэму заканадаўчага рэгулявання сферы культуры. Усе разумеюць, што мяняць Кодэкс кожны год ужо не атрымаецца і гэты дакумент надоўга. Таму дадзены фактар улічваўся пры яго распрацоўцы.

Па-чацвёртае, самадастатковасць і магчымасць пахваліцца, што мы першыя. Гэта таксама важна. Распрацоўкай Кодэкса аб культуры Беларусь паказала, што не ідзе следам за кімсьці і не паўтарае ўсе заканатворчыя ініцыятывы іншай краіны, а мае ўласную палітыку ў гэтым кірунку.

Калі ж казаць пра канкрэтыку блізкай мне бібліятэчнай справы, то ў Кодэксе даволі шмат розных дэталек і важных рашэнняў: пачынаючы ад тэрмінасістэмы і заканчваючы канкрэтнымі механізмамі кіравання асобнымі напрамкамі работы.

Працяг тэмы — **на старонцы 2.**

Між мінулым і будучым

Можна рухацца далей

Постфестывальная размова з кіраўніцтвам "Славянскага базару ў Віцебску" стала ўжо адной з традыцый асвятлення форуму на старонках "К". Не адышлі мы ад яе і ў час завяршэння юбілейнага XXV фестывалю, звярнуўшыся да генеральнага дырэктара Цэнтра культуры "Віцебск", прэзідэнта Сусветнай асацыяцыі фестываляў Аляксандра СІДАРЭНКІ:

— Цягам фестывальнага тыдня ўсе мы пражываем нейкае аўтаномнае жыццё, дзе ёсць усё: радасці і смутак, прыемныя і не зусім прыемныя падзеі. Але ў цэлым фестываль развіваецца, рухаецца далей. І падводзячы вынікі цяперашняга форуму, можна сказаць, што ўсё атрымалася.

— Ці задаволены вы фінансавымі вынікамі форуму?

— Так, яны не горшыя за леташнія паказчыкі, што ў цяперашніх не лепшых умовах, лічу, значнае дасягненне.

— Сёлета фестываль быў юбілейным, таму, магчыма, надалей колькасць мерапрыемстваў можа зніжацца. Ці, наадварот, вы плануеце далейшае пашырэнне маштабаў?

— Не думаю, што надалей мы будзем ад чагосьці адмаўляцца, што колькасць і, галоўнае, разнастайнасць фестывальных праектаў будзе змяншацца. Не думаю, што паказчыкам усяго гэтага з'яўляецца менавіта юбілей, бо мы з кожным годам паступова рухаемся наперад. Тое, што адбылося цягам некалькіх фестывальных дзён, немагчыма апісаць у адным інтэрв'ю ў некалькіх словах. Асабіста для мяне знамянальных падзей і цікавых сустрэч было шмат. Бо для мяне фестываль — гэта найперш зносіны, стасункі з нашымі партнёрамі, калегамі, сябрамі. Такіх сустрэч было настолькі багата, што я пакуль не магу іх канчаткова сістэматызаваць, але ўжо цяпер відавочна, што многія з выказаных прапаноў патрабуюць далейшага асэнсавання і сумеснай працы.

— Калі можна, прыадкрыйце сакрэты хаця б некаторых далейшых планаў.

— Так, рыхтуюцца праекты некалькіх дамоў аб супрацоўніцтве, бо ў нас з'явіліся новыя партнёры па Сусветнай асацыяцыі фестываляў. Гэта значыць, што адкрываюцца новыя далягляды, становяцца магчымымі новыя цікавыя праекты. Кожны з іх — унікальны, мае свае асаблівасці, таму наперадзе нас можа чакаць шмат адкрыццяў.

— Усё гэта — вынікі спецыяльнай сесіі згаданай Асацыяцыі фестываляў?

— І праведзенай следам за ёй II Міжнароднай канферэнцыі арганізатараў фестываляў "Фестывальны рух. Традыцыі. Інавацыі". Упэўнены, у наступным годзе мы зробім усё магчымае, каб не проста зноў правесці падобную канферэнцыю, а вывесці яе на якасна і колькасна новы ўзровень. Такая канферэнцыя павінна мець больш шырокі фармат, каб на ёй можна было больш якасна і поўна прэзентаваць свае праекты, расказаць пра іх. Гэта вельмі важна! Бо многіх з тых, хто прыязджае да нас на фестываль, яднаюць агульныя мэты: у іншых краінах таксама праходзяць буйныя творчыя форумы, міжнародныя конкурсы. Іх арганізатары зацікаўлены ў тым, каб атрымаць магчымасць расказаць пра свае фестывалі — не для аднаго суразмоўцы, сам-насам, а для шырокай аўдыторыі. І пры гэтым не абмежавацца адно аповедам, але і паказаць відэаматэрыялы, раздаць промапакеты з падрабязнай інфармацыяй.

За час цяперашняй канферэнцыі я таксама выявіў шмат для сябе новага, даведаўся пра назапашаны маімі калегамі вопыт, падзяліўся сваім. Таму надалей ад нас будзе патрабавацца яшчэ больш карпатлівая праца, каб дадзеная канферэнцыя перарасла ў асобны праект, які будзе збіраць шырокае кола не толькі ўласна арганізатараў фестываляў і конкурсаў, але і ўсіх зацікаўленых — найперш, прадзюсараў, музыкантаў і ўсіх, хто заняты ў сферы музычнай індустрыі.

Заканчэнне — **на старонцы 2.**

"Беларуская фатаграфія. Імёны"

Класік з патрыятычнай пазіцыяй

Сумесна з Нацыянальным гістарычным музеем Беларусі "К" адкрывае рубрыку, прысвечаную беларускай фатаграфіі і яе аўтарам. Каго і як здымалі фатографы на тутэйшых землях у XIX і XX стагоддзях? Пра што нам распавядаюць гэтыя адбіткі? Каго называюць аўтарамі хрэстаматыйных фотаздымкаў? Пачынаючы ад XIX стагоддзя, мы паспрабуем пазнаёміцца з тымі, хто стварыў беларускую фатаграфію на самым пачатку яе станаўлення і пазней, як высілкі тагачасных майстроў дазваляюць нам казаць сёння пра наяўнасць апошняй у сучаснасці.

Рэй у гэтым даследаванні будзе весці гісторык і загадчыца аддзела пісьмовых і візуальных крыніц музея Надзея Саўчанка. Фатограф і педагог, заслужаны работнік культуры краіны Юрый Васільеў і аглядальнік "К" Дар'я Амяльковіч паспрабуюць пашырыць погляд на знакамітыя фатаграфіі беларускіх майстроў, правёўшы свае паралелі. Фармат рубрыкі плануецца адкрытым: мы зацікаўлены ў тым, каб удзел у праекце прынялі ўсе, хто неабыякавы да фатаграфіі (і, адпаведна, гісторыі, мастацтва). Распачынаем сёння, бадай, з самага старадаўняга беларускага здымка "Партрэт маці" Станіслава Антона Прушынскага, выкананага ў 1858 годзе. Дарэчы, менавіта сёлета аднаму з выбітных беларускіх майстроў, аўтару слыннага партрэта Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, спаўняецца 190 гадоў. Чым адметныя ягоныя партрэты? Якая менавіта майстэрня была ў гэтага прадстаўніка шляхецкага роду? Пра тое — у сённяшніх аглядах.

Фатограф Станіслаў Антон Прушынскі (1826 — 1895) для гісторыі беларускай фатаграфіі персона выключнай важнасці. Ён быў першым, хто адкрыў сталую фотамайстэрню на тэрыторыі Беларусі. Датай пачатку дзейнасці фотаатэлье Прушынскага ў Мінску польскія крыніцы называюць 1850 год. Гэта таксама самая ранняя на сёння згадка аб існаванні дагератыпнай майстэрні ў нашай краіне. Праўда, дагератыпы тут выконваліся нядоўга — у 1858 годзе Прушынскім была засвоена тэхналогія вырабу адбіткаў на паперы.

Надзея САЎЧАНКА

Нарадзіўся будучы фатограф у 1826 годзе на Міншчыне, у маёнтку Асінцы Вілейскага павета ў сям'і шляхціца Менскай губерні, межавага суддзі Антонія Прушынскага і Розы Станьскай. У досыць маладым узросце Антон Антонавіч пакінуў бацькоўскую хату і пасяліўся ў Мінску, дзе спачатку зарабляў урокамі музыкі. Неўзабаве ў яго атрымалася адкрыць тут невялікую фабрыку па вытворчасці сургучу.

Маючы прыродныя схільнасці да мастацтва, Антон захапіўся фотаспрaвай, тонкасці якой вывучыў за мяжой і, па словах сястры, "выпісаўшы выключна каштоўныя фатаграфічныя апараты, абсталяваў у горадзе Мінску першакласную фатаграфічную майстэрню". Прыкладна ў гэты ж час — у 1849 — 50 гг. — ён ажаніўся з Пелагеяй з Кулакоў, а ў 1851-м нарадзіўся іх першынец — Конрад, у будучыні вядомы польскі педагог, аўтар чытанкі, рэдактар "Gazety Switecznej".

Заканчэнне — **на старонцы 15.**

Надзённа

Неўзабаве Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь пачне выпуск Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. Мы пацікавіліся ў начальніка ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкіх работ згаданай установы Наталлі СУДЗІЛОЎСКАЙ пра адметнасці гэтага вытворчага працэсу.

Яўген РАГІН

Дзвесце семдзесят дзве законныя старонкі

Друкарскае аблічча Кодэкса аб культуры

— Асаблівых складанасцяў у рабоце з тэкстам Кодэкса пры падрыхтоўцы яго да выдання не ўзнікала, — паведаміла Наталля Валер'еўна. — Па той простай прычыне, што гэтаму папярэднічалі сур'ёзныя шчыраванні спецыялістаў Міністэрства культуры, Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі. У выніку дакумент аб'яднаў ужо дзеючыя нарматыўныя прававыя акты рознай юрыдычнай сілы, якія рэгулююць сферу культуры. У прыватнасці, гэта нормы законаў "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь", "Аб бібліятэчнай справе", "Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах)", "Аб творчых саюзах і творчых работніках", "Аб кінематаграфіі", "Аб музеях і Музейным фондзе", "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны". Пасля ўступлення Кодэксу ў жыццё будзе прызнана, што яны страцілі сілу.

— Колькі слоў пра шлях выдання да чытачоў.

— Кодэкс — гэта перш за ўсё прававая інфармацыя. Перад тым як ён трапіць у рукі чытача, патрэбна ягоная рэгістрацыя ў Нацыянальным рэестры прававых актаў Рэспублікі Беларусь і афіцыйная публікацыя на Нацыянальным прававым Інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь. Кодэкс зарэгістраваны ў рэестры 27 ліпеня. Афіцыйная публікацыя плануецца на www.pravo.by 2 жніўня бягучага года. А ўступае ў сілу Кодэкс, як вядома, 3 лютага наступнага года. Дарэчы, гэта першы Кодэкс на беларускай мове.

— Ахарактарызуйце, калі ласка, будучае выданне.

— Гэта 272 старонкі, у тым ліку і алфавітна-прадметны ўказальнік, які дапаможа чытачу хутка знайсці той ці іншы тэрмін у Кодэксе. Указальнік распрацаваны спецыялістамі нашага Цэнтра. Кнігка такога аб'ёму будзе важыць прыкладна 350 грамаў. Выданне будзе выканана на паперы добрай якасці. Пераплёт — цвёрды з залатым цісненнем на вокладцы. Такі дызайн — традыцыйны для НЦПІ. Колер бумвінілу (пераплётнага матэрыялу для вокладкі) выбраны белым. Чаму? Таму, што наша беларуская культура — гэта заўжды асацыяцыі са светлым, чыстым, святочным.

— Якім будзе наклад?

— Плануецца, што пяць тысяч экземпляраў. Чытацкая аўдыторыя выдання — аддзелы і ўпраўленні выканкамаў, што займаюцца культурай; натуральна — бібліятэкі, клубы, музеі, тэатры, школы мастацтваў. Інакш кажучы — арганізацыі адпаведнай сферы.

— А хто канкрэтна з вашых работнікаў уцягнуты ў вытворчы працэс?

— Вельмі многія спецыялісты. Не толькі вярстальшчыкі, рэдактары, карэктары, але нават і маркетолагі, прадстаўнікі бухгалтэрыі, нашых рэгіянальных цэнтраў прававой інфармацыі, на якія ўскладзена вырашэнне пытанняў распаўсюджвання друкаванай прадукцыі…

— І ў якой стадыі знаходзяцца работы?

— Зараз рыхтуецца арыгінал-макет выдання. Ён будзе здадзены ў друкарню пасля афіцыйнай публікацыі Кодэксу аб культуры.

— Калі можна будзе набыць кнігу?

— У другой палове жніўня выданне можна будзе прыдбаць у кніжнай гандлёвай сетцы, у НЦПІ, у рэгіянальных цэнтрах прававой інфармацыі (яны ёсць у кожным абласным горадзе), а таксама — у інтэрнэт-краме pravo.reshop.by.

К

Можна рухацца далей

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Прыклады такіх канферэнцый існуюць ва ўсім свеце — і асобна, і ў рамках іншых праектаў. Але мне здаецца, што найбольш дабрадатная, жыватворная глеба для гэтага ёсць на фестывалі "Славянскі базар у Віцебску".

— Сапраўды, больш шырокая прэзентацыя самога фестывальнага руху магла б толькі ўпрыгожыць віцебскі форум, дадаткова пацвярджаючы яго статус "фестывалю фестываляў". І наўрад ці гэты праект — усяго адзіны з запланаваных на сёння.

— Насамрэч, праграму будучага года мы бачым ужо на 70 — 80 працэнтаў — з улікам таго, што было сёлета. Адштурхоўваючыся ад цяперашняга правядзення, адэкватна ацэньваючы яго плюсы і магчымыя мінусы, можна рухацца далей. У прыватнасці, намеціўся шэраг новых ініцыятыўных праектаў, якія мы будзем увасабляць у жыццё. Увогуле, такое як мага больш ранняе планаванне мы ажыццяўляем ужо не першы год, і з кожным разам яго ўдасканальваем. Таму і продаж білетаў пачынаем усё раней — і гэта сябе апраўдвае.

— Новыя праекты, пэўна, звязаныя і з пашырэннем складу Сусветнай асацыяцыі фестываляў, што адбылося сёлета?

— Пашырэнне складу будзе працягвацца і надалей. Да прыкладу, прадстаўніца Мальты прыехала да нас проста дзеля таго, каб паглядзець, падумаць. Але адразу прыняла рашэнне і гатова падпісаць партнёрскую дамову аб далейшым супрацоўніцтве і прадстаўляць "Славянскі базар…" на Мальце. Гэта дадатковае сведчанне таго, што мы робім усё правільна.

Але ж мы зацікаўлены не толькі ў тым, каб пашыраць колькасць членаў Асацыяцыі. Яшчэ больш нас хвалюе якасны бок. Умовы ўступлення надрукаваны на сайце, але справа не адно ў фінансавым унёску, адпаведнасці нейкім крытэрыям. Каб уступіць у Асацыяцыю, трэба атрымаць рэкамендацыю ад яе цяперашніх членаў. Мы павінны быць упэўнены, што прапанаваны нам праект годны, што ў ім ёсць свае адметнасці, якія могуць быць прыкладам для іншых. Але мы не выключаем і таго, што некаторыя конкурсы, фестывалі трэба будзе падцягнуць да ўзроўню Асацыяцыі. Мы абмяркоўвалі, што можам не проста дзяліцца вопытам "на словах", але і адпраўляць сваіх спецыялістаў на асобныя форумы для арганізацыйнай дапамогі. Бо могуць быць цікавыя ініцыятывы, нават прыватныя, якія не атрымліваюць належнага развіцця — толькі таму, што арганізатары не ведаюць, як гэта рабіць, сутыкаюцца з самымі распаўсюджанымі праблемамі. У Дырэкцыі "Славянскага базару ў Віцебску" назапашаны велізарны вопыт, але і мы маем патрэбу ў свежых ідэях. Тым не менш, гатовы падзяліцца сваімі напрацоўкамі, набытымі за 25 гадоў.

— Спонсараў з гадамі шукаць усё прасцей — ці наадварот?

— Займець спонсараў заўсёды складана. Усё залежыць нават не ад фестывальнага стажу, а ад фінансавай сітуацыі, ад таго, як развіваецца эканоміка ўвогуле. Каб менш залежаць ад яе магчымых хістанняў і тым больш спадаў, мы пачынаем работу з фундатарамі загадзя, адразу пасля завяршэння чарговага фестывалю. Бо гэта вялізная колькасць сустрэч, гутарак, дамоў. Але асабліва прыемна, што для многіх нашых партнёраў і спонсараў выгоды ў выглядзе рэкламы, пазіцыяніравання сваіх брэндаў у рамках буйнога міжнароднага форуму часам не з'яўляецца асноўным. Цікавасць да нашага фестывалю дыктуецца не адно камерцыяй. За гэты час у нас з'явіліся добрыя сябры, гатовыя падтрымаць нас у любой сітуацыі.

Прыемна, што фестываль актыўна асвятляецца ў СМІ. Дарэчы, іх шэрагі таксама пашыраюцца. Сёлета на "Славянскі базар у Віцебску" ўпершыню прыехалі журналісты "Еўраньюс" — значыць, пашырылася і колькасць нашых прыхільнікаў-гледачоў. Шмат матэрыялаў, наколькі я ведаю, з'яўляецца ў Сеціве, добра працуе наш афіцыйны сайт, які пастаянна абнаўляецца: у час фестывалю — увогуле па некалькі разоў на дзень, ледзь толькі з'яўляюцца навіны ці праходзіць нейкае мерапрыемства. Дый у сацыяльных сетках ідуць абмеркаванні фестывальных падзей, людзі шчыра дзеляцца сваімі ўражаннямі. Гэта не можа не радаваць! Бо ўсё гэта сведчыць, што фестываль карыстаецца попытам, што стаўленне да яго вельмі зацікаўленае.

— З боку Украіны таксама? Некалькі апошніх гадоў гэта краіна амаль не дасылала сваіх удзельнікаў — за выключэннем, бадай, канкурсантаў.

— Нягледзячы на ўсё, што адбываецца зараз ва Украіне (і, зразумела, зусім не спрыяе развіццю мастацтва), там заўважна жывая цікавасць да "Славянскага базару ў Віцебску". Пра гэта сведчаць тамтэйшыя трансляцыі найбольш значных фестывальных падзей (гала-канцэртаў адкрыцця, закрыцця, конкурсу выканаўцаў эстраднай песні), якія, паводле падлікаў, сабралі больш за 10 мільёнаў гледачоў. Так што дэвіз фестывалю "Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення" актуальны як ніколі, яго значнасць толькі ўзрастае.

Падрыхтавала Надзея БУНЦЭВІЧ

Айчына — перадусім

7 — 8 ліпеня Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж" і Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь ладзілі Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю "Магнаты і шляхта Вялікага Княства Літоўскага — апора беларускай дзяржаўнасці, асветнікі і фундатары нацыянальнай культуры". Канферэнцыя была прымеркавана да 155-годдзя з дня нараджэння Магдалены Радзівіл (1861 — 1945).

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

На канферэнцыі было агучана шырокае кола пытанняў, датычных гісторыі і культуры Вялікага Княства Літоўскага, якое навукоўцамі адназначна трактавалася як сярэднявечная беларуская дзяржава. А пра тое, як гістарычная Літва ў складзе Расійскай імперыі набыла новае імя — Беларусь, а найменне "Літва" імперская ўлада фактычна падаравала Жмудзі, выразна і даходліва патлумачыў прафесар Мальдзіс у сваім дакладзе "Нацыянальнае і міжнароднае значэнне дзейнасці Магдалены Радзівіл".

Тэмы абмеркавання былі сабраныя ў пяць інфармацыйных блокаў. Гэта "Магнаты і шляхта Вялікага Княства Літоўскага на службе Айчыне", "Палітычная культура Беларусі: традыцыі і сучаснасць", "Інстытуты ўлады і кіравання: погляд праз прызму пакаленняў", "Гісторыя дзяржаўнасці як аснова палітыка-прававой культуры сучаснай Беларусі", "Кніга — інфармацыя — улада: тысячагоддзе ўзаемадзеяння". У дакладах ахоплена беларуская гісторыя ад XIV па XX стагоддзе. З прамоў замежных гасцей можна зрабіць выснову, што падтрыманая дзяржаваю цікавасць грамады да нацыянальнай гісторыі — гэта вызначальная ідэалагічная плынь на постсавецкай прасторы. Згаданыя вышэй дыпламаты ў прыватнасці гаварылі пра стварэнне станоўчага гістарычнага іміджу народаў качавой цывілізацыі.

Дарэчы, менавіта казахскі дыпламат спадар Лаўмулін адзначыў актыўную геапалітычную ролю сярэднявечнай дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага на еўразійскай прасторы не толькі ў сегменце Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, але і ў Азіі праз стасункі з Ардою, да якой мелі дачыненне землі сучаснага Казахстана.

Спадар Гаркун, які прадстаўляў на імпрэзе структуры Садружнасці, гаварыў пра важнасць культуры як чынніка прэстыжу дзяржавы. На жаль, здараецца, што гэта не заўжды разумеюць дзяржаўныя службоўцы. На ягоную думку, варта зрабіць завядзёнкаю, каб ніводнага чыноўніка не выпускалі ў замежную камандзіроўку, перш чым не наведае Полацк. А то атрымліваецца, што некаторыя па шмат разоў бывалі ў культурных цэнтрах Еўропы, але пры гэтым кепска ўяўляюць, дзе знаходзіцца горад — калыска беларускай дзяржаўнасці.

Даследчыкі беларускай культуры заўжды ведалі пра вялікую ролю беларускай арыстакратыі ў справе адраджэння нашай нацыянальнай культуры на мяжы XIX — XX стагоддзяў. Але гаварыць пра гэта могуць толькі зараз. На канферэнцыі згадваліся Эдвард Вайніловіч, Гутэн-Чапскія, Радзівілы, якія матэрыяльна падтрымлівалі беларускую літаратуру, беларускае школьніцтва, фактычна — беларускую нацыянальную ідэю. Праўда, ужо тады мела месца з'ява пад назвай "нямэтавае скарыстанне сродкаў". Так, быў выпадак, калі Магдалена Радзівіл выдаткавала на беларускую справу 20 000 рублёў, што эквівалентна 15-ці кілаграмам золата альбо 16-ці мільярдам сённяшніх беларускіх рублёў. Куды зніклі гэтыя грошы, перададзеныя беларускім рупліўцам з рук у рукі, што называецца напавер, ніхто не ведае…

Аднак, нягледзячы ні на што, Радзівілы заставаліся патрыётамі краю. Гэты род, чые карані ў Беларусі, меў сваяцкія стасункі з элітай Еўропы. Але на пытанне, хто яны па нацыянальнасці, Радзівілы горда адказвалі: "Тутэйшыя!" оля арыстакратычных родаў у нашай гісторыі яшчэ па-сапраўднаму не асэнсаваная. Іх маральны, палітычны і культурны капітал сёння здабытак нацыі. Трэба разумець, што ні Мір, ні Нясвіж, ні палац у Ружанах не здолеў бы пабудаваць адзін чалавек. Іх будаваў на працягу стагоддзяў цэлы род. І калі ў выніку сацыяльных узрушэнняў былі парушаны дынастычныя, родавыя сувязі ўнутры беларускай магнатэрыі, калі раз'ядналася эліта — гэта стала для Беларусі, гістарычнай праваперaемніцы Літвы, нацыянальнай трагедыяй.

Сёння для Беларусі, якая на працягу апошніх стагоддзяў спазнала велізарныя, часам незваротныя страты, надышоў "час збірання камянёў". Ніхто, канешне ж, не збіраецца аднаўляць Вялікае Княства і сацыяльную структуру гэтай дзяржавы. Але ва ўмацаванні беларускай дзяржаўнасці будзе да справы дапамога раскіданых па свеце нацыянальных магнатэрыі і шляхты, якія заўжды перадусім ставілі інтарэсы Айчыны.

К

Страта

Птах адляцеў…

Майстар напісаў у адным з апавяданняў: "...тут жыло сваё рэха — дзень і ноч, зіму і лета, і больш за ўсё ўвосень..." Цяпер, калі не стала Івана Пташнікава, асабліва тужліва і разам з тым магутна загучала тое рэха з яго твораў і жыцця. Рэха ягонага творчага таленту, рэха, якое будзе суправаджаць кожнага, хто дакранецца да яскравага слова пісьменніка. Яно, гэтае рэха, не змоўкне, бо Іван Мікалаевіч уклаў у кожны свой твор тую шчымлівую любоў да роднай зямлі, напоўніў кожную літарку захапленнем існым, прыродай і чалавекам вёскі. Майстар запусціў "сваё рэха" ў Вечнасць, і яно не аціхне.

Светлая памяць Птаху, які адляцеў у вырай…

"Культура"ўцы

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 4 409. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 29.07.2016 у 18.00. Замова 2858. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

2016 ГОД КУЛЬТУРЫ

Ініцыятыва — бадай самае каштоўнае, што ёсць у развіцці творчасці і культуры. І важна, што ў Год культуры гэтая ініцыятыва праяўляецца з падвоенай энергіяй. А хэштэг #2016годкультуры стаў назвай новай рубрыкі "К" і пазнакай для такіх матэрыялаў на сеціўных рэсурсах газеты.

За сваю журналісцкую практыку я меў шчаслівую магчымасць пабачыць культурныя імпрэзы ў розных мясцінах Беларусі. Віцебскі фестываль "Славянскі базар", бабруйскі "Вянок сяброўства", пастаўскі "Звіняць цымбалы і гармонік", дубровенскі "Дняпроўскія галасы", а яшчэ святкаванні Дня пісьменства, урачыстасці ў гонар надання гарадам статусу Культурнай сталіцы, Дні горада, кірмашы з канцэртнай праграмай і іншыя, часам нават не ведаю, як дакладна іх вызначыць і правільна назваць.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

"Студня", якая не абмялее

Лагістыка брэнда

Акрэдытаваны журналіст на такіх імпрэзах — асоба прывілеяваная. Ён можа быць упэўненым, што яго накормяць-напояць; калі будзе патрэба, паселяць у гасцініцы, прадаставяць транспарт; у зале, дзе адбываецца відовішча, пасадзяць так, каб усё было відаць; забяспечаць патрэбнай інфармацыяй, прыставяць памагатага, адораць сувенірамі. Прасцей кажучы, створаць максімальна камфортныя ўмовы для працы.

Іншая рэч — прыехаць на фестываль у якасці звычайнага, незаангажаванага, госця… Першая праблема, з якой сутыкнешся: дзе размясціцца? Будаваць вялікія гасцініцы ў малых гарадах нерэнтабельна: большую частку года яны будуць стаяць незапоўненыя. А ў дні фестывалю выразна адчуваецца дэфіцыт здымнага жытла. Выйсце з гэтай сітуацыі я бачу ў задзейнічанні для размяшчэння гасцей на час фестываляў прыватнага жытла, аграсядзіб. Колькасць наведвальнікаў фэсту можна павялічыць за кошт тых, хто адпачывае ў навакольных санаторыях і пансіянатах. Дзеля гэтага арганізатарам фестывалю трэба правільна выбудоўваць лагістыку, загадзя дамаўляцца з турыстычнымі фірмамі і ўвогуле сур'ёзна падвысіць якасць планавання ўсяго комплексу фестывальных мерапрыемстваў. Па магчымасці мінімізаваць неспадзяванкі. Можа, дзе такое ўжо і робіцца, але асабіста я не бачыў.

Арганізацыя — справа важная, але галоўнае ўсё-такі ідэя, дзеля рэалізацыі якой выдаткоўваюцца сродкі і рупяцца людзі. Варта калі-нікалі ставіць пытанне, навошта ўвогуле патрэбны той ці іншы фестываль, для каго ён ладзіцца? Лінію на тое, каб кожная мясцовасць выяўляла сваю адметнасць, мела свой брэнд, ніхто не адмяняў, і яна абсалютна правільная. Хай будзе шмат фэстаў — раённых, мястачковых, вясковых. Бо ў Беларусі ў культурнай сферы не павінна быць падзелу на сталіцу і правінцыю. Людзі, незалежна ад месца жыхарства, маюць права на псіхалагічны камфорт, абавязковым чыннікам якога з'яўляюцца святочныя імпрэзы. Вось толькі варта акрэсліцца адносна статусу ўсіх гэтых фестываляў і відовішчаў. Відавочна, што не кожная мясцовая адметнасць пацягне на рэгіянальны ўзровень, не кожны рэгіянальны брэнд спрацуе ў маштабе краіны. Жадаеш мець прыстойнае дзяржаўнае фінансаванне імпрэзы і прыватныя інвестыцыі ў яе — прапануй нешта крэатыўнае. Нешта такое, што відавочна будзе мець шырокі розгалас у краіне, будзе спрыяць прэстыжу Беларусі ў вачах свету.

Абсалютная большасць нашых раскручаных фэстаў канцэптуальнай асновай маюць народнае мастацтва і этнаграфію. Тое, што памятаем свае карані — фактар станоўчы, але каб сцвердзіцца ў сучасным свеце, гэтага недастаткова. Зрэшты, трэба разумець, што Беларусь — не скансэн нейкі, не этнаграфічны музей памерам з краіну, не рэзервацыя "абарыгенаў", што самаізаляваліся ад уплыву цывілізацыі. Беларусь — сучасная, дынамічная краіна. Да таго ж, нямала нашых суайчыннікаў сцвердзіліся за межамі Бацькаўшчыны рознай вагі ўнёскам у сусветную цывілізацыю. Гэта палітыкі, людзі навукі і культуры. На сёння, бадай, самы вядомы ў свеце ўраджэнец Беларусі — Марк Шагал. Пры тым, што і зараз шмат ахвочых ігнараваць беларускія грунт і сутнасць творчасці гэтага класіка XX стагоддзя, выкрэсліць яго з беларускага кантэксту і залічыць у іншы.

Ва ўсім свеце прынята ганарыцца сваімі землякамі, якія зрабілі нешта значнае, патрэбнае ўсяму чалавецтву. Нават калі гэтыя асобы працавалі не на роднай зямлі, дома іх усё адно шануюць. Нагадаю некаторых ураджэнцаў нашага краю, якія рэалізоўвалі свой талент у іншых краінах.

Заканчэнне — **на старонцы 6.**

Фотафакт

Музыка дзіцячых перамог

Добрымі навінамі імкнецца падзяліцца з чытачамі "К" Тэатр эстраднай песні "Хвілінка": калектыў заваяваў Гран-пры на II Міжнародным фестывалі дзіцячай творчасці "Нясебр — Востраў мастацтваў-2016", які праходзіць зараз у Балгарыі. Выхаванцы "Хвілінкі" сталі лепшымі сярод вакальных ансамбляў і салістаў з шасці краін свету. У гэты ж час да вырашальнага выступу рыхтуецца фіналіст нацыянальнага адборачнага тура дзіцячага конкурса "Еўрабачанне", вядучы артыст тэатра Саша Мінёнак. Хлопчык выканае песню "Музыка маіх перамог", якая можа стаць для яго лёсавызначальнай.

Паплыць на караблі па рацэ Дрысе ці схадзіць у мясцовы музей? Прыпыняцца на рачных прычалах ці слухаць расповед экскурсавода? Паглядаць на навакольныя краявіды ці ўзірацца ў вялікія фотаздымкі, што экспануюцца ў музейных залах? У Верхнядзвінску на гэтыя пытанні адказ даўно вядомы: выбар мясцовых жыхароў — за новай установай культуры горада, якая працуе тут амаль год.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Ад задумы да адкрыцця

Будынак музея ў Верхнядзвінску.

Музей-карабель, або Вандроўка па 12 прычалах

Музей у Верхнядзвінску афіцыйна адкрыўся яшчэ напачатку верасня мінулага года, і калі сказаць, што ўстанову культуры ў горадзе чакалі доўга — гэта не сказаць нічога. Планы на гэты конт у мясцовых уладаў былі і пяць, і дзесяць гадоў таму, пра што і ў "К" згадвалася неаднаразова. Але толькі ў 2009 годзе справа зрушылася з месца: як кажа начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі мясцовага райвыканкама Надзея Масквічова, менавіта ў той час пад музей быў перададзены гістарычны будынак канца XIX стагоддзя, што знаходзіцца ў цэнтры горада, і дзе да той пары месціўся народны раённы суд.

Фрагмент экспазіцыі музея.

Старадаўняя Тора, каменны крыж і бронзавы складзень: колькі словаў пра новую ўстанову культуры Верхнядзвінска

Маргарыта Бембель. / Фота Юрыя ЧАРНЯКЕВІЧА.

— Цягам усіх гэтых гадоў у будынку ладзіўся рамонт, які, на жаль, часам перапыняўся з-за адсутнасці фінансавання, — адзначыла Надзея Масквічова. — Потым доўгі час ішла праца па распрацоўцы навуковай і мастацкай канцэпцыі новага музея. І толькі летась нам удалося нарэшце адкрыць установу культуры. На рамонтныя работы і стварэнне музейнай экспазіцыі пайшло прыкладна два з паловай мільярды рублёў.

Першымі новую ўстанову культуры наведалі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны — спецыяльна для іх музей адчыніў свае дзверы 9 мая мінулага года. Пасля гэтага музейшчыкі працавалі ў тэставым рэжыме, а ўжо з 1 верасня 2015-га Верхнядзвінскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей распачаў сваё афіцыйнае існаванне.

Экспанаты для будучага раённага музея збіралі, што называецца, усім мірам і краязнаўцы-энтузіясты, і школьныя настаўнікі, і проста неабыякавыя да гісторыі свайго горада і раёна людзі... Цяпер тут можна пабачыць прылады працы каменнага і жалезнага веку, арабскія дырхемы X стагоддзя, сярэбраныя манеты Вялікага Княства Літоўскага і часоў Іаана Грознага, а таксама праваслаўныя старадаўнія крыжы і складні ды нават яўрэйскую Тору. Яна тут, да слова, апынулася невыпадкова: доўгі час Дрыса (цяперашні Верхнядзвінск) была яўрэйскім мястэчкам, і нават у музейным будынку, пабудаваным больш за 120 гадоў таму, калісь жыў і працаваў вядомы ў наваколлі яўрэйшавец са сваёй сям'ёй...

Вандроўка ў мінулае

Экспанаты — экспанатамі, але не меншую цікавасць выклікае і музейная канцэпцыя. Наведвальнікі з дапамогай экскурсавода фактычна не ходзяць па залах установы культуры, а "плывуць-вандруюць" па рацэ Дрысе ды навакольных рачулках.

— Ідэя такая: гісторыя кожнага населенага пункта падаецца ў музеі з улікам знаходжання яго на берагах той або іншай рэчкі, — кажа дырэктар Верхнядзвінскага гісторыка-краязнаўчага музея Маргарыта Бембель. — І гісторыя гэтая трансфармуецца ад старажытнасці да нашых дзён, а своеасаблівым гідам з'яўляюцца рэкі ды ручаіны Верхнядзвіншчыны…

Усяго ў музеі месцяцца 12 такіх прычалаў. Скажам, прычалы "Рагнеды" і "Дрысы", "Росіцы" і "Сар'і"… Усе гэтыя назвы — невыпадковыя.

— На маю думку, кожны музей павінен быць арыгінальным, — кажа кіраўнік рабочай групы па стварэнні музея, навуковы супрацоўнік, гісторык-краязнаўца Антон Бубала. — Таму мы вырашылі адысці ад класічнага варыянту музейнай экспазіцыі (зала археалогіі, прыроды, Вялікай Айчыннай вайны і гэтак далей) і прапаноўваем наведвальнікам адразу выправіцца ў своеасаблівую вандроўку ад вытокаў ракі Дрысы да яе вусця.

Кожны прыпынак, па словах суразмоўцы, — гэта нейкае значнае паселішча раёна або цікавы гістарычны аб'ект.

— Напрыклад, пачынаем мы ад кургана Рагнеды, дзе, паводле некаторых паданняў, пахаваная вядомая полацкая княжна і ўсталяваны каменны крыж, — кажа Антон Бубала. — На прычале "Росіца" прыгадваем трагічныя старонкі Вялікай Айчыннай вайны, на прычале "Сар'я" паказваем прыгажосць мясцовага храму, пабудаванага ў стылі неаготыкі, а на "Асвеі" дэманструем рэшткі былых графскіх уладанняў — палацава-паркавай рэзідэнцыі роду Гільзенаў і Шадурскіх. Такім чынам, звяртаем увагу на брэнды той або іншай мясцовасці, што нашмат больш цікава для наведвальнікаў, чым проста россып нейкіх гістарычных фактаў.

Заканчэнне — **на старонцы 14.**

"Лічбавы" падыход

Гліна: прыбытак ці страта?

На шматлікіх фестывалях заўсёды можна пабачыць рамеснікаў, якія прадаюць збаны і свісцёлкі, гліняныя місы і нават амфары, зробленыя на ўсходні ўзор. Але ці прыбытковая іх самаадданая праца ў часы айпадаў і айфонаў, фабрычнага посуду і самых розных сувенірных кубкаў і куфляў, якія запаланілі паліцы маленькіх крам і буйных супермаркетаў беларускіх гарадоў і мястэчак?

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Паспрабаваў знайсці адказ на гэтае пытанне ў Івянцы, падчас VIII абласнога свята-конкурсу майстроў ганчарства "Гліняны звон". Скажам, майстар з Лагойскага Дома рамёстваў Мікалай Стрэльчанка кажа, што сёлета ягоныя вырабы наведвальнікі свята набываюць не так добра, як раней:

— Але не думаю, што ў гэтым вінаватыя эканамічныя крызісы, зніжэнне цікавасці да гліняных вырабаў ці нешта яшчэ, — кажа суразмоўца. — Той, хто не любіць гліну, не цікавіцца ёй, той не будзе да яе мець увагі ніколі. А цэны ў мяне дэмакратычныя, ды і патаргавацца ўсё-ткі можна: гэта ж рынак!

Гліну для сваіх вырабаў майстар закупляе ў Барысаве, на мясцовай фабрыцы мастацкіх вырабаў: кажа, яна там неблагая па якасці ды і кошт задавальняе. А ў мясцовым Доме рамёстваў майстар кіруе дзіцячым гуртком па вырабе глінянай цацкі "Натхненне".

— Праца ў Доме рамёстваў дае хоць малы, але пастаянны заробак, — адзначыў Мікалай Стрэльчанка. — А на гліняных вырабах многа не заробіш, бо трэба ж улічваць набыццё матэрыялу, працоўны час, абпал глінянага посуду. А колькі такіх збаноў б'ецца па дарозе на кірмаш ці свята рамёстваў!

Прыкладна такое меркаванне маюць і іншыя глінамесы, з якімі мне ўдалося пагаварыць падчас імпрэзы.

— Я працую ў Івянецкім музеі традыцыйнай культуры, — кажа івянецкі майстар Уладзімір Сасноўскі. — Продаж гліняных вырабаў — гэта, хутчэй, мой "прыварак" да асноўнага заробку, чым рэальны спосаб зарабіць грошай. Прычына ў тым, што летам нашы сувеніры карыстаюцца попытам, а вось зімой яны не так запатрабаваны. Ды і знікае сёння тая цікавасць у людзей да збаноў, да вырабаў з гліны, якая была яшчэ напачатку 90-ых гадоў мінулага стагоддзя. Так што, калі нехта думае, што "навар" з глінянага круга вялікі, проста памыляецца.

Усё гэта так. Але, відавочна, што той, хто ўмее круціць не толькі ганчарны круг, але і "круціцца" сам, можа значна папраўціць свае грашовыя справы, хай сабе і летам. Тым больш, самых розных фэстаў у Беларусі цяпер багата, і амаль на кожным з іх заўсёды рады ўбачыць майстроў народнай творчасці са сваімі вырабамі. Абы кітайскай штампоўкі менш на паліцах было…

Прыкладам, на тым жа абласным свяце многія з ганчароў дэманстравалі наведвальнікам гліняныя скарбонкі, у якія вельмі добра кідаць новыя беларускія капейкі і рублі. І, па словах майстроў, гэтае "ноу-хау" карыстаецца цяпер значным попытам. Раней такімі вырабамі цікавіліся адно толькі расіяне ці турысты з Еўропы. Чым не прыклад добрага маркетынгавага ходу, які дадасць "капейчыну" не толькі ў гліняную скарбонку, але і ў кішэню майстра?

"На гліне грош не гіне" — згадаю я вядомую прыказку. Ганчар, які з'яўляецца сапраўдным майстрам у сваёй справе, наўрад ці будзе галадаць з-за нястачы заказаў на свае вырабы. Гліна захоўвае цеплыню рук ганчара, частку ягонай душы, якую ён укладае ў свае творы… Ці можа з гэтым параўнацца штампоўка?

І яшчэ. Не варта забываць, што названая праца вымяраецца не толькі грашыма. Ёсць яшчэ, натуральна, і радасць ад зробленага табой.

— Я, напрыклад, прыйшоў у ганчарную справу пазнавата, але марыў пра працу з керамікай даўно, — кажа майстар Дзем'ян (Дзмітрый) Каптур. — Маю майстэрню ў вёсцы Калюга Глускага раёна Магілёўскай вобласці, ёсць у мяне такая ж прыватная майстэрня і на Украіне, адкуль родам мая жонка. Нешта прадаецца добра, нешта — не вельмі. Але ці ж гэта галоўнае? Для мяне самае важнае — кераміка, ганчарства, я гэтым жыву: ці сам працую на ганчарным крузе, ці вучу іншых, ці чытаю спецыяльную літаратуру. Іншым жыццё сабе проста не ўяўляю. Дык пры чым тут грошы?

Дадаць да гэтых слоў бадай што няма чаго. Я і не буду. Толькі скажу, што ўсё, напісанае вышэй, датычыць, мабыць, не толькі ганчароў, а і тых рамеснікаў, якія займаюцца іншымі відамі традыцыйнага народнага мастацтва: кавальствам, бондарствам, разьбой па дрэве, саломкапляценнем… Усе яны, перакананы, таксама атрымліваюць ад сваёй дзейнасці ў першую чаргу задавальненне і радасць ад зробленага, а ўжо ў другую чаргу — не надта вялікі фінансавы прыбытак.

Каб займець ад падобнай хэнд-мэйдаўскай справы значныя грашовыя дывідэнды, трэба займацца продажам такіх саматужных вырабаў, якія мала хто робіць, ды прадаваць такія рэчы пад заказ. Скажам, той жа ювелірнай работай цалкам можна зарабляць сабе на жыццё, як, да слова, і стварэннем унікальных аўтарскіх лялек ці арыгінальных кавальскіх вырабаў. Але гэта ўжо зусім іншая тэма, пра якую варта пагаварыць другім разам.

К

Art-reboot занядбанай вёскі

Дыпламаваны скульптар Канстанцін Мужаў падчас сваіх перформансаў і сам падобны на антычную статую. Шпацыр пафарбаванага ў белы колер тулава па вуліцы беларускай вёскі пакідае папраўдзе незабыўныя ўражанні. Але можа здарыцца, што неўзабаве падобныя дзеі там стануць такой самай завядзёнкай, як прыезд аўталаўкі. Фестываль і кіналагер "Хранатопь. Абнуленне", пра які "К" пісала ў адным з мінулых нумароў, пазначыў на культурнай карце Беларусі новы тапонім — Каптаруны. Яшчэ месяц таму пра яго не ведаў ніхто. Ужо ведаюць.

Неўзабаве паселішча са скандынаўскай назвай можа спазнаць сапраўдную рэінкарнацыю — у якасці ўжо не простай вёскі, але "арт-". Што гэта такое — інтэлігенцкая забаўка або сур'ёзны сацыяльны праект з вялікай будучыняй? Адказ на дадзенае пытанне ведае хіба час. Аднак, вядома, хацелася б верыць у другі варыянт.

Ілья СВІРЫН

"Шпакоўня" як эрмітаж

Гэтая вёска ў Пастаўскім раёне — тыповы прыклад "уходящей натуры". Пераважная большасць дамоў даўно закінута, гароды зараслі пустазеллем, мясцовых жыхароў можна пералічыць па пальцах адной рукі… Здавалася б, яшчэ якое дзесяцігоддзе — і тут будзе "цуд некранутай прыроды". Але ў цёплы ліпеньскі ўік-энд у Каптарунах было як ніколі шматлюдна: фэст "Хранатопь" сабраў у "мядзвежым кутку" немалую частку сталічнай багемы.

— Думаю, сёння цэнтр беларускага арт-жыцця знаходзіцца не ў Мінску, а менавіта тут, у Каптарунах, — саманадзейна запэўнівае мастак Артур Клінаў перад тым, як у чарговы раз акунуцца ў тамтэйшае возера.

Менавіта ён стаў ініцыятарам "рэканструкцыі" вёскі ды будуе на гэты конт неверагодныя планы: спачатку правесці фэст з удзелам замежных літаратараў ("Хай яны ўбачаць зусім іншую, неўрбанізаваную Беларусь"), потым стварыць парк скульптуры і арт-рэзідэнцыю, рэгулярна ладзіць пленэры і опэн-эйры, а з цягам часу дарасці і да міжнароднага кінафестывалю. І па тым, з якім імпэтам Артур пра гэта распавядае, становіцца зразумелым, што новай задумай ён папраўдзе апантаны. Не меней, чым папярэдняй — рэбрэндынгам цэнтра Мінска, які з яго лёгкай рукі цяпер многія называюць не іначай, як "Горад СОНца".

…А пачалося ўсё, як звычайна, выпадкова. Гады тры таму здымачная група трылера Андрэя Кудзіненкі "Хард рэбут" (камп'ютарны тэрмін, які азначае поўную перазагрузку) шукала лакацыі для ўвасаблення яго сюжэта. Кіно пра тое, як папулярны гурт (у дадзеным выпадку, "Noise MC") вырываецца з абдымкаў цывілізацыі на прыроду, каб там "перазагрузіцца". Аб'ехалі паў-Беларусі, але належную аўру адчулі толькі ў Каптарунах. Уласна, фільм містычным чынам і стаў пачаткам "перазагрузкі" вёскі.

— Патрапіўшы сюды, я зразумеў, што гэта сапраўдны рай, — кажа Артур Клінаў, які быў мастаком стужкі. — І адразу стаў рабіць захады, каб набыць тут дом.

Знайсці спусцелую хату аказалася няцяжка, ды і каштавала яна як сярэдні веласіпед. Што праўда, з дарогі яе было не відаць — гароды ператварыліся ў джунглі. Каб прывесці ўсё ў больш-менш чалавечы выгляд, спатрэбіўся не адзін месяц.

— Дом я набываў для сябе, але з часам з'явілася жаданне падзяліцца гэтай прыгажосцю з іншымі, — працягвае Артур Клінаў. — Узнікла ідэя даць вёсцы новае жыццё, стварыўшы тут зону свабоднага крэатыву ў розных сферах мастацтва. Я адразу зразумеў, што рэалізаваць такую задуму самастойна немагчыма, ды пачаў шукаць аднадумцаў.

Мастак стаў запрашаць гасцей. Некаторыя з іх і самі купілі дамы ў Каптарунах. Так утварылася невялічкае пакуль "кам'юніці" аднадумцаў, якое мае перспектыву пашырэння.

Ландшафтнага архітэктара Андрэя Каравянскага заспець у Каптарунах не давялося — ён цяпер шчыруе над ці не самымі знакавымі аб'ектамі Масквы. Затое яго сусед Ігар Логвінаў бывае тут рэгулярна. Прывітаўшы мяне, ён ахвотна праводзіць экскурсію па ўласным маёнтку. Інтэр'ер выглядае як узор дызайну, недасяжны для "новых беларусаў". Пасля змены ўласніка дом захаваў сваю непаўторную аўру вясковай хаты — ніякага еўрарамонту! Толькі на сценах вісяць шляхецкія партрэты ды карціны знаёмых мастакоў. А на падворку ўжо вырасла веранда, прызначаная адмыслова для правядзення там розных імпрэзаў.

Мінаючы пару закінутых хатаў, трапляю да Артура Клінава і неўзабаве ўпэўніваюся, што ён нават у побыце рэалізуе свае мастацкія погляды. Звычайная "шпакоўня" ў яго постмадэрнісцкай інтэрпрэтацыі пераўтварылася ў класіцыстычны павільён з тэатральнымі кулісамі — нешта накшталт тых эрмітажаў ("месцаў для адасаблення"), што з'яўляліся ў магнацкіх сядзібах XVIII стагоддзя.

Неўзабаве такіх арт-аб'ектаў у Каптарунах паболее. Напрыканцы ліпеня пяцёра даволі вядомых аўтараў атрымалі магчымасць выпраменіць сваю творчую энергію ў даволі ўтылітарным рэчышчы. Вынікі пленэру, без сумневу, будуць запатрабаваныя публікай — нават незалежна ад іх мастацкай вартасці.

Агратурызм для багемы?

У рэчышчы глабальных сацыяльных і дэмаграфічных працэсаў усё гэта выглядае поўным "разрывам шаблону". Працэс урбанізацыі на Беларусі яшчэ зусім нядаўна падаваўся незваротным: у гарады, здавалася, ад'язджалі ўсе, хто ўвогуле ў стане рухацца. Урэшце, урбанізавацца сталі і самі вёскі, актыўна засвойваючы гарадскую культуру не ў самых лепшых яе праявах.

А тут раптам такі паварот сюжэта… Дзеячы "малаўцямнага" паспалітаму люду мастацтва, якія ведаюць Кройцберг значна лепей, чым Шабаны, раптам выпраўляюцца куды Макар цялят не ганяў — на самы ўскраек Беларусі, дзе нават айчынныя мабільныя аператары "не дабіваюць". Раней такія мастакі імкнуліся ў Парыж або хаця б у які Дзюсельдорф.

— Бегчы на захад няма сэнсу, там такія самыя гарады, як і ў нас, — з веданнем справы тлумачыць Артур Клінаў. — Толькі ў вёсцы ты можаш па-сапраўднаму адчуць жыццё, перажываць літаральна кожны яго момант, штохвіліны вяртацца да самой ягонай сутнасці. Што такое світанне ў мегапо-

Рэплікі пра…

Беларуская мова і чартапалох

Даю цытату (амаль): "Ужо многа гадоў нас папікаюць за тое, што мы пабеларуску не чытаем і што большасць з нас не ўмее выказвацца і гаварыць на роднай мове. Справа ў тым, што мы і рады чытаць пабеларуску, але славеснасць наша вельмі абмежавана. Яна, зразумела, прадстаўлена некалькімі цудоўнымі паэтамі, але нельга патрабаваць ад чытачоў выключнай заахвочанасці паэзіяй. У прозе мы маем некалькі найцікавых раманаў, між тым як у той жа … кнігі адна цікавейшая за другую выходзяць у свет. Мы не надта бачым і добрыя пераклады, але многія аддаюць перавагу арыгіналу. Часопісы нашы цікавыя больш за ўсё літаратарам. Чытачы і наогул ўвесь народ паведамленні і навіны, простыя чалавечныя паняцці чэрпаюць з кніг чужаземных, такім чынам і думаем (мыслім) мы на мове іншаземнай (ва ўсялякім разе тыя, якія сочаць за думкамі чалавечага роду)…"

Гэты абзац не я прыдумала. Тыя думкі выказаныя амаль 190 гадоў таму Аляксандрам Пушкіным у аповесці "Рослаўлеў" пра становішча на той час рускай мовы і літаратуры. Канечне, я гэты абзац пераклала на беларускую мову, падправіўшы "пабеларуску" замест "па-руску" і дадаўшы шматкроп'е замест "Францыі". Але як жа сугучна напісанае класікам калісьці са становішчам мовы і літаратуры ў нашай краіне. Цяпер усе скрозь гавораць па-руску і не верыцца, што ў XIX стагоддзі дваране ад мала да вяліка гаварылі толькі па-французску, што сам паэт мала калі пераходзіў на рускую мову, што пісьмы пісаў і жонцы і сябрам у асноўным па-французску. Ужо даўно мусіруюць (больш за ўсё інтэлігенцыя) слова "трасянка", не задумваючыся, што гэта проста неразумна. Класікі рускай літаратуры Пушкін, Леў Талстой і іншыя, атрымліваецца, таксама пісалі на руска-французскай трасянцы.

Ды горшае становішча было сорак гадоў таму, калі я была студэнткай. Тады студэнты былі ў большасці з перыферыі, беларуская мова — іх родная, і яны яе саромеліся. Стараліся перавучыцца, "рюсили", падладжваючыся пад гарадскіх, баючыся ўчуць ад іх пра сябе абразлівае: "калхоз", "дзярэўня". Праз некалькі гадоў навучання прыезджыя па-руску ўжо гаварылі не горай за гарадскіх. Ды нават і не ў мове справа. Я неяк аналізавала, хто дзе апынуўся праз гады з тых, з кім я вучылася. Найбольш выбітныя аказаліся якраз выхадцы з вёсак, якія з дзяцінства прывыклі да цяжкай сялянскай працы і мелі прагу да навучання, да ведаў — якраз яны цяпер займаюць высокія пасады па прафесіі.

У цяперашні час становішча, канечне, змянілася, і, я магу сцвярджаць, да лепшага. На калідорах Нацыянальнай бібліятэкі я чую беларускую гаворку ад маладых людзей, студэнтаў. Калі супрацоўнік гаворыць па-беларуску, у адказ амаль заўсёды гэтак жа адказваюць і яму. Мала таго, у калідорах бібліятэкі, дзе акустыка як каля Нёмана, гавораць па мабільных тэлефонах на беларускай мове, і адчуваецца ў гэтай гаворцы гонар за мову. У рваных джынсах, з пірсінгамі, з дрэдамі на галаве — і вось на табе, беларуская мова. У гэтым праяўляецца нейкі свайго роду кіч, але кіч усё ж культурна-інтэлектуальны. Гэта паказчык, ды яшчэ які станоўчы, у пад'ёме нацыянальнай свядомасці выбітнай моладзі Беларусі.

Але чытаючы творы беларускіх пісьменнікаў (асабліва маладых, хаця і не толькі), я прыходжу да высновы, што многія з іх не спрыяюць развіццю беларускай мовы, а нават шкодзяць ёй, уводзячы ў свае творы проста абсурдныя выразы і словы. Гэта выдуманая, штучная мова. Напрыклад, "замовіць білет на самалёт". Чаму не заказаць білет? Замовіць можна рожу, замовіць слоў-

лісе? Ды нічога, ты яго нават не заўважаеш, бо паглыблены ў свае надзённыя механістычныя працэсы. Іншая справа — тут, у Каптарунах.

Варта адзначыць, што гэты дэмарш мае гістарычныя прэцэдэнты. Толькі ў суседняй Польшчы іх было некалькі. Найстарэйшы і найвядомы — тэатральны цэнтр у Гардзеніцах — распачаўся амаль сорак гадоў таму. Расчараваўшыся ў ідэях свайго легендарнага настаўніка Ежы Гратоўскага, акцёр і рэжысёр Уладзімеж Станеўскі (на той час — самы пік авангарда) з купкай аднадумцаў выправіўся ў глухую вёску ды атабарыўся ў занядбанай шляхецкай сядзібе. Праз нейкі час (што праўда, ён вымяраўся дзесяцігоддзямі) Гардзеніцы сталі Мекай для аматараў тэатра з усёй Еўропы. Заадно і сядзібу прывялі да ладу.

Важная дэталь: і ў гэтым выпадку, і ў выпадку з ініцыятывай яшчэ аднаго тэатрала Кшыштафа Чыжэўскага (пра створаны ім "Сейненскі феномен" — у № 51 "К" за 2014 г.) ініцыятыва гарадскіх культуртрэгераў ад пачатку была разлічана найперш на мясцовае насельніцтва — простых вяскоўцаў. Ці будзе настолькі ж інклюзіўнай і дзейнасць у Каптарунах — альбо арт-вёска стане аб'ектам агратурызму для сталічнай багемы?

— Многія нашы задумы разлічаны перадусім на мясцовых жыхароў, прычым мы хацелі б бачыць іх не толькі ў пасіўнай ролі гледачоў, — запэўнівае Артур Клінаў. — У прыватнасці, у нашых планах — тэатральныя майстар-класы для дзетак Пастаўшчыны, у выніку якіх павінен з'явіцца спектакль.

Без сумневу, спадзявацца на поўнае і безумоўнае паразуменне паміж прадстаўнікамі сучаснага мастацтва і вясковай культуры ў яе цяперашнім варыянце можа толькі ідэаліст. У тых жа Гардзеніцах на гэтай глебе паўстала плойма анекдатычных сітуацый. Але ў Каптарунах пакуль што праблем паміж мясцовымі ды "прыбышамі" не ўзнікае.

— Калі людзі бачаць, што ты ўсё ў сваёй хаце робіш уласнымі рукамі, яны ставяцца да цябе не як да сталічнага пана, а як да "свайго хлопца", — кажа Артур Клінаў. — Дзякуючы гэтаму наша мінская калонія набывае аўтарытэт і пэўныя пазіцыі, інтэгруючыся ў вясковую супольнасць.

Яшчэ адно немалаважнае пытанне: якімі будуць стасункі гэтай культурнай інстытуцыі "прынцыпова новага тыпу" з мясцовымі ўладамі? Артур Клінаў запэўнівае, што сёння яны складаюцца найлепшым чынам, і арт-вёска будзе імкнуцца, каб паразуменне перарасло ў партнёрства.

— У гэтым праекце павінны быць зацікаўлены ўсе, — кажа мастак. — Ён важны для краіны ў цэлым, бо працуе на яе імідж, адкрываючы для замежных турыстаў новыя вымярэнні Беларусі, што важна для Пастаўскага раёна, бо спрыяе паляпшэнню яго культурнага клімату, важна, урэшце, для мясцовых жыхароў, бо стварае для іх новыя рабочыя месцы.

Альтэрнатыва спіртзаводу

З імі пакуль што вельмі складана, не толькі ў Каптарунах, але і ў бліжэйшым цэнтры цывілізацыі — мястэчку Лынтупы. Мясцовыя жыхары з настальгіяй згадваюць той час, калі працавала адзінае "горадаўтваральнае" прадпрыемства — спіртзавод. Без яго стала зусім цяжка. Адсюль і згаданае вышэй памкненне ўрбанізавацца.

Між тым, край гэты надзвычай цікавы — ужо хаця б таму, што памежны. Кажуць, некаторыя людзі тут гавораць на чатырох мовах — беларускай, літоўскай, польскай і рускай. А старажылы могуць і на ідыш пару словаў прамовіць.

Дарэчы, і Гардзеніцы, і Сейны таксама размешчаны ў зоне этнічнага ўзаемаўплыву — між іншым, з пэўным беларускім складнікам. У Каптарунах мяркуюць рабіць на гэты памежны фактар асаблівы акцэнт, справядліва разлічваючы, што ён будзе надзвычай прывабным для стомленых ад уніфікаванай культуры турыстаў.

Аднаўляць спіртзавод інвестары пакуль не спяшаюцца. Панацэя з'явілася з самага нечаканага боку: звычайныя гараджане ўжо далёка не ў першым пакаленні актыўна скупляюць занядбаныя вясковыя дамы ды наноў засвойваць забытыя яшчэ іх далёкімі продкамі навыкі гаспадарання.

— Гэта вытлумачальна, бо ўласная зямля для кожнага беларуса — паняцце бадай анталагічнае, — разважае Артур Клінаў. — Згадайма хаця б лецішчы, якія і дасюль маюць характар нацыянальнай хваробы. Але ў савецкія часы чалавек большага сабе не мог дазволіць, а калі з'явілася магчымасць вяртання да хутарскога жыцця…

У ваколіцах Лынтупаў такіх "панаехаўшых", здаецца, ужо ці не болей, чым мясцовых жыхароў, і завітаўшы ў мясцовае "сяльпо", ты лёгка можаш сустрэць там вядомую персону.

— А тут няма нічога дзіўнага, калі ўлічыць, што і ў міжваенны час у гэтых мясцінах збіралася багема з усёй Другой Рэчы Паспалітай, — кажа архітэктар-рэстаўратар Вадзім Гліннік, заспеты акурат у такой сітуацыі.

І добра, каб гэтыя людзі былі проста "дачнікамі"! Але ж за кубкам кавы яны няспынна абмяркоўваюць ідэі па рэвіталізацыі ўсяго Лынтупскага краю ды пераўтварэнні яго ў сапраўдную цукерку для аматараў культурнага турызму. Ды і не толькі абмяркоўваюць… Адпаведна, Каптаруны павінны стаць адным са складнікаў маштабнага, прынцыпова новага і надзвычай перспектыўнага праекта. Які, зрэшты, вымагае асобнай гутаркі.

К

ца за каго-небудзь (у сэнсе заступіцца). Ці слова "распавесці", якое як чартапалох прыляпілася амаль у кожнай сучаснай публікацыі. Яшчэ Янка Брыль абураўся, пішучы ў кнізе і мне асабіста кажучы, як гэта не натуральна для беларускай мовы. Потым шырока скарыстоўваюць яшчэ і слова "лядоўня" — халадзільнік. Здаўна лядоўня была амаль у кожнага ў вёсцы. Выкопвалі яму, зімой рэзалі на рацэ лёд. Трамбавалі яго ў гэтую яму, рабілі будан і цэлае лета клалі туды харчы. І калі было, напрыклад, холадна ў хаце, казалі: "У хаце проста лядоўня". Мову ператварылі ў тую, якую немагчыма чытаць: "раўналеткі" — аднагодкі, "вылекаваўся" — вылечыўся, "марозіва" — марожанае, "лазенка" — ванная, "варыльня" — кухня, "іспыты" — экзамены, "вучэльня" — інстытут ці акадэмія, "пераляк" — перапалох, "гаўбец" — балкон, "асадка" — ручка, "ангельская мова" — дзе тыя ангелы, што гавораць на гэтай мове?

І яшчэ. Пра Таварыства беларускай мовы. Чытаю ў інтэрнэце: "За гады сваёй дзейнасці ТБМ дасягнула значных поспехаў у пашырэнні ўжывання беларускай мовы ў сучасным беларускім грамадстве". Узнікае пытанне, як можна дасягнуць пашырэння ўжывання мовы? Выходзіць, трэба сабрацца і разважаць, як гэта прыгожа, культурна і прыстойна — размаўляць на беларускай мове. Пасля гэтага прыйдзе чалавек дадому і адразу загаворыць па-беларуску. Як пісаў Леў Талстой пра таварыства ананімных алкаголікаў, каб не піць, не трэба збірацца ў суполкі, трэба проста паасобку не піць. Так і тут — нашто мяне і кожнага агітаваць, калі я і так размаўляю і пішу па-беларуску. А калі да мяне звяртаюцца на рускай мове — я на гэтай мове і буду адказваць. Так патрабуе этыкет. І не буду дэманстраваць веданне беларускай мовы і ставіць у няёмкае становішча суразмоўцу.

Калі ж зачытваць вершы членаў таварыства, то толькі даб'ешся адваротнага. Зразумела, не ўсіх паэтаў. "...адзін натоўп, а не народ, не нацыя..." — гэта пра сучасны беларускі народ. "І думала напэўна прадавачка: "Няйначай, зноўку горад захапілі беларусы..." (З кнігі "Аднойчы вечарам: вершы тэбээмаўскіх паэтаў"). Такі абсурд, што нават разважаць не хочацца.

Дарэчы, колькі жыву ў сталіцы, дзе б што ні купляла — за маю беларускую мову на базары яшчэ і скідку даюць. У народзе жыве настальгічная памяць мовы, і, як я казала вышэй, праяўляецца гэта цяпер у дзецях і ўнуках. На маю думку, "дасягаць поспехаў у пашырэнні ўжывання беларускай мовы" трэба не перакананнямі, а справай. Ведаю банкіраў, прадпрымальнікаў, палітыкаў, дыпламатаў, якія цудоўна валодаюць мовай. З такіх людзей моладзь бярэ прыклад.

Таіса СУПРАНОВІЧ,
член Саюза пісьменнікаў Беларусі

Працяг тэмы — **на старонцы 6.**

Дзе гэта ўсё?

Паважаная рэдакцыя, дзякуй вам за публікацыю "Спальваў у попел свае сэрца і душу" (№ 12) пра цікавага нашага мастака Леаніда Лапчынскага. Неяк на пачатку 1970-х я сустракаў яго на беразе ракі Свіслач у раёне вуліцы Аранская, калі ён там рабіў свае замалёўкі… Было цікава назіраць, як мастак малюе, як з-пад яго пэндзля раптоўна ўзнікае карціна краявіду берага ракі Свіслач і драўляных хатак, якія стаялі сярод садочкаў і кветак. Такія людзі сапраўды нясуць у сэрца і душу нешта добрае і светлае, і за гэта яму доўгая і светлая памяць… Хто ведае, можа, у гонар Лапчынскага з'явіцца і вуліца ў сталіцы.

Дарэчы, ёсць у нас паміж праспектамі Партызанскім і Ракасоўскага цэлы квартал з назвамі вуліц у гонар рускіх мастакоў: Айвазоўскага, Сярова, Грэкава, Васняцова, Шышкіна. Як аматар мастацтва я паважаю творчасць гэтых асобаў, і няхай назвы гэтых вуліц і надалей захоўваюцца. Але ці ёсць у нас вуліца ў гонар, скажам, народнага мастака Івана Ахрэмчыка? А вуліца народнага мастака, Героя Беларусі Міхаіла Савіцкага? Відаць, нездарма ў свой час апошні так хваляваўся пра культуру адносін паміж людзьмі і эстэтычнае выхаванне маладога пакалення. Дзе гэта ўсё? Можа, у Год культуры мы неяк інакш паспрабуем адносіцца да нашай роднай Беларусі? Бо жыццё чалавечае — адно маленькае імгненне!

Уладзімір ГОЛУБЕЎ, пенсіянер

Дзяжурны па нумары

Каркасон радзівілаўскай мары

Летам бацькі імкнуцца спалучыць неспалучальнае: чымсьці забавіць дзяцей, але абавязкова з адукацыйным пасылам, каб да верасня школьнік назапасіў новыя веды. Для сябе я паставіла яшчэ больш складаную задачу: адшукаць "настолку" для неназойлівага вывучэння Беларусі. Ці выканальная місія?

Настасся ПАНКРАТАВА

Прабегла па крамах, што спецыялізуюцца на стратэгіях, галаваломках і хадзілках. Для майго першакласніка ідэальна падышоў бы варыянт з мэмары, але гандляры прапануюць шукаць парныя карцінкі на любыя тэмы, толькі не пра нацыянальныя адметнасці. Я бачыла каробкі з карткамі пра абедзве расійскія сталіцы, прыродныя дзівосы і архітэктурныя адметнасці суседняй краіны, нават пра карціны расійскіх мастакоў. Ці так складана айчынным выдаўцам друкаваных гульняў адціснуць некалькі партый з выявамі беларускіх гарадоў, нашай флоры і фаўны ці партрэтамі нацыянальных славутасцяў? Упэўнена, арыгінальную прадукцыю размялі б адказныя бацькі і прасунутыя настаўнікі. А які б гэта быў сувенір для тых, хто любіць практычныя падарункі! З аднаго боку, амаль паштоўкі, з іншага — у інструкцыі шмат карыснай інфармацыі па кожнай з выяў.

Сапраўды, можна не вынаходзіць ровар, а зрабіць спецверсію папулярных замежных гульняў. Прынамсі, паспрабаваць па аналогіі з "Каркасонам" (гульня ўваходзіць у дзясятку самых знакамітых у свеце) будаваць не абстрактныя рыцарскія ўмацаванні, а княжацкія палацы Радзівілаў. Ці, адштурхнуўшыся ад нашумелых "Каланізатараў", прыдуманых у Германіі дваццаць гадоў таму, засноўваць замкі і збіраць землі Вялікага Княства Літоўскага (заадно вывучыць імёны славутых князёў, падцягнуць гісторыю і геаграфію). Ганяць не на безаблічных грузавіках, а на МАЗах, вынайсці казачную сцежку сярод айчынных міфалагічных істотаў ці "прабірацца" па закінутых тунэлях, напрыклад, са "Скарбніцы" Гутэн-Чапскіх у Станькава. Можна зрабіць "мастацтвазнаўчае" лато з фотаздымкамі лепшых нацыянальных скульптур і карцін, прадумаць стратэгію па лоўлі прывідаў у закуліссі Купалаўскага тэатра ці шукаць "згубленыя" прадметы, параўноўваючы выявы карцін Нацыянальнага мастацкага музея. Ці знойдзецца ў спецыфічнай прадукцыі годны рынак збыту? Але гадоў пяць таму і вышыванкі бачылі хіба на фальклорных фестывалях, а сёння яны ў трэндзе, айчынны арнамент зараз ціснуць на шкарпэткі, вокладкі дакументаў, чахлы для смартфонаў і нават на шыны тых самых роваваў.

Беларускасць можна надаць любому хобі. Прынамсі, модныя зараз карціны па нумарах: чаму не прыдумаць раскладку Сафійскага сабора ці палаца Румянцавых і Паскевічаў? Дзецям прапанаваць насыпаць з каляровага пяску зубра ці зрабіць барэльеф васілька. А падараваць сябру кубік Рубіка з беларускімі пейзажамі? Такі рарытэт, але з музея д'Арсэ з карцінамі Манэ, некалькі гадоў стаіць у мяне на паліцы і нязменна прыцягвае ўвагу гасцей. Пра пазлы ўвогуле маўчу: яны павінны ляжаць у сувенірнай краме кожнага турыстычнага аб'екта, бо сённяшнія тэхналогіі дазваляюць самой установе зрабіць такую галаваломку. Дарэчы, безліч пазлаў і размалёвак па нумарах з выявамі экспанатаў я бачыла ў Траццякоўскай галэрэі — і запыт на іх быў і яшчэ які!

А я ўсё ж знайшла патрэбную гульню. Айчынная кампанія, што стварыла беларускі аналаг знакамітай манаполіі, летась запусціла на рынак новы прадукт — віктарыну "Уся Беларусь". Трэнажор ведаў па родным краі прапануе гульцам карту краіны. Трэба стартаваць у Гродна і, адказваючы на пытанні пра флору, фаўну, геаграфію, культуру і гісторыю краіны, пераскокваць з горада ў горад, каб фінішаваць у Мінску. Чамусьці выдавец пасквапнічаў, прапанаваўшы гульнявое поле памерам з палову стандартнага аркуша паперы. На фоне маляўнічых замежных настолак наша значна прайграе… І некаторыя пытанні дзіўна складзеныя, напрыклад, пра "Паланэз Агінскага" запытваюцца так: "Гэты паланэз Міхала Агінскага з'яўляецца адным з самых вядомых у гісторыі музыкі". Верагодна, аўтары спяшаліся запоўніць гэту нішу, таму першы тыраж аказаўся не самым дасканалым. Але сама ідэя патрабуе павагі! На каробцы пазначана "Хіт". Не ведаю дакладных лічбаў продажу, але сапраўды бачу гэтую віктарыну ва ўсіх знаёмых. І мару, што хутка лінейка беларускіх настолак папоўніцца разнастайнымі (і адначасова адукацыйнымі!) гульнямі.

К

“Сабраць” горад як пазл

Павел ДЗЮСЕКАЎ,
гісторык, экскурсавод, краязнаўца.

Я ладжу дармовыя экскурсіі па Мінску ўжо чацвёрты сезон. Збіраю людзей праз суполкі ў сацыяльных сетках. Стаў гэтым займацца, бо дармовых вандровак па Мінску на сталай аснове ніхто не робіць.

Павел Дзюсекаў.

Такія рэчы вельмі папулярныя ў Еўропе. Для мяне гэты праект не пра грошы ў першую чаргу, хаця я мог бы паставіць нейкі мінімальны кошт, бо з’яўляюся ІП. Але тады згубілася б частка аўдыторыі. Турфірмы нават вінавацілі мяне ў дэмпінгу і пагражалі пазбавіць ліцэнзіі! Але я зрабіў экскурсіі дасяжнымі для ўсіх, і да мяне ідуць прадстаўнікі розных катэгорый насельніцтва: ад школьнікаў да пенсіянераў. Радуюся, калі бачу адны і тыя ж твары: значыць, чалавеку спадабалася, зачапіла, вось ён і прыйшоў зноў.

Сталыя наведвальнікі мне вельмі дапамагаюць парадамі і справай. Адна дзяўчына прывезла з Амерыкі гучнагаварыльнікі (да таго я карыстаўся мікрафонам). Яшчэ з тэхнічных сродкаў выкарыстоўваў на экскурсіях планшэт, каб паказваць выявы, але ў дождж гэта нязручна, на сонцы нябачна. Таму ілюстрацыі раздрукоўваю і важу з сабой у тэчках.

Часта наведвальнікі высылаюць мне карысныя спасылкі, выявы. Пенсіянеры памятаюць горад такім, якім маё пакаленне бачыла яго толькі на фотаздымках. Падчас экскурсіі могуць дадаць 1 — 2 сказы, але гэта цікава ўсім, інфармацыя будзе вельмі карыснай, можа ўвайсці ў мае экскурсійныя тэксты. Я іх перапрацоўваю ўвесь час. Узімку сядзеў за пісьмовым сталом па 10 гадзін, цяпер увесь сезон на вуліцы, у мяне экскурсіі штодня.

Ужо зараз вядомы расклад да канца верасня, людзі могуць спланаваць свой час, загадзя дамовіцца з сябрамі. Я вельмі люблю, калі наведвальнікі прыходзяць на экскурсіі кампаніямі і заўсёды да гэтага заклікаю ў сваіх суполках: маўляў, і вам будзе цікавей не па адным хадзіць, і патрэбная колькасць людзей збярэцца. Я заўжды прыязджаю на месца збору, у любое надвор’е. Але калі збіраецца менш за 10, ну, добра, 9 чалавек — выбачаюся і экскурсію не вяду. Выключэнне раблю толькі для ранішніх экскурсій у нядзелю: калі ўжо людзі падняліся ў выхадны дзень, прыехалі…

З колькасцю наведвальнікаў ніколі не ўгадаеш. Бывае, у сонечнае надвор’е ніхто не прыйдзе, а аднойчы нядзельным дажджлівым ранкам на экскурсію па Кальварыі сабралася 15 чалавек, і ўсе датрывалі да канца. Самая вялікая па колькасці была неяк экскурсія ў Лошыцы. Сабралася каля 100 чалавек, а потым падчас вандроўкі па парку да нас далучылася яшчэ можа 20. Так і хадзілі натоўпам.

Я ўжо зразумеў: гэта не тая праца, з якой я змагу набыць сабе яхту. Але пражыць з яе я магу. Мне падабаецца непрадказальнасць, ніколі не ведаеш, хто прыйдзе, колькі людзей. Акрамя развіцця ўласнага праекта “Minsk free walking tours”, я супрацоўнічаю з турфірмамі, школамі. Раней да 90 працэнтаў наведвальнікаў, што траплялі да мяне праз турфірмы, былі расіяне. Цяпер дакладна наадварот, і я рады, што змог пераарыентавацца на ўнутраны рынак. Попыт скараціўся. Калі раней я атрымліваў ад турфірмаў па 30 — 40 прапаноў на майскія святы, то сёлета — у 10 разоў менш.

Экскурсіі заўсёды вяду па-беларуску. Некалькі разоў падчас дармовых вандровак прасілі перайсці на рускую, я спакойна адмаўляўся. Калі людзям нешта не падабаецца, яны заўсёды могуць сысці. Плюс дармовых вандровак у тым, што я ад пачатку нічога не абавязаны наведвальнікам.

Я не закранаю палітыку і рэлігію, на маіх экскурсіях заўсёды весела, людзі адпачываюць. Зараз маю 15 распрацаваных маршрутаў, выдзяляў іх па геаграфічным прынцыпе. Была думка паступова, ад экскурсіі да экскурсіі збіраць горад як пазл.

Калі заяўлена тэматыка, напрыклад, касцёлы, то ідучы ад святыні да святыні распавяду пра будынкі, што сустракаюцца па дарозе. Хацеў зрабіць маршрут па Курапатах, але падумаў, што для маёй аўдыторыі гэта будзе “цяжкая” тэма. Таму запрашаю на распрацаваныя маршруты!

Занатавала
Алена ЛЯШКЕВІЧ

Нястрашны гендар: дырэктарка і дывергентка

Пішучы пра сферу культуры, не раз сутыкнешся з назвамі пасад: мастацкі кіраўнік гурта, дырэктар сельскага клуба, загадчык аддзела, намеснік загадчыка… А між іншым, большую частку гэтых пасад займаюць жанчыны. І, падавалася б, у такіх выпадках больш рацыянальна пісаць кіраўніца, дырэктарка, загадчыца, намесніца. Але не ўсё так проста.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Па правілах літаратурнай беларускай мовы афіцыйныя пасады называюцца ў мужчынскім родзе. Ужываюцца фемінітывы, ці фемінізмы (розныя навукоўцы кажуць па-рознаму; у любым выпадку гэта словы жаночага роду, якія з’яўляюцца парнымі да аналагічных “мужчынскіх” паняткаў), калі размова ідзе аб асобе, што займае пасаду, у неафіцыйных дакументах і калі пасада не называецца цалкам. Гэта значыць, што трэба напісаць “дырэктар Ёцавіцкага Дома культуры Марыя Іванаўна Лукашэвіч”, але можна “дырэктарка прыйшла на працу”.

Такая сітуацыя паказвае кансерватызм мовы афіцыйных дакументаў: ужо даўно жанчыны засвоілі кіруючыя пасады, але ў моўнай практыцы гэта не заўсёды адлюстроўваецца. Між тым, па ўсім свеце дзякуючы заваёвам фемінісцкага руху ў грамадскім жыцці адзначаецца і фемінізацыя мовы — тэндэнцыя перадаваць назвы пасад, прафесій, нацыянальнасцей і іншых найменняў назоўнікамі жаночага роду, калі размова ідзе аб жанчынах. Дзеля справядлівасці варта зазначыць, што паралельна ідзе пошук мужчынскіх адпаведнікаў (маскулінізмаў) для назваў “жаночых” прафесій. У беларуска- і рускамоўнай прасторы такія спробы ўспрымаюцца часта са смехам: ну, што такое “доктарка”? У нас на вёсцы казалі “дактарыха”, дык што, цяпер і так можна? Тады як: “таварыш дактарыха”? “Спадарыня доктарка”? А “медбрат”? А няня-мужчына — ён хто, “нянь”? Карыстальнік “Фэйсбука” Юра Сідун неяк пажартаваў: “Калі дзяўчына — фея, то яе хлопец — усяго толькі фейк. Але і маленькія феі — таксама ўсяго толькі фейкі”. І такіх анекдотаў утвараецца безліч.

Што думаюць сацыялінгвісты і філолагі

На Кангрэсе даследчыкаў Беларусі ў Коўне сацыялінгвіст Уладзіслаў Іваноў пракаментаваў сітуацыю так: “Ужыванне фемінізмаў і маскулінізмаў — гэта справа звычкі, грамадскіх традыцый. Спачатку можа быць смешна, нязвыкла. Але ж нас не засмучае, напрыклад, што беларуска — такая ж грамадзянка Беларусі, як беларус. З падвышэннем гендарнай адчувальнасці ў грамадстве яна падвышаецца і ў мове. Напрыклад, назву фільма “Дывергент” пераклалі ў мужчынскім родзе ў Расіі і следам за ёй у Беларусі. Там жа галоўная гераіня — дзяўчына! То мусіла быць “Дывергентка”, як шмат дзе ў Еўропе, у жаночай форме. І гэта ж не адзіны выпадак, сістэмна так робіцца!”

Ад розных даследчыкаў даводзілася чуць, што гнуткасць у справе “фемінізаванага” і “маскулінізаванага” словаўтварэння характэрная для беларускай мовы нашмат больш, чым для рускай. Працэсы працягваюцца нават у рускамоўным гарадскім асяродку: не завуць у Расіі школьных настаўніц ні “русіца”, ні “трудавіца”, ні “матэматыца” — гэта чыста беларуская з’ява. “Часта фемінізмы і маскулінізмы фіксуюцца даваеннымі слоўнікамі, — кажа Уладзіслаў Іваноў, — а ў пасляваенны час… кудысьці знікаюць. Напрыклад, цудоўнае слова “рукадзельнік”. Цалкам сабе жывая форма ў 1920-х. А потым нейкі навуковец падумаў, мабыць, што непрыгожа гучыць, ці што рукадзеллем у нас толькі жанчыны займаюцца — і цяпер у літаратурнай беларускай засталася толькі “рукадзельніца”.

Філолаг Аляксандр Пяршай казаў аб “уладзе аўтарытэту акадэмічных ведаў на постсавецкай прасторы”. У нашым выпадку — быццам бы тое, што зафіксавана ў слоўніках, — і ёсць адзіна правільны варыянт мовы. Але ж і праўда, чаму не назваць майстра рукадзельнікам? Хіба пляценне кошыкаў ці кавальства — менш рукадзелле за ткацтва і вышыўку? Тым больш слова дасюль бытуе ў дыялектнай мове; давялося пачуць ад бабулі ў Талачынскім раёне літаральна некалькі месяцаў таму: “Ай і рукадзельнік жа быў мой хазяін! Усё ўмеў. Хоць характар паганы-паганы…”

Каго пакрыўдзілі дзяячка з мастачкай

Калі казаць аб практыцы словаўтварэння, то неяк склалася, што фемінітыўныя суфіксы ўспрымаюцца з пэўнай перасцярогай і нават варожасцю, нават нейтральнае “-ка”. Падавалася б, што крыўднага можа быць у “мастачцы” ці “дзяячцы”? Але гендарныя актывісткі, спрабуючы даследаваць беларускі арт-рынак, сутыкаліся з тым, што мастачкі прасілі, каб іх звалі “мастакамі”. А Уладзіслаў Іваноў распавядаў пра выпадкі, калі беларускі абражаліся тым, што іх у эміграцкай беларускамоўнай прэсе назвалі “грамадскімі дзяячкамі”, і хацелі быць “дзеячамі”. На жаль, калі стагоддзямі ўсе заўважныя, істотныя і добра аплочвальныя месцы ў грамадстве займалі мужчыны, жанчына, трапіўшы на такую пасаду, не хоча, каб яе дасягненні былі “зніжаныя” фемінітыўнай формай. Хаця зноў жа — дзе “зніжэнне”? Хіба ў канатацыях ды галовах.

Такі гендар — справа тонкая. Пісьменніца Святлана Курс (раней Ева Вежнавец, аўтарка ў тым ліку кнігі “Шлях дробнай сволачы”, зборніка аповедаў пра жыццё сучаснай беларускай жанчыны, зробленых у феміністычным ключы) адкаментавала ў “Фэйсбуку”: “Я за фэмінітывы і за навастораныя таксама, але “крытыкесу” не люблю”. З ёй пагаджаецца паэтка Наста Захарэвіч: “А я ўвогуле створаныя праз суфікс “ес” не надта люблю”. Літаратуразнаўца Ганна Кісліцына, вядомая сваімі фемінісцкімі поглядамі, падцвільвае: “А сама кім хочаш называцца — празаесай, празайкай ці празайчыхай?”

Што рабіць з прадавачкай і медбратам

У цяперашняй моўнай сітуацыі можна і трэба шукаць фемінізмы ды маскулінізмы: у старых слоўніках, дыялектнай мове, выданнях беларусаў замежжа. Не грэх і прыдумаць неалагізм, калі ён не пярэчыць правілам беларускага словаўтварэння. Варта толькі памятаць, што некаторыя фемінітыўныя суфіксы могуць пазначаць не жанчыну пэўнай прафесіі ці пасады, а жонку мужчыны з такой прафесіяй. А вось пытанне мілагучнасці, мабыць, павінны вырашаць моўныя камісіі, бо тое, што слова не падабаецца аднаму чалавеку, — не нагода выключаць яго з ужытку. З вядомых нам прыкладаў: такія камісіі дзейнічаюць у Літве, Францыі, Швецыі. У Францыі, праўда, найбольш чуваць пра змаганне з англіцызмамі. У Швецыі камісія сама выдумляе неалагізмы і зацвярджае прапанаваныя насельніцтвам. Выходзіць адмысловы часопіс “Sprak” (“Мова”). У Літве “моўная інспекцыя” сочыць у тым ліку за тым, каб у публічнай прасторы выкарыстоўваліся формы адпаведнага роду. У літоўскай мове словы фемінізуюцца і маскулінізуюцца аўтаматычна. Парадокс, але адзінае слова, для якога няма формы жаночага роду — “modelis” (“мадэль”).

Ужываючы словы жаночага роду, калі кажам аб жанчынах, і мужчынскага, калі аб мужчынах, нават калі формы спачатку здаюцца дзіўнаватымі, мы спрыяем замацаванню такога словаўжывання. Такім чынам узбагачаецца мова і робіцца маленькі крок у бок гендарнай роўнасці, калі фемінітывы перастаюць успрымацца як крыўдныя.

К

“Студня”, якая не абмялее

Лагістыка брэнда

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 3.)

З Беларусі родам славуты аўтакуцюр’е, чалавек, якога называюць “Ле Карбюз’е аўтапрома” Жак (Якаў) Саўчык. Нарадзіўся напрыканцы XIX стагоддзя ў Койданаве, у яўрэйскай сям’і. Меў прафесію чырвонадрэўшчыка. Лёс занёс Якава Саўчыка ў Францыю. Перабраўшы шэраг заняткаў, стаў працаваць з аўтамабілямі. Першыя з іх ўяўлялі з сябе механізм, кузаў-апранаху для якога кожны ўладальнік рабіў на свой густ. Саўчык здолеў зразумець, што за аўтамабілем будучыня. Ён адкрыў майстэрню, дзе рабіліся кузавы і салоны аўтамабіляў. Справы хутка пайшлі ўгору. Саўчыку сталі замаўляць VIP-асобы. Сёння ягоныя працы лічацца шэдэўрамі дызайну.

Іда Розэнталь — вынаходца сучаснага бюстгальтара, нарадзілася ў Ракаве. Вынаходніцтва, якому хутка сто гадоў і якое навечна замацавала за ёй месца ў гісторыі матэрыяльнай культуры, здзейсніла ў Злучаных Штатах. Яна распрацавала эрганамічна дасканалую канструкцыю, сегменты якой можна вар’іраваць у залежнасці ад анатамічных асаблівасцей. Зноў такі, шэдэўр дызайну.

Родам з Талочына Ірвінг Берлін (Ізраіль Бейлін), славуты амерыканскі кампазітар, аўтар неафіцыйнага гімна Злучаных Штатаў Амерыкі “Божа, блаславі Амерыку!” (гэта штосьці накшталт “Широка страна моя родная…”).

Калі б згаданыя райцэнтры — Койданава (Дзяржынск), Ракаў, Талочын — здолелі зладзіць фэсты ў гонар сваіх славутых землякоў, яны, безумоўна маглі б разлічваць на сур’ёзную спонсарскую падтрымку. Да ўдзелу ў фэсце ў гонар Якава Саўчыка мог бы прычыніцца ўвесь беларускі аўтапром. Постаць Іды Розэнталь магла б зацікавіць у якасці гістарычнага брэнда “Мілавіцу”. Ды і Талочын можа прыдбаць турыстычную прывабнасць праз імя стваральніка амерыканскага народнага гімна.

Калі пільна ўгледзецца ў навакольны свет, дык высветліцца, што ніводная вартая справа ў свеце не абыходзілася без беларусаў. Сама ж Беларусь у такім кантэксце становіцца падобнай на студню, з якой колькі ні бяры вады, а яна не мялее. Гэта добры брэнд для краіны.

К

Факты пра артэфакты

У Мінску падвялі вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі нашай краіны ў 2015 годзе. Яны былі агучаны на навукова-практычнай канферэнцыі, якую арганізаваў у маі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Акрамя вынікаў, на форуме было расказана пра змены ў заканадаўстве ў сферы аховы і даследаванняў археалагічнай спадчыны дзяржавы. Аб знаходках, адкрыццях ды законе "К" паразмаўляла з Вольгай ЛЯЎКО — загадчыцай Цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі гэтага інстытута, і з намеснікам яго дырэктара па навуковай рабоце Вадзімам ЛАКІЗАМ.

Алег КЛІМАЎ

Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Белавежскай пушчы. / Фота з фондаў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Беларуская археалогія: вынікі і новаўвядзенні

Вольга Ляўко: "Нягледзячы ні на што..."

— Вольга Мікалаеўна, назавіце, калі ласка, на ваш погляд, самыя... самыя археалагічныя даследаванні, якія праводзіліся ў нашай краіне ў мінулым годзе.

— Гэта раскопкі каля вёскі Копань Рэчыцкага раёна на месцы курганнага могільніка сярэднедняпроўскай культуры. Іх вынікі даюць уяўленне аб тым, як тут цякло жыццё людзей перыяду неаліту ды бронзавага веку. Раскопкі ў Белавежскай пушчы на месцы помніка археалогіі Камянюкі-1 у Камянецкім раёне, дзе былі знойдзены фрагменты керамікі, аскепкі апрацаваных камянёў — нуклеусаў, якія адносяцца да мезаліту — ранняга неаліту. Даследаванне курганнага могільніка паміж аграгарадкамі "Курганне" і "Бацвінава" Гомельскай вобласці, славянскага селішча Барыскавічы-1 Мазырскага раёна. Атрыманыя матэрыялы даюць дадатковую інфармацыю па адвечным пытанні "хто такія славяне?" Працы на плошчы ў 2 тысячы квадратных метраў на славянскім селішчы X — XII стагоддзяў у вёсцы Васілеўшчына Дзяржынскага раёна таксама далі шмат новых уяўленняў аб структуры ды развіцці сельскіх паселішчаў гэтага часу. Працягваліся работы ў Брэсцкай крэпасці, дзе некалькі гадоў таму знайшлі старажытныя могілкі (у 2015 годзе там выяўлена новае старадаўняе пахаванне), у сядзібе Ваньковічаў.

Цікавы археалагічны комплекс Кардон у Шумілінскім раёне. Дзесьці ў 1933 годзе адкрылі гарадзішча на Заходняй Дзвіне ды прылеглае да яго селішча, але затым даследаванні там практычна не праводзіліся. І ў мінулым годзе мы гэта месца, якое датуецца IX — XII стагоддзямі, калі фарміраваўся шлях "з вараг у грэкі", вывучылі больш дэталёва. Толькі павярхоўнае абследаванне ям, выкапаных "чорнымі капальнікамі", прынесла важныя знаходкі: візантыйскую манету, арабскія дырхемы, накладкі на збрую, крыжыкі, скандынаўскія гіркі.

Адбылося некалькі цікавых шматабяцальных экспедыцый сумесна з мінскім дайвінг-цэнтрам "Марскі пегас", супрацоўніцтва з якім у галіне падводнай археалогіі ў мінулым годзе выйшла на больш якасны ўзровень.

— Вы кантактуеце і з замежнымі партнёрамі...

— З французскімі археолагамі ўжо не першы год шукаем у раёне Барысава дакладнае месца пераправы Напалеона праз Бярэзіну. Некалькі стаянак французскай арміі на беразе знойдзена, французы ўвогуле задаволеныя, але хочуць большага.

Прадстаўнік Эрмітажа разам з супрацоўнікам Веткаўскага музея народнай творчасці Аляксандрам Драбушэўскім праводзіў даследаванні на магільніку зарубінецкай культуры ў вёсцы Гарошкаў на Гомельшчыне. Як бачыце, нягледзячы ні на што, даследаванні ідуць па ўсёй краіне. У цэлым, магу сказаць, што 2015 год выдаўся для беларускай археалогіі не горшым, чым 2014-ы. Прайшлі выдатныя даследаванні, звязаныя са старажытнымі напластаваннямі — з перадславянскімі, раннеславянскімі (я ўжо не кажу аб выніках даследаванняў эпохі неаліту ды бронзы), Сярэднявеччам ды Новым часам. Ды шмат чаго было зроблена, нягледзячы на цяжкасці.

— Нягледзячы менавіта на што, Вольга Мікалаеўна?

— На беднае фінансаванне, на мізэрныя магчымасці. Дзякуй ВНУ, якія на ўмовах супрацоўніцтва адпраўляюць студэнтаў на практыку на тыя ўдарныя аб'екты, дзе нам вельмі патрэбныя людзі. (Так і пэўныя ВНУ ў рамках Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў удзельнічаюць сваімі тэмамі ў нашай дзейнасці.) Дзякуй валанцёрам. У савецкі час мы нядрэнна ўзаемадзейнічалі са школамі ў перыяд школьных лагераў, калі яны размяшчаліся на перспектыўных з пункту гледжання археолагаў тэрыторыях. Цяпер — вельмі рэдка, бо школьнікам акрамя грошай ды камп'ютараў больш нічога не трэба.

Мы шчаслівыя, што можам праводзіць даследаванні за кошт заказчыкаў — тых арганізацый, якія ажыццяўляюць, напрыклад, маштабныя дарожныя працы, узводзяць новыя пабудовы ў розных кутках Беларусі. Яны абавязаны інфармаваць нас аб сваёй дзейнасці ды вылучаць грошы на археалагічныя даследаванні. Калі б мы былі абмежаваныя толькі стацыянарнымі даследаваннямі, запланаванымі намі ў межах навуковай Дзяржпраграмы, зыходзячы не ў апошнюю чаргу з наяўных сродкаў інстытута, то эфектыўнасць нашых вынікаў была б не занадта высокая. Ці шмат адкрыццяў учыніш на камандзіровачныя выдаткі, калі выязджаеш адзін у поле? Фундаментальныя археалагічныя даследаванні сёння ў нашай краіне фактычна не фінансуюцца, мы зарабляем грошы на новабудоўлях і дадаем вынікі па гэтых працах да вынікаў тых сціплых даследаванняў, якія праводзім у межах планавай тэматыкі. Але ў скарбонцы ведаў усё ж атрымоўваецца прыбытак. Ёсць і карысны бок маштабных даследаванняў на новабудоўлях. Мы маем магчымасць вывучыць тыя плошчы ды месцы, дзе без будаўнічых работ раскопкі не праводзіліся б, або былі б значна меншымі.

Вольга Ляўко.

Вадзім Лакіза.

Посуд з курганнага могільніка сярэднедняпроўскай культуры каля вёскі Копань Рэчыцкага раёна.

— А да чаго ногі ды рукі археолагаў па нейкіх прычынах яшчэ не дайшлі?

— Шмат цікавых старажытных паселішчаў засталося ў Чарнобыльскай зоне, але, самі разумееце, доступ туды зараз немагчымы. Цікавае з гістарычнага погляду гарадзішча Свіла-1 у Віцебскай вобласці, ды заходні край, Браслаўшчына, слаба вывучаны. З Навагрудчыны знятыя толькі "плеўкі"! Усё ўпіраецца ў зацікаўленасць маладога пакалення археолагаў ды, як ні прыкра, у грошы. Гэта выклікае вялікую заклапочанасць пра лёс археалагічнай навукі ў краіне.

Вадзім Лакіза: "Па "чорных капальніках" нанесены ўдар"

— Вадзім Леанідавіч, наколькі сур'ёзныя адбыліся змены ў нашым заканадаўстве, якія датычацца беларускай археалогіі?

— Яны досыць сур'ёзныя. 14 снежня 2015 года быў прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь N 485 "Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў". Гэта сапраўдны прарыў у справе аховы археалагічнай і гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Да дадзенага дакумента мы — дзяржава, грамадскасць, прафесійныя археолагі, Міністэрства культуры, Нацыянальная акадэмія навук, Інстытут гісторыі, ВНУ, гістарычныя факультэты — рухаліся доўга. Да моманту выхаду Указа ў краіне склалася вельмі небяспечная сітуацыя, якая паказвала, што па ўсёй Беларусі, "дзякуючы" так званым "чорным капальнікам", руйнуюцца помнікі ды аб'екты археалогіі. Калі мы, па вялікім рахунку, кантралюем сітуацыю з зонамі новабудоўляў, маем магчымасць спыніць, прыпыніць іх, калі на якой-небудзь тэрыторыі выяўляюцца археалагічныя аб'екты, то за "дзейнасцю" ўсіх "вандалаў з металашукальнікамі" ўсачыць, на жаль, не можам. Нават нягледзячы на тое, што ёсць законы ды пастановы, якія, напрыклад, забараняюць выкарыстанне металадэтэктараў без дазволу Нацыянальнай акадэміі навук, "чорныя капальнікі" працягваюць сваю "чорную" справу. Бо не было магчымасці правапрымянення такіх актаў.

— Дзіўна...

— Юрысты і археолагі, якія сутыкнуліся з правапрымяняльнай практыкай, тлумачаць, што існавалі пэўныя нестыкоўкі ў заканадаўстве, якія не дазвалялі канкрэтныя выпадкі такіх парушэнняў падчас судовых разглядаў давесці да лагічнага канца — пакарання.

— А цяпер?

— Цяпер становішча змянілася. Указ уступіў у сілу з 18 сакавіка 2016 года, як і шэраг пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і НАН Беларусі, накіраваных на паспяховую яго рэалізацыю. Вызначана неабходная тэрміналогія ў галіне аховы археалагічнай спадчыны; прапісана, хто мае права дазваляць правядзенне археалагічных даследаванняў, каму можна іх праводзіць, якія дакументы для гэтага патрабуюцца, хто можа карыстацца металадэтэктарамі і якія дакументы пры гэтым патрэбныя; устаноўлена форма дазволаў на права правядзення археалагічных даследаванняў, у тым ліку пошуку археалагічных артэфактаў; прапісана, што археалагічныя артэфакты належаць дзяржаве: напрыклад, у грамадзяніна Лакізы яны захоўвацца не могуць. І калі грамадзянін Лакіза знойдзе (нават выпадкова) нейкі прадмет, на яго погляд, падобны на нешта такое старажытнае, ён абавязаны яго здаць органам мясцовай улады. Тыя перададуць гэтую рэч у абласную або ў мінскую камісію па археалагічных аб'ектах і археалагічных артэфактах, якая і прыме рашэнне, ці з'яўляецца яна археалагічным артэфактам. Калі так, то ён будзе перададзены ў дзяржаўную навуковую арганізацыю, у якой ёсць музей, альбо непасрэдна ў адпаведны дзяржаўны музей.

Указам уводзіцца абмежаванне або забарона на зварот археалагічных артэфактаў сярод грамадзянскага насельніцтва: на набыццё, продаж, дарэнне, мену, залог. Пры гэтым дзяржава пайшла насустрач тым, хто да ўступлення ў сілу Указа меў на руках археалагічныя артэфакты, атрыманыя імі ў пераважнай большасці з парушэннем заканадаўства. Да канца 2016 года яны могуць праз археалагічныя камісіі легалізаваць іх ды вызначыць, ці з'яўляюцца тыя ці іншыя матэрыяльныя прадметы, у тым ліку старажытныя манеты, археалагічнымі артэфактамі. Пры пацверджанні чаго яны ўключаюцца ў рэестр археалагічных артэфактаў, а чалавеку выдаецца адпаведная выпіска з пратакола, і рашэнне аб гэтым высылаецца ў Інстытут гісторыі. Грамадзянін з гэтага часу мае права захоўваць іх у сябе, перадаць музею, абмяняць.

Акрамя таго, падрыхтаваны яшчэ адзін законапраект, унесены на разгляд у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, згодна з якім прадугледжваюцца канкрэтныя адміністрацыйныя пакаранні за парушэнне дзеючых нарматыўна-прававых актаў у галіне аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў, а таксама падключэнне да дадзенай справы супрацоўнікаў органаў унутраных спраў.

Заканчваючы нашу экспрэс-гутарку, Вадзім Леанідавіч, тым не менш, з трывогай заўважыў, што асобныя "чорныя капальнікі" спрабуюць як бы ўбудаваць сваю "дзейнасць" у рамкі Указа, звяртаючыся ў розныя дзяржаўныя інстанцыі з просьбай дазволіць ім на пэўных умовах праводзіць уласныя "археалагічныя пошукі". Спадар Лакіза вельмі спадзяецца, што ім дадуць ад варот паварот...

К

Што робіце? — Фестывалім!

Юбілейны XXV "Славянскі базар у Віцебску" адплыў у гісторыю. Якія ўражанні ён пакінуў? Чым запомніўся? Ці ўзніклі на ім якія новыя дэталі, перспектыўныя для далейшага разгорту гэтага Міжнароднага фестывалю мастацтваў і ўвогуле фестывальнага руху ў краіне?

Надзея БУНЦЭВІЧ

Формула адпачынку

Віцебскі фэст дае падставу для роздумаў не толькі дзеячам мастацтва, але і сацыёлагам. Каму, як не ім, даследаваць прыроду святкаванняў беларусаў і магчымыя змены на гэтай ніве. Памятаю, як у сярэдзіне 1990-х народ падцягваўся да амфітэатра і чакаў "халявы": пасля таго, як рассядуцца гледачы па квітках, на канцэрты, што не сабралі дастаткова публікі, пачынаўся вольны ўваход. Найбольш прадпрымальныя рабілі яшчэ больш хітра: прыходзілі са сваім "сабойчыкам" і рассаджваліся на траўцы паабапал амфітэатра — вядома, да яго рэканструкцыі. Дый на экран, усталяваны перад уваходам, ішлі прамыя трансляцыі. Народ адпачываў так, што пасля начных канцэртаў у цэнтры горада няма было дзе ступіць: усё было завалена смеццем, пустымі бутэлькамі.

Пазней, асабліва калі праз кожныя некалькі метраў на ўсіх подступах да амфітэатра ставілі кантрольна-прапускныя пункты і не дазвалялі праносіць у цэнтр горада нават ваду для дзіцяці, колькасць мінакоў значна знізілася. Але ўжо другі год запар — узрастае. І не толькі таму, што акрамя Горада майстроў, які перасунуўся ў Задзвінне, па ўсіх вулачках цэнтра разгарнуліся з фантазіяй упрыгожаныя падворкі рэгіёнаў ды гандлёвыя палаткі беларускіх прадпрыемстваў. Да ўсяго гэтага летась даваліся вулічныя выступленні — і сёлета традыцыя была працягнута: фэст вулічнага мастацтва "На сямі вятрах" сабраў шматлікіх паэтаў, музыкантаў, перформераў з "жывымі скульптурамі", тэатральныя і танцавальныя калектывы. На "круглым стале" "Культура і мастацтва як крыніца развіцця духоўна-маральных каштоўнасцей. Роля СМІ ў фарміраванні агульнай культурнай прасторы славянскіх народаў" з вуснаў мастацкага кіраўніка Беларускага тэатра "Лялька", заслужанага дзеяча мастацтваў краіны Віктара Клімчука ўвогуле прагучала думка, што фестываль папсапраўднаму пачаўся толькі са з'яўленнем шырока разгорнутага вулічнага складніка, які і стварае ў горадзе асаблівую атмасферу ўсенародных святочных гулянняў.

Сёлета хадзьбу на ходулях засвоілі і маладыя артысты тэатра "Лялька", далучыўшыся да вулічных прадстаўленняў і падрыхтаваўшы спектакль "Шагал. Зыход" (рэжысёр — Дар'я Зімніцкая). У тым, што вулічныя спектаклі могуць быць не толькі шырокамаштабнымі, але і камерагі хусткі. "І былі ў іх" знятыя з арэляў то Калабок, то Каза-дзераза, то Курачка Раба. Кожная з трох казак заканчвалася інтэрактывам з дзецьмі, развучваннем з імі найбольш простых рухаў народных танцаў. Тонкая фонасфера спектакля стваралася не толькі з народных мелодый, але і з асобных уздыхаў-перазоваў-бразгання разнастайных "падручных" інструментаў. І хаця ёй моцна перашкаджалі дынамікі з жуданай папсой, ад якой няма было куды падзецца, дзеці і бацькі радасна адгукаліся на кожную прапанову артыстаў.



Я павяду цябе ў музей!

Сёлетняй адметнасцю фестывалю стала багатая выставачная праграма. Супрацоўнікі мастацкага і краязнаўчага музеяў разам са сталічнымі калегамі падрыхтавалі суцэльны шэраг экспазіцый, праз якія можна было б лепей далучыцца да культуры і гісторыі Віцебшчыны і ўсёй Беларусі. На тое, каб наведвальнікі прайшліся не па адной выстаўцы, а па ўсіх залах таго ж мастацкага музея, настройваў "комплексны" квіток за 5 рублёў. У краязнаўчым, каб прыцягнуць увагу тых жа журналістаў, сумясцілі ўрачыстае адкрыццё адразу трох выставак. Але расійскія "акулы пяра", на жаль, выказвалі цікавасць найперш да сваіх зорак, нават кідаючы фразы накшталт: "Дык гэта ж вашае — навошта яно нам?" Затое прадстаўнікі іншых славянскіх краін — наадварот, прагнулі паглядзець штосьці менавіта беларускае.

Французскі куцюр'е, беларус па паходжанні Юрый Кот прывёз у Віцебск сваю модную калекцыю з ільну. Паказ мадэляў дэманстраваўся ў час прэзентацыі арт-праекта "Зачараванне": фотамастачка Ірэна Гудзіеўская здымала прыгажунь студыі "Тамара" ва ўлонні непаўторных беларускіх краявідаў — і цяпер яны "ажывалі", быццам выходзячы з развешаных фота ўжо ў выбітных ільняных строях, па-еўрапейску стылёвых, вытанчаных. Не адна я лавіла сябе на думцы: вось каб такія сукенкі — ды ў нашы крамы! Бо льняныя вырабы могуць быць не толькі грубай радзюгай, але і шыкоўным адзеннем не адно ў фальклорным стылі. Каб мары сталі явай, на тую імпрэзу, як паведамілі супрацоўнікі краязнаўчага музея, былі пакліканы прадстаўнікі некалькіх швейных прадпрыемстваў. Але… ніводны штосьці не дайшоў. Мабыць, у іх свае "музеі"? З застарэлых мадэляў, што не карыстаюцца попытам. Але заўважым: адзенне з фестывальнай і нацыянальнай сімволікай, а таксама з беларускімі вышыванкамі стала сёлета ў разы болей — у вулічным продажы. Чаму не на мінаках-пакупніках — іншая справа: патрэбны больш прывабныя, сучасныя мадэлі і, прабачце, адпаведная коштавая палітыка.

Як лайнер назавеш…

Здаецца, мінулі тыя часы, калі галоўнай адметнасцю гала-канцэрта закрыцця былі працяглыя салютаванні. Сёлета салют, дый тое вельмі кароткі, вянчаў толькі афіцыйнае адкрыццё фестывалю. Затое згаданы канцэрт закрыцця набыў, нарэшце, амаль цалкам вытрыманую канцэпцыю скіраванасці на моладзь — на сцэне і, адпаведна, у зале. Старэйшыя пакаленні таксама не былі пакрыўджаны: яны ўбачылі Аляксандра Буйнова, Міхаіла Шуфуцінскага, Аляксандра Разэнбаўма, Валерыя Лявончцева (дарэчы, пасля яго сольніка адна маладзенькая журналістка са здзіўленнем прызналася, што гэты, на яе думку, "даўно пенсіянер" дасць фору многім навамодным спевакам: ярка, таленавіта, відовішчна, сучасна — проста супер!). Але ледзь не ўпершыню ў час закрыцця на сцэну натоўпамі беглі з букетамі не адно дамы бальзакаўскага ўзросту, а суцэльныя чароды падлеткаў і нават маленькіх дзяўчынак: выступалі Аляксандр Рыбак, "MBand", Юльяна Караву-лава, Джыган, Ягор Крыд і многія іншыя ўлюбёнцы маладзёжных тусовак. Гэты "позірк у будучыню", спалучыўшыся з папраўдзе бліскучым, напоўненым усмешкамі ды сюрпрызамі вядзенням канцэрта, надалі закрыццю даволі энергічны (за выключэннем асобных "прасяданняў") тэмпарытм. А яшчэ — скіраванасць не толькі на ўсход (у выглядзе расійскай папсы, зразумела), але і на захад, бо ўдзельнічалі папраўдзе добрыя эстрадныя спевакі з Германіі, Францыі, ЗША.

А тое, што дзяенне канцэрта адбывалася быццам бы на караблі, выклікала ў памяці "Славянскі базар-1993": тады на сцэне і сапраўды быў збудаваны гэткі караблік. Пераемнасць? Напамін пра тое, што новае — гэта добра забытае старое? Можа, і так. Але ў параўнанні з тагачаснай лодачкай цяперашняе судна — вялізны лайнер, паходжанне якога, калі верыць харэаграфічнаму пралогу канцэрта закрыцця, арганізатары вядуць ад… Старажытнай Грэцыі з яе арганаўтамі і пошукамі залатога руна.

Што ж, фестываль не адночы рабіў спробы спалучыць масавую культуру і выкшталцонае элітнае мастацтва, быць цікавым для шырокай публікі і знаўцаў. Не заўсёды, праўда, атрымлівалася. Але некаторыя апошнія зрухі ў гэтым напрамку, імкненне весці фестываль не толькі па забаўляльным і палітычным шляхам (яднанне народаў, міралюбства — вельмі правільная палітыка дзяржавы), а яшчэ і ўласна па асветніцкіх, мастацкіх сцяжынках-дарожках, у тым ліку авангарднаэксперыментальных, не можа не прыцягваць. Што ні кажыце, а фестываль як выхаванне нацыі — гучыць годна. І словы, падслуханыя ў фестывальным віры і вынесеныя ў назву артыкула, набываюць новы сэнс: не проста святкуем, спяваем, "гудзім", а менавіта фестывалім.

К

У садзе жыцця, гісторыі, вечнасці

Спалучэнне "Вішнёвага сада" Антона Чэхава з імёнамі славутых беларускіх творцаў, а менавіта рэжысёра Алега Жугжды і тады яшчэ жывога мастака Валерыя Рачкоўскага, ускаланула тэатральную грамадскасць некалькі гадоў таму, калі гэты спектакль Тэатра лялек "Агніва" з Мыцішчаў быў вылучаны на прэстыжную расійскую прэмію "Залатая маска-2009". Потым падзея забылася, але сёлетні "Славянскі базар у Віцебску" і яго праект "Лялечны квартал" зноў вывелі яе на аванцэну культурнага жыцця краіны.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Сцэна са спектакля "Вішнёвы сад".

Здавалася б, апошнім часам тых "Вішнёвых садоў" насадзілі безліч — розных і вельмі адметных, прычым не толькі па выкарыстаных сродках, але і па закранутых тэмах: ад псіхалагічных тонкасцяў, хто каго кахае, — да жорсткай драмы кінутага, усімі забытага чалавека; ад клаўнады і элементаў тэатра абсурду — да сімвалічнага ўвасаблення праблем фарміравання нацыянальнай свядомасці і захавання генетычнай памяці, як гэта было зроблена ў аднайменным монаспектаклі Андрэя Саўчанкі. Немагчыма забыцца і на колішні, 15-гадовай даўніны, спектакль Аляксея Ляляўскага "З Парыжам скончана!.." у Беларускім дзяржаўным тэатры лялек, дзе ўпершыню на нашай тэатральнай прасторы ў гэтай "школьнай" класіцы разбураліся традыцыі, змяняліся трывалыя акцэнты — надзвычай ярка, часам безапеляцыйна.

Версія Алега Жугжды пярэсціць спасылкамі і на некаторыя ранейшыя "…Сады", і на іншыя пастаноўкі самога рэжысёра. Ёсць у ёй і намёкі на тыя трактоўкі чэхаўскіх характараў, што былі замацаваны не ў XX-ым, а менавіта ў XXI стагоддзі. Але ў цэлым гэтае прачытанне — прынцыпова новае паводле сваёй агульнай канцэпцыі. П'еса Антона Чэхава пададзена быццам скрозь прызму творчасці Міхаіла Булгакава, між гэтымі пісьменнікамі працягнуты заўважныя і вельмі моцныя ніці. Здараецца, некаторыя пастаноўшчыкі ўвогуле адмаўляюцца ад такога другаснага, на іх думку, персанажа, як Шарлота: маўляў, прышчык тут як фокусы? Жугжда, наадварот, робіць яе ледзь не галоўным героем, які "дырыхырыце" астатнімі — у тым ліку, у прамым сэнсе. Спектакль пачынаецца з агульнага хору ўдзельнікаў, схаваных у паўзмроку. На апошняй ноце нам высвечваюць жудасную ўсмешку на твары дырыжора — гэта, як пазней высвятляецца, Шарлота. У самім яе абліччы ёсць штосьці не толькі клоўнскае (набелены твар, рыжы парык у спалучэнні з капелюшом-кацялком ды фракам), але і д'ябальскае — чым не Воланд ці кот Бегемот з "Майстра і Маргарыты", Мефістофель з "Фаўста"? Асацыятыўныя шэрагі вядуць і да кабарэ пачатку XX стагоддзя, і да паспярэвалюцыйных малюнкаў, на якіх высмейваліся "праклятыя капіталісты" — звычайна ў падобным убранні і заўсёды больш таўсценькія, "укормленыя" ў параўнанні з астатнімі.

У спектаклі, дзе акрамя персанажаў-лялек прысутнічаюць героі, ужо собленыя толькі артыстамі, няма простага падзелу на "жывое" і "змярцвелае". Усё куды складаней: жывы план аддадзены тым сацыяльным слаям, якія прыходзяць на змену збяднеламу, бездапаможнаму дваранству і яго прыхільнікам-"ахоўнікам" накшталт таго ж Фірса, падобнага да гэткага троля-"дамавёнка", які цягам спектакля аддана абараняе прыгонны строй. Невыпадкова некаторых лялек на нашых вачах дастаюць са скрыняў-чамаданаў — і туды ж, быццам у труну, у фінале складаюць, уносячы са сцэны гэткай пахавальнай працэсіяй: іх час скончаны. Але чый жа час наступае? Ушчэнт п'янага мінака ў чырвонай кашулі ды шапцы-вушанцы? Нікуды не вартых, ні да чаго не здольных прыстасаванцаў Яшы і Дуняшы? На такім фоне нават Шарлота страчае палову сваёй д'ябальшчыны і ў пэўны момант выклікае спачуванне. Самай жа трагічнай, неадназначнай фігурай сярод "жывых" аказваецца Лапахін. Раптам узнікае думка, што менавіта яму няма месца ў той "светлай будучыні", якую ён пабудуе сваімі рукамі (а больш няма каму будаваць, астатнія — хіба ахвотнікі на дармовае шампанскае).

Асабістыя стасункі між героямі сыходзяць на другі план перад сацыяльна-гістарычнай праблематыкай, спробай асэнсаваць мінуўшчыну ў яе сувязях з сучаснасцю і будучыняй. Таму і лялькі такія розныя паводле памераў і стыляў. У параўнанні са сваёй маці Ранеўскай, працавітая Вара — удвая меншая і куды больш старая. Яе сястра Аня выглядае на… ейную ўнучку — гэткую ляльку савецкіх часоў, якую (праўда, у іншай сукенцы) з радасцю пасадзілі б на вясельнае аўто. Дый у фінале яе разам з каханым Пецям Трафімавым на словах "Прывітанне, новае жыццё!" запіхваюць не ў "труну", а ў гэткі зграбненькі куфарочак: такія "цацкі" яшчэ спатрэбяцца, асабліва Пеця з яго дэмагогіяй. Сцэна баля вымушае ўзгадаць аперэтачную віхуру ў час Першай сусветнай. Сякера — знешне "абмастачанае" аблічча рэвалюцый, бо яе дастаюць, бы музычны інструмент, з аздобленага аксамітам футляра. Маленькая выява Эйфелевай вежы, прычэпленая да задніку, — гэткі нефункцыянальны "магніцік" на лядоўню. Металічная графічнасць канструкцыі вежы раптам вядзе да паралеляў з архітэктурным канструктывізмам савецкіх 1920-х. А сам сад у выглядзе дрэўца-галінкі (то ў кветкі, то з ягадкамі, то з пажухла-памярцвелым лісцем — у адпаведнасці са зменай пораў года, якія асацыююцца і з чалавечымі векам, і з цыклічнасцю гістарычных працэсаў) накрыты зверху пластыкавым корабам і нагадвае музейны экспанат — гэткую мадэль "у маштабе".

У спектаклі няма ні прыгажосці, ні зачаравання, ні настальгіі па іх — толькі імклівы разгорт думак. І лялькі, і людзі наўмысна непрывабныя — ніводнага традыцыйна "станоўчага" персанажа, усе абвінавачаныя і адначасова пацярпелыя. У несумненным выйгрышы — толькі гледачы.

Апошнія сабраліся столькі, што віцебская "Лялька" не магла змясціць і палову. Пры гэтым побач, у хвіліне хады, у межах праекта "Тэатральная сустрэчы" на коласаўскай сцэне ішоў "Царскі падарунак" з расійскімі кінаэзоркамі Кацярынай Волкавай і Мікалаем Дабрыніным. Значыць, захавалася ў нас дасведчаная публіка (а можа, і выхавалася, бо на маёй памяці "Атэла" Эймунтаса Някрошуса на "Славянскім базары-2002" ішоў у… напаўпустой зале), што прагне не толькі "хлеба ды відовішчаў", але і спажывы для розуму.

К

Шэсць адбіткаў у люстэрку часу

У дадзены момант ўсе паверхі сталічнага Палаца мастацтва займаюць шэсць персанальных выстаў. Пяць з іх прымеркаваныя да юбілеяў, адна — памяці творцы. Некалькі персанальных выстаў у адной экспазіцыйнай прасторы — гэта амаль заўжды праблема для арганізатараў. Бывае даволі цяжка гарманічна спалучыць узоры рознай творчай ментальнасці, амбіцыйнасці і таленту. Але глядач у падобных выпадках калі-нікалі атрымлівае перад вачыма панарамны вобраз цэлага перыяду ў гісторыі мастацтва.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Ігар Арлоў. "Анюта".

Мікалай Драненка. "Машканскі краявід".

Анатоль Ізаітка. "Вада, якая перамешана з сонцам".

Леанід Данэлія. "Космас у кожным з нас?"

Аляксандру Грэсю споўнілася 65 гадоў. На сваёй выставе ён прадставіў жывапіс і ўзоры саломкапляцення. Менавіта ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве на глебе народных традыцый ён напоўніцу раскрывае свой талент. Спадар Грэсь рабіў упрыгожанні да сцэнічных касцюмаў вядомых фальклорных ансамбляў. Ягоныя дэкаратыўныя работы былі вельмі дарэчы, калі музейным экспазіцыям і эматычным выставам трэба было надаць народны коларыт. Што ж датычыць жывапісу, дык ён не з'яўляецца важным чыннікам творчасці Аляксандра Грэся. Але маляванне вясковых краявідаў і рэшткаў "аўтэнтычнай", некранутай цывілізацыяй прыроды дазваляе мастаку псіхалагічна ўвесь час быць, што называецца, у тэме — у арэале народнай традыцыі.

Леаніду Данэлія — 70 гадоў. Большую частку свайго творчага жыцця мастак прытрымліваўся рэалістычнай стылістыкі, а вось на юбілейнай выставе прадставіў работы, якія ў большасці можна было б аднесці да негеаметрычнага абстракцыянізму. Але элементы фігуратыўнасці ў ягоных карцінах не знікаюць зусім. Яны прысутнічаюць у яго як знакі пачуццёвай знітаванасці з вабнотамі жыцця.

Лявон Грышук, якому споўнілася 65 гадоў, зрабіў стрыжнем экспазіцыі творы на біблейскую тэматыку. Мне заўжды было цікава, як да рэлігіі прыходзяць людзі, якія большую частку жыцця (прынамсі, той час, калі фарміруюцца асновы маральнасці асобы) пражылі ў атэістычнай краіне з матэрыялістычнай ідэалогіяй. Магчыма, на такі паварот лёсу паўплываў удзел спадара Грышука ў ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Калі выбухнуў энергаблок у мястэчку з сімвалічнай назвай Чарнобыль, многім узгадалася біблейская Зорка-Палын… Карціны Лявона Грышука пазбаўлены побытавай канкрэтыкі і адлюстроўваюць адвечнае супрацьстаянне Дабра і Зла, Святла і Цемры.

Мікалаю Драненка — 70 гадоў. Ён майстар акварэлі. У экспазіцыі прадстаўленыя ягоныя краявіды, выкананыя ў гэтай складанай тэхніцы, якая патрабуе ад мастака ўпэўненай рукі і здольнасці да імправізацыі. Я сказаў бы, што творы спадара Драненкі адлюстроўваюць не столькі стан прыроды, колькі стан душы творцы, настроенай на станоўчае бачанне свету.

Ігар Арлоў адзначыў персанальнай выставай сваё 60-годдзе. Экспазіцыю складаюць партрэты, нацюрморты, сюжэтныя карціны сімвалічнага зместу. Ды, бадай, найбольш эфектна глядзяцца памайстэрску выкананыя ў традыцыях класічнага рэалізму краявіды. Глядзіш на іх і згадваеш рускіх класікаў пейзажнага жанру. І яшчэ думаеш: няўжо недзе яшчэ захававалася такая некранутая, прыгожая, як у першы дзень Стварэння, прырода?

Анатоль Ізаітка нарадзіўся ў 1954 годзе, пайшоў з жыцця, калі яму было 60 гадоў. Гэтая экспазіцыя — выстава памяці. Відавочна, мастак па жыцці быў філосафам. Але гэтая іпастась не замінала яму жыць непрыхаванымі эмоцыямі. Ён глыбока асэнсоўваў антычную міфалогію, у якой бачыў не толькі займальныя аповеды ў рамантычна-экзатычным абрамленні, але найперш — літаратурную энцыклапедыю чалавечай душы, яе жарсцяў, пакут і катарсісу. Мастак меў і своеасаблівы погляд на каштоўнасці Хрысціянства і іх ролю ў нашым соцыуме. І акрамя ўсяго, маляваў цудоўныя краявіды. Кожны ягоны пейзажны эцюд — гэта свайго кшталту аўтапартрэт душы мастака на той, канкрэтны, момант.

Згаданыя творцы не належаць да агорты мэтраў нацыянальнай культуры. Але без іх панарама нашага мастацтва не будзе поўнай. У іх творчасці і чалавечых лёсах адбіліся не кідкія, але важныя для разумення часу рысы. У дапытлівага гледача, які хай нават хуткім крокам пройдзе па ўсіх шасці выставах, складзецца даволі аб'ектыўнае ўяўленне пра тое, што было значным для нашай грамады ў апошнія некалькі дзесяцігоддзяў і што захоўвае сваю каштоўнасць зараз.

К

"Размовы…" ў тэкстылі

З 2012 года аўтарская некамерцыйная канцэптуальная галерэя "Брама" ладзіць пленэры тэкстыльнай скульптуры. Летась IV Міжнародны пленэр адбыўся ў Славакіі, а вынікам яго стала экспазіцыя "Размовы ў зялёным". Тэкстыльныя скульптуры ўдзельнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Славакіі вандравалі па мастацкіх музеях нашай краіны, а ў ліпені спыніліся ў галерэі "Лабірынт" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Вольга РОПАТ / Фота аўтара

Вольга Конева. "Мезальянс".

Творы ўдзельнікаў пазначаны як "скульптуры", але, на маю думку, скульптурай у літаральным сэнсе вырабы з тэкстылю назваць цяжка. Гэтыя работы можна аднесці да арт-аб'ектаў. Зроблены яны з карункаў, лямцу, стужак, шэрсці, лёну… Вырабы ўвогуле добра ўзаемадзейнічаюць з прасторай. Яны ўдала ўпісаліся б у экстэр'ер і змаглі надаць яму адпаведны каларыт. Магчыма, вырабам такога кшталту знайшлося б месца, напрыклад, каля дачнага доміка: аб'екты і настрой узнімуць і эстэтычна парадуюць. Адзінае, што выклікае хваляванне, — ападкі. Вырабы вельмі "далікатныя", таму нават невялічкі дождж, падаецца, зможа нанесці ім шкоду.

Зялёны колер у аўтарскіх творах мае сімвалічны сэнс. Яго можна трактаваць як сімвал свабоды, жыцця, нараджэння… Удзельнікаў не абмяжоўвалі ў тэматыцы, і мяккія арт-аб'екты атрымаліся ў большасці з лірычным настроем. Увогуле, яны "ўтульныя", спакойныя і гармачнічныя. І што цікава: іх можна разглядаць з розных ракурсаў.

Аўтары далі сваім творам паэтычныя назвы, часам з інтрыгай: "Размова з ценем", "Пра зялёнае з Гарсія Лорка", "Падлашчванне паветра да травы", "Упаду да тваіх ног", "Неканструктыўная размова", "Шэпт адкрытых вокнаў"… Кожны з аўтараў у пластычнай форме паказаў стан, эмоцыі, з'явы… Галоўнае тое, што ва ўдзельнікаў атрымалася паказаць абстрактна, не дэталізуючы аб'ект, у матэрыяльным нематэрыяльнае.

"Песня дажджу" Аляксандра Захарава нагадала мне па сваёй ідэі адзін з твораў Анатоля і Ірыны Кузняцовых: яны зрабілі фантан са шкляных выцягнутых дэталяў. "Песня дажджу" таксама мела выцягнутую форму. Уразіў на экспазіцыі твор "Падлашчванне паветра да травы". У чым яго асаблівасць? Ліліяна Гудава і Таццяна Ласка змаглі перадаць рух травы, на якую падзьмула паветра. У гэтым майстрам дапамог каркас і штучны шоўк. Звярнула ўвагу на "Неканструктыўную размову", зробленую з шоўку, паралону, нітак. Спадабаліся выгіны, гарманічнае ўзаемадзеянне формаў. У "Размове з ценем" Марыя Барысенка паказала дзве розныя фігуры. Ценьаўтар зрабіла цёмнай і вялізнай, здаецца, яна вось-вось праглыне танклявую светлую фігурку. Працягвае тэму камунікацыі выраб Алы Кірылавай "Ёсць кантакт". Нягледзячы на такую "суровую" назву, твор падаўся мне казачным, узнёслым.

Вырабы з тэкстылю ўдзельнікаў Міжнароднага пленэру атрымаліся цікавымі і разнастайнымі. Толькі для мяне ўсё яшчэ "адкрытым" застаецца пытанне: дык ці магчыма іх назваць скульптурамі?..

К

Журналісцкі аўтатур газеты "Культура"

Сядзіба ў Багудзенках.

Турызм — не наша справа… А турыст — не наш аб'ект?

Свіслацкі раён яркага брэнда пакуль не мае

Мы ніколі раней не былі ў Белавежскай пушчы з яе паўночнага боку. Нам вельмі спадабалася. Пра гасціннасць Святаслава Болбата мы ўжо казалі. Па душы прыйшлося і тое, як тут за старасвецкім лесам даглядаюць. Калі дрэва ветрам паваліла, яго не чапаюць, распільваюць на чурбачкі і пакідаюць на гэтым жа месцы. Словам, робіцца ўсё, каб пакінуць прыроду максімальна некранутай, першароднай. Вось каб такое ўважлівае стаўленне — ды да нашай нацыянальнай культуры…
За белавежскія вечар ды раніцу пазнаёміліся мы з даўгалыгім зайцам, велічным каршуком ды сугнеістай ліскай. Яны — неад'емная частка мясцовай фаўны, язык не павернецца назваць іх аб'ектам палявання.

Яўген РАГІН, Кастусь АНТАНОВІЧ, Мінск — Ваўкавыскі, Бераставіцкі і Свіслацкі раёны Гродзеншчыны — Мінск / Фота аўтараў

А Кастусь Каліноўскі — неад'емная частка мясцовай гісторыі. Нарадзіўся ў Мастаўлянах (цяпер — польскае Падляшша), у 1856 годзе скончыў Павятовую гімназію ў Свіслачы, жыў пэўны час у фальварку Якушоўка, дзе бацька меў ткацкую мануфактуру. Нам падказалі, што захаваўся падмурак будыніны. Ад Белавежы да Якушоўкі — рукой дацягнуцца. Не выкарыстаць гэты шанц і не пабываць у мясцінах, звязаных з Каліноўскім, было б недаравальным глупствам.

У пошуках крыжа

Але лёгка было дабрацца да Якушоўкі на словах. А вось на справе… На выездзе з пушчы доўга кружлялі па шашы і прасёлкавых трактах. Быццам бы тут дзесьці мэта пошукаў, а знайсці ніяк не можам. У спякотны поўдзень людзей на вясковых вуліцах няма, параіцца няма з кім. Нейкім цудам выйшла да нас кабета і вельмі талкова (відаць, не першы раз) патлумачыла, куды нам рушыць.

А мы па дарозе думалі ўслых вось пра што. Прайшло ўжо некалькі сумесных калегій міністэрстваў культуры і спорту з турызмам, але сітуацыя з апошнім не асабліва і мяняецца. Пэўнае выключэнне змогуць скласці толькі такія гістарычныя аб'екты, як Мірскі ды Нясвіжскі замкі. Прынамсі, дабрацца да іх лёгка: паўсюль дапамагаюць прыдарожныя ўказальнікі. Па дарозе на Якушоўку іх нідзе няма. А ў Свіслацкага раёна, мяркуючы па яго пушчанскім месцазнаходжанні, перспектыва — толькі турыстычная. Але наўкола нават намёк на гэта цалкам адсутнічае.

Нельга сказаць, што работнікі культуры райцэнтра нічога не робяць для піяру мясцовай гісторыі ды культуры. Але пра Свіслацкія кірмашы, баль Вінцэнта Тышкевіча і конкурс-плэнэр "Сімфонія велічы Белавежскай пушчы" (усё гэта мы згадвалі ў мінулым артыкуле) мала хто ведае за межамі раёна і вобласці. А Кастусь Каліноўскі, як ні круці, — нацыянальны герой Беларусі. Тут бы культработнікам Свіслачы ды Вялікай Бераставіцы намаганні аб'яднаць ды стварыць агульны гучны брэнд. Думаецца, Польшча і Літва не засталіся б у баку. Аднак не, штосьці ўпарта не спрацоўвае ў грувасткім механізме ідэалагічнай дзейнасці. У выніку моладзь блытае Вінцэнта і Тадэвуша Тышкевічаў, а Каліноўскага ўвогуле не ведае. Сітуацыя, на наш погляд, недаравальная…

Людзі сюды ідуць і едуць

І вось мы — у Якушоўцы, а за ёю, напрыканцы старасвецкай алеі — падмурак, крыж, мемарыяльны камень. Мяркуючы па надпісе на камені, ўсё гэта захавана і зроблена землякамі. Крыж — дубовы, з каваным металічным аздабленнем. Побач — дарога, па якой ідзе якушоўская жанчына. Пытаемся: "Ці часта тут людзі бываюць?" Адказвае: "Часта. І кветкі пастаянна прывозяць. Стаяць, думаюць пра штосьці"… Пра што думаюць, зразумела: пра Каліноўскага, Беларусь і сябе. Для іншых думак гэтае месца не прызначана. Вось толькі ці многія ведаюць пра яго?

Высветлілі мы і тое, што прыязджаюць у Якушоўку не аўтобусы (значыць, арганізаваных экскурсій няма), а вандроўнікі на легкавіках і роварах. Вандроўнікі, якія хочуць ведаць пра сваю радзіму ўсё. Яны таксама доўга блукаюць па наваколлі ў пошуках крыжа Каліноўскага. Сітуацыя, мякка кажучы, не зусім нармальная. Дазволім сабе паўтарыцца: зусім не пашкодзіла б карта жыццёвага шляху кіраўніка сялянскага паўстання 1863 года і выдаўца беларускай газеты "Мужыцкая праўда". Яна, няма сумнення прыйшлася б даспадобы і вучням, і педагогам, і вандроўнікам…

"Дык няўжо Свіслацкі гісторыка-краязнаўчы музей так і не праклаў у Якушоўку экскурсійны маршрут?" — з гэтай думкай мы і скіраваліся ў Свіслач.

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

Я, шчыра кажучы, пра Якушоўку дагэтуль і не ведаў. Распавёў пра яе наш новы знаёмы з Белавежскай пушчы Святаслаў Болбат, які спіць і бачыць, каб родны Свіслацкі раён пачаў багацець. Вельмі натуральнае жаданне вельмі творчага чалавека. А ўпэўнены шлях у будучыню немагчымы без грунтоўнага ведання таго, што адбывалася на тваёй радзіме шмат гадоў таму. Банальная, але ісціна. З цікаўнасцю, да прыкладу, даведаўся, што калісьці на ўсіх вуліцах-уваходах у Свіслач былі збудаваны аркі і любы госць-купец адчуваў сябе гэткім трыумфатарам. Яшчэ і ў прадчуванні таго, што Свіслацкі кірмаш прынясе для яго немалы грашовы даход. Таму тыя кірмашы для мяне не проста канцэртная дзея, не толькі рэканструкцыя знакамітых тышкевічаўскіх баляў, але і сапраўдная агульнакарысная для прадаўцоў і пакупнікоў гандлёвая акцыя.

Прадказанне збываецца?

Настасся Пекар — музейшчык зусім малады. Працуе з 2014 года. Кіруе ўстановай упэўнена. Менавіта яна нам распавяла, што свіслацкую плошчу па загадзе Вінцэнта Тышкевіча ўпрыгожваў 20-метровы абеліск з залачоным шпілем. У час вялікіх ператрусаў (было мястэчка польскім, стала савецкім, а тут — і Вялікая Айчынная) абеліск быў зруйнаваны. А пад ім, як запэўніваюць музейшчыкі ды краязнаўцы, была знойдзена капсула са зваротам Тышкевіча да грамадзян: горад будзе жыць заможна датуль, пакуль цэлым застанецца шпіль.

Насця Пекар расказала нам, што старшыня Свіслацкага райвыканкама Уладзімір Анішчык хоча адрадзіць абеліск з залачоным шпілем. Гараджане, як мы пераканаліся, вельмі чакаюць гэтай падзеі.

Запыталіся мы ў дырэктара музея і пра галоўнае: "Ці ладзяцца экскурсіі да крыжа Каліноўскага?" І пачулі нярадасны адмоўны адказ. Маўляў, транспарт, бензін, маўляў, дзе жадаючых знайсці, ды ліцэнзіі

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Летам і аўтобус чытае

Самыя актыўныя нашы пазаштатнікі — бібліятэкары. Сённяшняя аглядавая падборка ліставання — яшчэ адзін таму доказ. Цікавай інфармацыі хапае і па іншых сферах дзейнасці рэгіянальнай культуры, ды не толькі яе.

Яўген РАГІН

Летняя арганізацыя адпачынку чытачоў — галоўнае ў сённяшняй бібліятэчнай рабоце. Пра гэта піша метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Свіслацкай** раённай бібліятэкі Алена Рабчанка. "*Штогод ладзім конкурс "Лета і кніга", — паведамляе яна. — Па ўмовах яго трэба рэгулярна наведваць бібліятэку, чытаць, браць актыўны ўдзел у творчых мерапрыемствах*". У лісце гаворыцца, што на самым пачатку лета ў раённым цэнтры прайшла акцыя "Аўтобус, які чытае": у грамадскім транспарце гучалі вершы беларускіх і рускіх аўтараў. Пра летнюю чытальную залу Свіслацкай райбібліятэкі мы пісалі некалькі разоў. Цікава, хто ў краіне пераняў гэты досвед?.. У дзень нараджэння Аляксандра Пушкіна ў Свіслацкай дзіцячай *бібліятэцы стартавала акцыя "Кніжны сквер". У гарадскім парку грамада* разгадвала крыжаванку "Я люблю казкі Пушкіна". Поразаўская, Ханевіцкая бібліятэкі-цэнтры краязнаўства, Вярдоміцкая бібліятэка рэалізоўваюць праект па супрацоўніцтве з дзецьмі, што адпачываюць у летніках.

Генерал-маёр у адстаўцы Аляксандр Фень падараваў **Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны** аўтарскія кнігі "Вызваленне Мінска", "Пра бітву пад Курскам" і "Пэўныя пытанні савецкага вайсковага мастацтва ў бітве пад Масквой і Сталінградскай бітве". Пра гэта паведамляе "К" Мікалай Шаўчэнка. "*Аляксандр Фёдаравіч,* — сказана ў лісце, — удзельнік вызвалення Беларусі. У ліпені 1944 года ў складзе 31-й брыгады 29-га танкавага корпуса гвардзейскай танкавай арміі на пасадзе начальніка штаба танкавага батальёна вызваляў Мінск ад фашыстаў. Цяпер яму 92 гады. Але ветэран актыўна супрацоўнічае з музеем, з'яўляецца яго навуковым кансультантам".

Навіна з **Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі**. Бібліятэкар аддзела абслугоўвання Кацярына Лясун распавядае, што арганізавала сустрэчу з паэтам Міхасём Скоблам і спявачкай Таццянай Грыневіч-Матафонавай. Гучалі не толькі вершы і песні. "*Адбылася прэзентацыя дыска "Галасы паэтаў", — піша Кацярына, — дзе запісана 60 беларускіх паэтаў".* Цягам чатырох гадоў запісы збірала Таццяна Грыневіч-Матафонава. На дыску гучаць галасы Якуба Коласа, Янкі Купалы, Ларысы Геніюш, Пімена Панчанкі, Наталлі Арсенневай, Анатоля Сыса, Рыгора Барадуліна, Леаніда Дранько-Майсюка, Сержука Сокалава-Воюша, Андрэя Хадановіча, Алега Мінкіна… Навіна, сапраўды, унікальная. Ад сустрэч з зоркамі і эфект — зоркавы.

Конкурс майстэрства культарганізатараў прайшоў у межах юбілейнага Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Вядучы метадыст Віцебскага абласнога цэнтра народнай творчасці Андрэй Струнчанка распавядае, што мэта конкурсу — "*дэманстрацыя магчымасцяў і патэнцыялу гульні, адраджэнне традыцыйнай народнай казкі*". Гран-пры атрымаў **народны тэатр гульні "Лёлі" з Браслава**.

І яшчэ адно паведамленне з Віцебска. **Культурна-гістарычны комплекс "Залатое кола горада Віцебска "Дзвіна"** (раней — Цэнтр

"Дзень здароўя" ў Лішкаўскай сельскай бібліятэцы.

Генерал-маёр у адстаўцы Аляксандр Фень (справа).

Крыж Каліноўскага ў Якушоўцы.

Віктар Акудовіч: "Тут размесціцца летні амфітэатр".

Анастасія Пекар.

Ірына Паўлючэня.

на перавозку людзей і на экскурсіі патрэбны… Усё так. І без рэкламы не абысціся, і без папярэдняй арганізацыйнай дзейнасці. Без гэтага вада самацёкам пад мемарыяльны камень Якушоўкі не пацячэ. Чамусьці згадаўся бібліятэчны аўтобус на 18 пасажырскіх месцаў, які стаіць у двары аддзела напагатове.

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

У Польшчы, на Падляшшы, даводзілася бываць не адзін раз. Часцей за ўсё шлях туды ляжаў праз пасёлак Пагранічны, што ў Бераставіцкім раёне. Ад яго, можна сказаць, пару крокаў і да Свіслачы, і да Вялікай Бераставіцы. Вось толькі дагэтуль тут бываць не даводзілася. Чаму? Хаця б па той прычыне, што не бачыў сэнсу ехаць туды, дзе не ведаеш якіх-кольвечы цікавостак. Цяпер — ведаю, і з задавальненнем яшчэ раз наведаю гэтыя раёны разам з сябрамі. Гэтаксама, як і многія іншыя гарады і мястэчкі краіны, у якіх мы пабывалі падчас аўтатураў: паселішчы, якія маюць вялікі патэнцыял і цудоўных людзей, ды не маюць належнай раскруткі. Апошняе выпраўляць трэба агульнымі намаганнямі.

Планы — вялізныя

"Турызм — не наша справа", — зазначыла начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ірына Паўлючэня, маючы на ўвазе прэрагатывы дзейнасці райвыканкамаўскага аддзела па спорце і турызме. Усё правільна, Ірына Эдуардаўна. Не першы год "К" вядзе гаворку, што асноўны клопат работніка культуры на турыстычнай дзялянцы — культурнае забеспячэнне турызму. Ідэальны прыклад таму мы бачым, калі пад мурамі Мірскага замка наладжваюцца самыя розныя канцэрты: і класічныя, і эстрадныя. Больш-менш планавыя дзеі ладзяць работнікі культуры ў беларускіх санаторыях (адпачываючы таксама хоча быць раз-пораз калі не турыстам, дык экскурсантам — дакладна). Іншых дарэчных прыкладаў не прыгадаем. Чаму турыст не стаў аб'ектам культурнага шчыравання на аграсядзібах, у гасцінічных комплексах, у музеях, галерэях, старадаўніх маёнтках і парках? Выйсце тут, як мы разумеем, адзінае: ідэалагічную работу сярод пераліку аддзелаўскіх абавязкаў варта замяніць на турызм. Хоць штосьці тады ды зрушыцца. А прыхільнікаў ідэалагічнай падаплёкі пастараемся супакоіць: на культурнай дзялянцы работнікі бібліятэк, клубаў і музеяў займаліся, займаюцца і будуць займацца тым жа: адраджэннем і развіццём нацыянальнай традыцыі… Хіба ж гэта не ідэалогія?

Ірына Паўлючэня з намі пагаджаецца. Так, аддзел недапрацоўвае з турыстамі Белавежскай пушчы, так, трэба актывізаваць дзейнасць па стварэнні брэндаў і піяры мясцовых культурных магчымасцяў. Адзін з самых рэальных сённяшніх праектаў — адраджэнне сядзібы Вінцэнта Тышкевіча ў гарадскім парку. Маўляў, выбітная асоба вартая адпаведнай музейнай экспазіцыі. Мы згодныя з такой пастаноўкай справы: шмат музеяў у горадзе не бывае.

Кнігі-цацкі, кнігі-плэеры…

Задача любой публічнай бібліятэкі — прапанаваць чытачу неабходную літаратуру. Але не хочацца выпускаць з поля зрок у яшчэ адзін немалаважны момант, які прываблівае чытача: утульнасць установы, узведзеную ў ранг рэкламы. Як з першым, так і з другім праблем у Поразаўскай бібліятэцы-цэнтры краязнаўства няма. І гэта не выпадкова, а планава. Па словах загадчыка ўстановы Ірыны Сарай, бібліятэка пераехала ў новы будынак у 2011 годзе. Планіроўка памяшканняў, іх напаўненне адбываліся з улікам бібліятэкарскіх патрабаванняў. Таму маюцца тут гульнёвая прастора для дзяцей з кнігамі-цацкамі і кнігамі-плэерамі. А іх могуць дазволіць сабе набыць далёка не ўсе бацькі.


Поразаўская кераміка.

Апошнім часам бібліятэкары ўшчыльную займаюцца краязнаўствам: даследуюць гісторыю і традыцыі мясцовага ганчарства, росквіт якога прыйшоўся на пачатак мінулага стагоддзя. На жаль, сёння гэтая традыцыя ў Поразаве перапынілася. Але Ірына Уладзіміраўна, рупліва збіраючы ў сваёй установе ўзоры старадаўняй керамікі, у тым ліку славутага поразаўскага майстра Шопіка, не губляе надзеі на адраджэнне.

Ушаноўваюць тут і землякоў. Сярод іх — кампазітар Яўген Паплаўскі (падарыў установе свае кнігі, дыскі), алімпійская чэмпіёнка Яніна Карольчык, бард Віктар Шалкевіч, дзякуючы якому некалькі гадоў таму ў Поразаве адбылася незабыўная сустрэча з Рыгорам Барадуліным. Рэдка ў якую сельскую бібліятэку прыязджаюць зоркі. Мы гэта вельмі ацанілі.

Яшчэ адзін фестываль

І апошні акорд нашай свіслацкай сімфоніі. Неблагі прыклад праектнай дзейнасці мы знайшлі ў Поразаўскім сектары культуры і вольнага часу, якім кіруе Алена Андрушко. Тут сёлета адбудзецца абласны фестываль польскай песні. Старшыня мясцовага сельскага выканкама Віктар Акудовіч кажа: "І грант адпаведны выйгралі. У мясцовым парку цяпер вядуцца работы па ўладкаванні летняга амфітэатра, дарожак, дзіцячай пляцоўкі…"

Мы ўжо і Поразава, падаецца, праехалі. Але з-за купін, з-за алей убачылі незвычайную сядзібу, нейкі драўляны цуд. Аказваецца, называецца сядзіба "Багудзенкі". Жыў тут пан, потым былі бальніца з паліклінікай. А ў 2011 годзе, як паведамілі мясцовыя жыхары, драўляны цуд выкупілі, падаецца, французы. Узімку прыязджалі на паляванне. Але на забудове сярэдзіны XIX стагоддзя няма ніякіх работ па адраджэнні ці рамонце. Дрэва паступова гніе. Прыкра: гэта ж яшчэ адзін турыстычны аб'ект для будучага турыстычнага раёна.

На выедзе з раёна напаткалі ля шашы і наведалі карчму аграсядзібы "У Рыся". Сын гаспадара, блытаючы польскія і беларускія словы, пачаставаў нас за нашы грошы лідскім квасам і распавёў, што гаспадарка ў іх з бацькам — вялікая, некалькі гасцінічных забудоў, нават ёсць імправізаваны карабель ля берага рачулкі, гасцей шмат, але канцэртаў і гістарычных тэатралізацый пакуль няма. Дый ці трэба? Мы потым доўга спрачаліся, хто павінен адказаць на гэтае пытанне: міністэрства спорту і турызму, аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, вандроўнікі ці Рысь-гаспадар?

(Не)лірычнае агульнае заканчэнне

Так, у Свіслач хочацца прыехаць яшчэ раз. Скіравацца праз аркі да залачонага шпіля, набыць на кірмашы поразаўскую кераміку, пагаварыць са шматлікімі турыстамі пра бясконцую прыгажосць Белавежы і мясцовых людзей. Як вы думаеце, ці атрымаецца гэта ў нас неўзабаве?

К

Маладая мастачка Надзея Пашкевіч.

народных рамёстваў і мастацтваў "Задзвінне") сустрэў гасцей: дзіцячую школу народных рамёстваў з Архангельска. Госці прывезлі выставу "Сказ пра рамяство Рускай Поўначы". На ёй адлюстраваны разьба па дрэве і косці, апрацоўка бяросты, лапікавае шыццё, пляценне з кораня — усяго адзінаццаць традыцыйных умельстваў. Пра гэта паведаміла малодшы навуковы супрацоўнік згаданай установы Іна Садаводава.

Загадчык **Ашмянскай гарадской бібліятэкі** Людміла Зарэцкая нагадвае, што "*сёлета раённы цэнтр адзначае 675-годдзе*". Таму ў гарадской бібліятэцы № 1 распачаты інфармацыйныя мерапрыемствы: чытачы могуць даведацца пра гісторыю, традыцыі, эканоміку і культуру сваёй малой радзімы. Краязнаўчая гульня "Сцяжынкамі роднага краю" прапаноўвае віртуальную вандроўку па самых цікавых мясцінах горада і ваколіц. Адна з такіх цікавостак — мемарыяльны знак на месцы гібелі бамбардзіроўшчыка "Ілья Мурамец" падчас Першай сусветнай вайны.

"*У выставачнай зале* **Століна** *працуе выстава жывапісу маладой мастачкі Надзеі Пашкевіч,* — распавядае Галіна Гашчук. — *Яна займаецца лірычнай абстракцыяй. Творы вылучаюцца індывідуальнасцю, нясуць інфармацыю для роздуму, вялікую энергетыку і аўтарскае асэнсаванне быцця*". Выстава адкрыта да 17 верасня.

І зноў ліст з **Бярэзінскай цэнтральнай райбібліятэкі**. На гэты раз ад загадчыка аддзела маркетынгу Тамары Круталевіч — аўтара праекта "Быць падлеткам — няпроста". Гаворка ў пісьме вядзецца пра выхаванне дзіцячай душы. Бібліятэкары ўзнімаюць праблему падлеткавай жорсткасці, імкнуцца яе вырашыць пры дапамозе саміх падлеткаў. Пагадзіцеся, без узаемадаверу тут нічога не атрымаецца. Цікава, наколькі знізіўся працэнт дзіцячых правапарушэнняў у раёне пасля такіх бібліятэчных агітмарафонаў? Тамара Круталевіч пра гэта чамусьці не піша, а шкада.

Падчас конкурсу майстэрства культурганізатараў у межах фестывалю "Славянскі базар у Віцебску".

Пра здароўе юнага чытача дбае і наш новы сябра Зоя Хлебнікава, бібліятэкар **Лішкаўскай сельскай бібліятэкі**, якая з'яўляецца філіялам Бераставіцкай раённай. "*У нас быў Дзень здароўя,* — піша Зоя Якаўлеўна. — *Мерапрыемства праходзіла пад дэвізам "Мяняем цыгарэту на цукерку"*. Запрошаны былі дарослыя (пастаянны ўзор для малечы), у тым ліку і ўчастковы Андрэй Красоўскі. Дарэчы, "К" не раз пісала пра тое, што без сяброўства з участковым інспектарам не можа клубная ўстанова працаваць з поўнай аддачай… Дык вось, адбылося "судзебнае пасяджэнне", дзе слухалася справа пра цыгарэту. Былі суддзя і пракурор, урач і псіхолаг. Гучала страшная статыстыка, пасля якой пракурор запрасіў для падсуднай смяротнага прысуду. Не дапамагло і апошняе слова. Але страты не адчувалася, бо ўзамен кепскай звычкі вучні атрымалі спорт, музеі ды бібліятэкі з выставамі. Не ведаю, ці зменшыцца ў Лішках колькасць курыльшчыкаў, але колькасць чытачоў тут (самі пераканаліся падчас нядаўняй камандзіроўкі) не зніжаецца, расце. Дзякуй, Зоя Якаўлеўна.

І апошні ліст. Ён — пра Дзень **пажарнай службы**. Спецыяліст Савецкага раённага аддзела надзвычайных сітуацый Мінска Таццяна Бычанок расказала пра гісторыю ўзнікнення на Беларусі службы, што сачыла за "вогненнымі парадкамі" (менавіта так называліся калісьці правілы пажарнай бяспекі). Беларускай адпаведнай службе — 163 гады. За апошняе дзесяцігоддзе супрацоўнікі МНС Рэспублікі Беларусь правялі больш за 250 тысяч выратавальных аперацый, выратавалі звыш 50 тысяч чалавек. Ці не палова надзвычайных сітуацый сёння ліквідуюцца цягам 15 хвілін з моманту прыбыцця першага падраздзялення, што дазваляе знізіць агульныя эканамічныя страты. Але няхай дапамога пажарнікаў не спатрэбіцца нашым клубнікам, бібліятэкарам, музейшчыкам!

К

Тактыка культурнага развіцця

Мір і Нясвіж нервуюцца?

Так, бо ў гэтых замкаў з'явіўся сур'ёзны канкурэнт — палац Вікенція Козел-Паклёўскага ў Чырвоным Беразе. Калі хто не ведае, гэта Жлобінскі раён Гомельшчыны. У чым жа ўнікальнасць сядзібы? У тым, што Козел-Паклёўскі, атрымаўшы яе ў XIX стагоддзі ад генерала Гатоўскага, зрабіў з будынка "цукерачку". Тут і неаготыка і неарэнесанс, спецыялісты нават арабскія матывы заўважаюць у гэтым дойлідстве. Але, па вялікім рахунку, нават не ў архітэктурных экзэрсісах справа.

Яўген РАГІН

Сядзіба "ажыла" пасля рэстаўрацыі са снежня 2014 года. Прынамсі, і знешне і ўнутрана, яна ўжо нагадвала той зімой шыкоўную ёлачную цацку. Па маім перакананні, палацавая сядзіба Паклёўскага на сёння — самая прыгожая і самая малавядомая на Беларусі. Час ламаць стэрэатыпы…

Пасля здачы аб'екта ён займеў канкрэтны статус: філіял Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея, які, дарэчы, мае даволі сціплую шараговую архітэктуру. Той рэдкі выпадак, калі філіял выгодна адрозніваецца ад галаўной установы. Але філіяльныя сцены і памяшканні заставаліся без ўпрыгожанняў, люстэрак, родавых партрэтаў і мэблі. Чым і як іх напаўняць у не вельмі спрыяльны эканамічны час?

Свет мяняюць асобы. Гомельскі калекцыянер антыкварыяту Сяргей Пуцілін (персона, вартая асобнага артыкула) аддаў палацу ў арэнду сваю мэблевую калекцыю, за што летась займеў званне лепшага мецэната вобласці. Мэбля — XIX стагоддзя: як раз тое, што трэба было. А падавалася, што мецэнаты ў нашай культуры — не надта ўласцівая з'ява. Не, пайшоў працэс, пайшоў.

Ускалыхнулася мясцовае грамадства. У выніку чырвонабярэжскі палац прыдбаў аўтэнтычнае люстэрка, тое, кажуць, што і пры магнатах адлюстроўвала іх шляхецкае жыццё. Да напаўнення музейнага філіяла падключылася і мытня. А мастак Віталь Адзінцоў прапанаваў серыю партрэтаў, дзе ўладальнікі сядзібы выпісаны сусальным золатам. Апрача гэтага, у палацы ёсць яшчэ дзве карцінныя галерэі (на першым і другім паверхах), дзе выстаўляюцца работы мясцовых жывапісцаў і прывазныя творы. Карацей, ёсць што паказваць экскурсантам. А пра што расказваць заўжды было. Таму і ахвотных наведаць экзатычныя ўладанні ўсё болей.

Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Жлобінскага райвыканкама Валянціна Няхай расказвае, што пры дапамозе гранта ПРААН для павышэння экскурсійнага патэнцыялу ў палацавых скляпеннях створаны рамесніцкія майстэрні. А да рэгістрацыі шлюбаў у музейным антуражы ў верасні дададуцца рэгулярныя тэатралізацыі з гісторыі мясцовай шляхты.

Пра адраджэнне флігеля і старасвецкага парка, аўтарам якога сталі ў свой час замежныя ландшафтныя архітэктары, казаць яшчэ рана. Пры належным фінансаванні работы распачнуцца і на гэтых аб'ектах.

К.

Ах, вішня-вішанька…

З 18 па 23 ліпеня ў Глыбокім адбылося раённае свята "Вішнёвы фестываль". Чым парадавала мерапрыемства жыхароў і гасцей горада? Карэспандэнт "К" вызначыла самыя яркія моманты апошняга дня свята вішні.

Вольга РОПАТ / Мінск — Глыбокае — Мінск / Фота аўтара

На мінулым тыдні рэдакцыя "К" абмяркоўвала пытанне, якімі павінны быць фестывалі. Канешне, пэўная "фішка" ў любым выпадку патрэбна для кожнага з іх. Але ў той момант у рэдакцыі я не змагла знайсці дакладны адказ. Усё стала на свае месцы, калі прыехала на "Вішнёвы фестываль".

Агляд-конкурс падворкаў "Вішнёвыя прысмакі".

Літоўскі майстар Альгердас Брэйдокас.

Майстар ганчарных вырабаў Сяргей Шчэрба.

Смачная "візітоўка" з перспектывай маркетынгу?

Пазнавальнасць імпрэзаў залежыць, вядома, ад лагатыпа, створанага брэнду (згадаем "Славянскі базар у Віцебску", фестываль вулічнай музыкі "Месца пад сонцам", "Тэарт"…). Так, лагатып у выглядзе вішні можна было ўбачыць на сувенірнай прадукцыі, у тым ліку на разнастайных кубачках, кепках, гадзінніках ды іншых рэчах. З водарам гэтай смачнай ягады зрабілі і вараную згушчонку… Я ўжо не кажу пра печыва ды розныя смачныя вырабы. А свежую вішаньку можна было набыць у прыватным сектары і на калгасным рынку. Як бачым, ягада была ў цэнтры ўвагі. Добра, што горад знайшоў сваю "візітоўку". Аднак ці ёсць "прывязка" да гісторыі горада? Так, на афіцыйным сайце "Вішнёвага фестывалю" прачытала, з чаго ён пачынаўся. Высветлілася, што калісьці аграном Баляслаў Лапыр прывозіў з Польшчы ў Глыбокае саджанцы вішняў, устойлівыя да халадоў. А калі перанесціся ў XXI стагоддзе, то арганізацыі раённага свята паспрыяла наступнае. У 2012 годзе ў Мінску адбыўся трэці Міжнародны форум "Імідж Беларусі: час дзейнічаць" па брэндзінгу рэгіёнаў рэспублікі. Праект Глыбоцкага раёна "Вішнёвы фэстываль у Глыбокім" атрымаў на ім другое месца. А ў 2013 годзе згаданы горад стаў вішнёвай сталіцай — пры ўездзе ў яго (з боку Полацка) заклалі вішнёвы сад з 1414 дрэваў вішні (дата першага ўпамінання горада ў гістарычных дакументах). Як бачым, сама гісторыя падказала жыхарам ідэю.

Зараз хочацца адзначыць найбольш цікавыя моманты апошняга дня свята. Што ўразіла? Зацікаўленасць жыхароў Глыбокага ў мерапрыемстве. На працягу дня на Цэнтральнай плошчы знаходзіліся людзі. У асноўным на свята прыходзілі сем'ямі. Хочацца адзначыць і тое, што фестываль удала "размясціўся": амаль усе мерапрыемствы праводзіліся на плошчы. Можна было зайсці ў крамы, пасядзець у кафэ альбо правесці час каля возера Кагальнае… Яшчэ адзін станоўчы бок: дзесьці сем — дзесяць хвілін пешшу да аўтавакзала. Чым не радасць для турыстаў? Адзінае, як мне здаецца, не хапае рэкламы свята. Фестываль якасны, і хочацца, каб паболей жыхароў з іншых гарадоў пра яго ведалі.

Адпраўной кропкай гэтага святочнага дня можна лічыць прыезд на карэце Каралевы вішнёвага фестывалю. Пасля прывітальнага слова адбылося ўрачыстае шэсце — "У гасцях у Вішні", у якім прымалі ўдзел прадстаўнікі Расіі, Літвы, Латвіі, Малдовы, Германіі… Спынілася шэсце каля скульптуры "Сям'я" Івана Козака і Ігара Шостака. Пасля ўрачыстага адкрыцця скульптуры спыталася ў аўтараў пра асаблівасці твора. — "Сям'я" зроблена не з бронзы, а з новага матэрыялу — кампазіту, з якога зараз вырабляюць ваенныя караблі. Гэты матэрыял не схільны да карозіі і разбурэння, — растлумачыў Ігар Шостак.

А Іван Козак паведаміў, што гэта не першая яго скульптура на тэму сям'і: адна з серыі ўсталявана ў Расіі некалькі гадоў таму. У Глыбокім "Сям'я" камерная, здаецца, быццам бы перад намі стаяць звычайныя насельнікі Глыбоччыны — добрыя, шчырыя і шчаслівыя. Скульптура спадабалася мясцовым жыхарам: адразу пасля ўрачыстага адкрыцця людзі пачалі фатаграфавацца каля твора.

Як мне падалося, "Вішнёвы фестываль" — свята сям'і. Вялікая ўвага гэтаму інстытуту грамадства надаецца ў горадзе, пра што сведчыць не толькі лагатып (вішня — ягада "парная") ды новая скульптура. У гэты дзень ад арганізатараў, у прыватнасці, ад старшыні Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта Алега Морхата, прынялі віншаванні маладая сям'я Эдуарда і Святланы Пырэйкаў і сям'я Віктара і Дзіны Валынец, якая адзначала сярэбранае вяселле.

Што яшчэ спадабалася? Канешне, майстар-класы. Так, ганчар Сяргей Шчэрба на вачах усіх рабіў гліняны гаршчок і свістульку. Ёсць у гэтым асаблівая энергетыка… Падчас размовы з Сяргеем даведалася, што разам з жонкай ён прыехаў у аграгарадок Навасёлкі, калі настаўнічаў. Аказваецца, на тым месцы дзесьці 5 — 6 стагоддзяў таму жыў ганчар. Ды і ў зямлі сям'я знаходзіла кавалкі гліны. З таго часу і пачаўся "ганчарны" перыяд у жыцці Сяргея.

— У апошні час заняліся прапагандай беларускага мастацтва, — кажа майстар і адначасова робіць свістульку ў выглядзе птушкі. — Да нас у ганчарную сядзібу "Акарына" прыязджаюць не толькі пабавіць час. Ёсць спецыяльная праграма. Абавязкова гасцям трэба зрабіць на памяць гаршчок з гліны. А маладыя, напрыклад, могуць прыняць удзел у вясельным абрадзе. Дорым падарункі і немаўляткам… Апошнім часам прыязджаюць у "Акарыну" ў асноўным на выхадныя.

Наша размова скончылася спевам глінянай птушкі-цацкі, і я пайшла далей шукаць цікавых рамеснікаў. Убачыла, як пляце каляровыя стужкі з нітак літоўская сям'я — Раса Брэйдаконе і Альгердас Брэйдокас. Сапраўдны цуд! Яны і мне прапанавалі зрабіць "касічку". І я з зацікаўленасцю прыступіла да працы. Як даведалася, сям'я ўжо 20 гадоў займаецца гэтай справай.

— Самая старая стужка, — пачынае гаворку Альгердас, — круглая. Потым пачалі рабіць плоскія паясы, сплеценыя "пад ялінку": спачатку — нітка праз нітку, потым тэхналогія крыху ўскладнілася — нітка праз дзве ніткі. Пасля "ялінкі" пачалі плесці крыжыкам…

Я крыху перапыняю майстра і пытаюся, ці зроблена тое па ўласнай тэхналогіі?

— Што зараз прыдумаеш? Чалавек толькі кола вынайшаў. Мы спрабуем аднавіць традыцыйныя ўзоры. Каларыт фарбаў — літоўскі. У вас, напрыклад, больш блакітнага і ярка-чырвонага, а літоўскі чырвоны набліжаны да барвовага. Самая "літоўская" стужка, скажам, мае пастэльную, "ціхую" афарбоўку. Мая стужка, напрыклад, выкарыстана ў якасці пояса *(паказвае пояс на сабе)* — трымае і штаны, і кашулю. Раней іх насілі звычайна як падвязкі — у буднія дні абыходзіліся стужкамі з больш простым узорам і іншай якасці нітак. Выкарыстоўвалі і ў абрадах нараджэння дзіцяці, шлюбных абрадах… У апошніх, напрыклад, на стужцы ромбы — колазварот сонца, што азначае абарону ад непрыемнасцей.

Ці лічыць літоўскі майстар гэтую дзейнасць хобі? Не зусім. Як ён выпадарунка пераможца з Латвіі атрымаў баян і, канешне, ягады. Затым адбылася прэзентацыя калекцый ільнянога адзення "Каляровы лён-2" Алены Гужонак. Калекцыя падалася мне элегантнай і практычнай.

Прыемнае адчуванне засталося ад фестывалю, але напярэдадні (ужо ў аўтобусе) мяне чакала знаёмства са спадаром Пятром, які запомніўся мне яшчэ на свяце па саламяным капялюшыку і льняной кашулі з арнаментамі. За некалькі хвілін ён паспеў падзяліцца сваімі ўражаннямі ад свята вішні, паказаў набытыя на фестывалі рэчы. Для ўнучкі ён узяў цёплыя ваўняныя рукавіцы, а для праўнука, якому дзесяць месяцаў, набыў белую вязаную шапачку.

У дарозе ўспомніла размову ў рэдакцыі наконт фестываляў. Якімі яны павінны быць? Рознабаковымі, распрацаванымі і ўдала арганізаванымі. Чаго зараз многім і не хапае… Што да свята вішні, мне не хапіла вырабаў рамеснікаў з замежжа. Хочацца даведацца пра разнастайныя тэхналогіі і асаблівасці ў традыцыйнай культуры розных краін. І яшчэ адзіны момант: хочацца, каб у наступным годзе быў арганізаваны маштабны кірмаш для ўсёй рэспублікі, дзе кожны ахвотны зможа набыць ягады, прычым танней, чым у іншых мясцінах. Ці конкурс на самую смачную вішню… Каб жыхары горада ды турысты выбіралі. А яшчэ правесці майстар-класы па тым, як варыць з вішні джэмы, варэнне, або ставіць смачную вішнёўку, зразумела, з мясцовымі сакрэтамі і "разыначкамі".

К.

FIMU: пра музыку і не толькі

Сёлета ў французскім горадзе Бэльфоры адбыўся юбілейны XXX Міжнародны музычны фестываль моладзі (FIMU). Якія ўражанні ён пакінуў? Што цікавага на ім магло б быць карысным для нашага фестывальнага руху?

Надзея БУНЦЭВІЧ

Гарадская поліфанія

Горад Бэльфор — не такі ўжо вялікі, але з багатай гісторыяй. Апошняе 30-годдзе ягоны старадаўні цэнтр значна амалоджваецца — не за кошт будаўніцкіх "наваробак", а дзякуючы маладзёжнаму музычнаму фестывалю. У час яго правядзення горад віруе. З 14-ці сцэнічных пляцовак, палова якіх пад адкрытым небам, амаль без перапынку ліецца музыка. Ледзь завяршае выступленне адзін калектыў, як яго месца займае новы. І так — з абеду да гадзіны ночы. Усе канцэрты — бясплатныя: не толькі вулічныя, але і тыя, што праходзяць у залах.

Асаблівасці старадаўняй гарадской архітэктуры ў тым, што ніводная з адкрытых пляцовак, нягледзячы на іх геаграфічную блізкасць, не перашкаджае астатнім. І гараджанам таксама! Найбольш гучныя знаходзяцца ў нежылым раёне, ва ўстановах гэтыя тры дні — выхадныя. Так што поліфанія бывае хіба "на адлегласці". Дый час канцэртаў спланаваны так, каб пры жаданні можна было паслухаць, хаця б пакрысе, усе калектывы — тым больш, што некаторыя з іх выступаюць двойчы.

Ахоп стылёва-жанравых кірункаў — неверагодны: класіка, фольк, джаз, рок, авангардная акадэмічная музыка, эстрадныя навінкі. Хочаш ці не, а міжволі пачынаеш параўноўваць FIMU з нашым "Славянскім базарам у Віцебску". Тым больш, што фестываль у Бэльфоры таксама "перарастае" адведзеныя яму "афіцыйныя" дні, маючы канцэртную прэамбулу ў дзень напярэдадні.

Вырашыўшы стаць самым адданым слухачом і перабягаць з канцэрта на канцэрт, не загаладаеш: ежа ды напоі прадаюцца паўсюль. А вось з сувенірамі — складаней: можна знайсці хіба шклянкі з цвёрдага пластыку, упрыгожаныя фестывальнай эмблемай. Дый тое — прыдбаць іх разам з напоем. Фірменныя футболкі прадаваліся толькі ў адным месцы, прычым абмежаваны час. Так што можна толькі ганарыцца нашымі народнымі майстрамі, якія з'язджаюцца на згаданы "Славянскі базар" ды іншыя святы з усіх куткоў рэспублікі, складаючы адметнасць фестывальнага руху ў Беларусі.

Раз пляцоўка, два пляцоўка...

Усе залы на FIMU — розныя. Самая вялікая — тэатр "Граніт" у тры ярусы. Акустыка, як і ва ўсіх падобных старадаўніх будынках, неверагодная. Галёркі ў поўным сэнсе гэтага слова папросту няма: з любога месца ў зале бачна ўся сцэна цалкам (праверана на ўласным вопыце). Дарэчы, сваёй трупы ў тэатры няма: будынак выкарыстоўваецца для самых разнастайных праектаў — найперш, вядома, тэатральных.

Вялікая зала сучаснага гатэля "Atria", наадварот, хутчэй нагадвае нейкі ангар. Акустыка — здавалася б, увогуле непрыдатная: нават простая аб'яўка нумароў рэхам адскоквае ад шкляных сцен і столі. Але ж духавы аркестр, да прыкладу, тут гучыць добра. Нават больш — некаторыя недахопы выканання, як ні дзіўна, такой акустыкай "прыхоўваюцца". Для аркестравых выступленняў задзейнічана і канферэнц-зала таго ж гатэля — утульная, на паўсотні месцаў, з вялікай сцэнай і добрай акустыкай.

Цэнтр харэаграфіі ідэальна падыходзіць для паказаў мадэрн-балета і пластычных пастановак: увесь пакой, даволі прасторны, уяўляе з сябе так званы "чорны кабінет" з добрым падлогавым пакрыццём. Глядацкая частка — таксама асаблівая: замест звыклых крэслаў — нізенькія пуфікі. І вялікая адлегласць між радамі, каб танцоўшчыкі-гледачы (а іх тут бывае багата) маглі выцягнуць стомленыя рэпетыцыямі ногі. Менавіта ў гэтай зале праходзілі фестывальныя канцэрты "новай музыкі", уключаючы электронную.

Падчас аднаго з канцэртаў у Бэльфоры.

■ Павучыцца можна і эканд-хэнду "наадварот". Мы часам смяемся самі з сябе, што не можам выкінуць старыя рэчы, хаваючы іх "на ўсялякі выпадак" у лоджыі-падвале-павеці-шафе. Французы, як высветлілася, таксама "берагуць" сапсаваныя хатнія прынады, толькі для іншых мэтаў: робяць з іх адмысловыя кветнікі-інсталяцыі пасярод горада, прычым "тэматычныя".

На плошчы перад будынкам мэрыі — сцэна "Kiosque". Па сутнасці, гэта проста старадаўняя альтанка, дзе можа змясціцца толькі ансамбль з некалькіх чалавек. Збоку — кафедральны сабор, дзе таксама ладзіцца шэраг канцэртаў, прычым не толькі класічнай, але і этнічнай музыкі.

Усе астатнія пляцоўкі — адкрытыя, усталёўваюцца менавіта да фестывалю.

Як патрапіць на канцэрт?

Па горадзе — ніякіх плакатаў-"расцяжак". Ніякіх звыклых папяровых афіш. Хіба некалькі вялізных выяў фестывальнай эмблемы. Затое паўсюль па цэнтры горада, у фае любой фестывальнай залы — раздрукаваныя асобнікі ўсёй фестывальнай праграмы.

Маленькая кніжачка, што можа змясціцца ў кішэні, лёгка разгортваецца ў суцэльную "прасціну". У ёй — максімум самага неабходнага: дзе і якія канцэрты, карта, па якой добра арыентавацца, пазначаныя месцы аўта- і веластаянак, іншая карысная інфармацыя. Уласна праграма ўяўляе з сябе яркую мазаіку з рознакаляровых квадрацікаў. Зверху ўніз у гэтым графіку — маленькія выявы ўсіх 14-ці фестывальных пляцовак. Злева направа — расклад па гадзінах. На скрыжаванні — квадрацікі-канцэрты, на кожным пазначаны калектыў. А колер азначае намінацыю. Проста — і вельмі зручна.

Вакол адкрытых сцэн — ніякай агароджы. Пры ўваходзе ў залы просяць паказаць сумкі і заплечнікі: не дазваляюць праносіць спіртное, уключаючы піва. Чаргу прапускаюць паступова, кожную частку слухачоў, увайшоўшых у той жа тэатр "Граніт", валанцёры праводзяць да месца, планамерна запаўняючы ўсю залу. Калі месцаў больш не засталося, вешаюць на дзверы адпаведную шыльдачку. Хтосьці, убачыўшы аб'яву, рушыць на іншы канцэрт. А хтосьці застаецца: на месцы тых, хто сыходзіць пасля якога-небудзь нумару, запрашаюць чарговых жадаючых. Робіцца гэта вельмі проста: у кожнага з валанцёраў — перагаворны прыбор, па якім ён атрымлівае інфармацыю пра наяўнасць вольных месцаў.

У іншых залах дазваляюць і стаяць, і на падлозе сядзець, і дзяцей у калясках правозіць, не гаворачы ўжо пра немаўлят на руках у бацькоў. Усё адбываецца вельмі арганізавана, канцэрты пачынаюцца строга па графіку. Таму публіка імкнецца заняць чаргу задоўга да пачатку, каб паспець трапіць у залу.

Спадар дырэктар, дзе змясціць удзельнікаў?

Штаб фестывалю — адзін пакойчык у будынку і некалькі палатак, разбітых на вуліцы. Прыехаўшы, удзельнікі атрымліваюць тут усю інфармацыю, прымацоўваюць бэйджыкі. Яшчэ і кавай можна пачаставацца — акурат як на "Славянскім базары ў Віцебску", толькі ў больш "паходных" умовах. У гэткай цалкам дэмакратычнай абстаноўцы аказваецца зусім няцяжка знайсці дырэктара фестывалю — дакладней, аднаго з чатырох, якія замяняюць адзін аднаго, ажыццяўляючы, такім чынам, амаль пастаяннае "дзяжурства".

Удзельнікаў FIMU рассяляюць не толькі ў Бэльфоры, але і ў навакольлі. Да прыкладу, вялікія вучнёўска-студэнцкія калектывы з Беларусі і Украіны, якія прыехалі на сваіх аўтобусах, жылі ў спарткомплексе ў паўгадзіне язды да фестывальных пляцовак. А вось сталуюцца ўсе ўдзельнікі разам — у гатэлі "Atria". Як такое магчыма? Вельмі проста. Па-першае, усе калектывы размеркаваны па часе, каб не было "то густа, а то пуста". Па-другое, абсалютна ўсё, у тым ліку гарачыя стравы, расфасавана па мерных упакоўках. Ніякага мыцця посуду — толькі аднаразовыя прыборы. Бярэш з прапанаванага штосьці на выбар — і за сталы: простыя, доўгія, з драўлянымі лавамі, як на нашых традыцыйных вясковых урачыстасцях. Вядома, на фэсце з сусветнымі зоркамі такое "не пракаціць", але FIMU, нагадаю, маладзёжны.

Леў іграў на кантрабасе

Уволю пабегаўшы па канцэртах, я раптам задумалася: а ці спрабаваў які-небудзь дрэсіроўшчык даць ільву кантрабас і навучыць яго дзерці лапай струны? Натхніла мяне на такую ідэю найперш фестывальная эмблема — выява льва, які іграе на кантрабасе. Леў — сімвал Бэльфора. Ягоны вялізны высечены з камення "партрэт", які ўпрыгожвае старадаўнюю цытадэль, глядзіць акурат на джазавую сцэну. Але справа не толькі ў гэтым.

Прафесійны ўзровень многіх удзельнікаў фэсту не надта, па нашых мерках, высокі. А ў некаторых і ўвогуле "ільвіны" (у вышэй апісаным сэнсе). Бо ў FIMU удзельнічаюць не толькі суперадораныя дзеці-вундэркінды, не толькі будучыя спецыялісты — навучэнцы профільных музычных устаноў, але і так званыя "чыстыя аматары" — студэнты і працоўная моладзь. Занятыя зусім у іншых сферах дзейнасці, яны музіцыруюць выключна па поклічы душы ў вольны ад вучобы і працы час. І пры гэтым — з такім натхненнем ды апантанасцю, што можна пазайздросціць!

Тым не менш, і для знаўцаў такі фестываль дае шмат новага ды цікавага: знаёмства з невядомай раней музыкай, фальклорам, традыцыйнымі інструментамі розных краін. У ансамбля з Калумбіі, да прыкладу, аказаўся музычны інструмент, які здаецца гэткай сумессю беларускіх і венгерскіх цымбалаў.

Адметную праграму паказалі прадстаўнікі Індыі. Кампазіцыі сямейнага ансамбля (маці, бацька і маленькі хлопчык) уяўлялі сабой штосьці накшталт "варыяцый рытма" на нязменную мелодыю. Тэма, дарэчы, складалася быццам імправізацыйна: жанчына патроху намацвала яе голасам, мужчына з хлопчыкам, рэагуючы на прапанаваныя ёй меладычныя ходы, адбіралі лепшыя — на нашых вачах нараджалася тая нязменная аснова, якая пры кожным паўторы "апраналася" ва ўсё новыя па рытмафармулах адзенні. І ніякіх выбітных па тэмбры ўдарных інструментаў! Толькі бонгі — і голас, уключаючы такое майстэрства вымаўлення асобных слоў-складоў-гукаў, побач з якім блякне самы выкшталцоны рэп.

"Свая кашуля"

Бадай, адно з самых галоўных адрозненняў нашых фестываляў ад FIMU — стаўленне публікі да сваіх і гасцей. Кожны з канцэртаў у Бэльфоры збірае шмат слухачоў. Ды ўсё ж, як для нас гэта ні дзіўна, а выступленні французскіх калектываў выклікаюць папраўдзе неверагодную цікавасць. На кожным, незалежна ад намінацыі і ўзроўню — пераншлагі. На "гасцявых" канцэртах публіка звычайна "мігрыруе": прыходзіць, крыху паслухае — ды рушыць далей, на іншую пляцоўку. На французскіх — ніхто не сыходзіць, хіба ўдзельнікі гасцявых калектываў, якіх няцяжка пазнаць па бэйджыках. У нас, не трэба тлумачыць, усё наадварот. Так што патрыятызму ў французаў нам яшчэ вучыцца ды вучыцца.

Павучыцца можна і эканд-хэнду "наадварот". Мы часам смяемся самі з сябе, што не можам выкінуць старыя рэчы, хаваючы іх "на ўсялякі выпадак" у лоджыі-падвале-павеці-шафе. Французы, як высветлілася, таксама "берагуць" сапсаваныя хатнія прынады, толькі для іншых мэтаў: робяць з іх адмысловыя кветнікі-інсталяцыі пасярод горада, прычым "тэматычныя". На адным — старыя патэльні-каструлі, у якіх замест ежы — краскі. На іншых пасярод раслін — бочкі, вілы-грэблі, быццам куточак кветніка, кухонныя палічкі са слоікамі-гаршчэчкамі, імітацыя нарыхтовак на зіму. Гэтае імкненне зрабіць свой куточак адметным ёсць і ў нас. Ды звычайна мы лічым, што зрабіць штосьці адмысловае можна толькі за вялікія грошы. У французаў, як бачыце, іншае стаўленне да дызайну.

А яшчэ — да раслін. Побач з некаторымі дрэвамі ды кветкамі — шыльдачкі, як у Батанічным садзе. Французы ганарацца ўсім сваім — і правільна робяць. А мы?..

К

Месца, дзе лунае сакральнасць

Капліца-пахавальня князёў Паскевічаў у Гомелі: стварэнне і аднаўленне

Сёлетняй вясной скончыўся чарговы этап рэстаўрацыйных работ у капліцы-пахавальні князёў Паскевічаў, у выніку якога адноўлена падземная частка мемарыяльна-культавага помніка — пахавальня. Зараз у гамяльчан і гасцей горада ёсць магчымасць агледзець абноўлены склеп з яго захаванымі і адноўленымі элементамі.

Капліца-пахавальня ўваходзіць у комплекс архітэктурных аб'ектаў Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. Яна пабудавана ў 1870 — 1889 гадах у так званым "рускім стылі" з выкарыстаннем матываў маскоўскай архітэктуры XVII стагоддзя. У яе ўбранні выкарыстаны характэрныя для старажытнарускага дойлідства разны камень і мастацкі метал, чырвоная неглазураваная тэракота і шматколерная маёліка, смальтавая мазаіка і насценны роспіс. Некаторыя віды дэкаратыўна-аздабленчых работ выконваліся паралельна з мастацкім афармленнем такіх значных помнікаў культавага мастацтва "рускага стылю", як Уладзімірскі сабор у Кіеве і храм Спаса на Крыві ў Пецярбургу.

Гомельская капліца-пахавальня ўяўляе з сябе складаную архітэктурную пабудову, наземная частка якой складаецца з квадратнай у плане капліцы, накрытай высокім васьмігранным шатром з цыбульнай глаўкай. Аналагічныя глаўкі ўвенчваюць яе вуглы і склеп для пахаванняў, які афармлены невялікім наземным аб'ёмам-уваходам, адкуль лесвіца вядзе ў падземныя скляпенні.

Узвядзенне фамільнага помніка было ажыццёўлена па ініцыятыве і на сродкі князя Фёдара Іванавіча Паскевіча, які валодаў Гомельскім маёнткам з 1856 па 1903 гады. Перад пачаткам будаўнічых работ яму давялося вырашыць шэраг юрыдычных пытанняў. Яны былі звязаны з атрыманнем дазволу на будаўніцтва радавога склепа на гарадской зямлі побач з Петрапаўлаўскім саборам і сядзібай і перавозку ў Гомель бацькоў з польскага маёнтка ў Іванаўскім сяле (Дэмблін) Люблінскага ваяводства, а таксама бабулі і дзядулі з маёнтка Шчэгліцы на Магілёўшчыне.

Першапачатковы праект фасада капліцы і план, распрацаваны акадэмікам архітэктуры Яўгенам Чарвінскім, датуецца 1866 годам. У Магілёўскую губернскую будаўнічую камісію былі прадастаўлены чарцяжы архітэктара Ж. Майблюма, дасланыя ў 1869 годзе з Пецярбурга ў Гомельскі маёнтак. Канчатковы праект быў зацверджаны архітэктарам імператарскага двара Іпалітам Манігеці 21 снежня 1869 года.

Афармленчымі работамі, якія праводзіліся на працягу апошніх 10 гадоў будаўніцтва, кіравалі два архітэктары з Пецярбурга: акадэмік архітэктуры Максіміліян Месмахер і Аскар Вегенэр. Месмахер 18 гадоў быў дырэктарам Цэнтральнага вучылішча тэхнічнага малявання барона Штыгліца. У Пецярбургу дойлідам быў пабудаваны музей гэтага вучылішча, Архіў Дзяржаўнага савета (цяпер Архіў ВМФ) і мноства іншых пабудоў. Выпускнік Імператарскай акадэміі мастацтваў, мастак-дэкаратар Сяргей Садзікаў выконваў у капліцы арнаментальныя роспісы ў выглядзе кампазіцый з пераплеценых кветак, лістоў, парасткаў і прарослага васьміканцовага крыжа, змешчаныя ў арачныя маляўнічыя зводы, элементы якіх паўтараюцца з бардзюрамі раслённага характару па баках. Садзікаў таксама кіраваў пазалотай купалоў з крыжамі і падзораў. Гэтыя работы ажыццяўляла пецярбургская майстэрня Паўла Абросімава.

Прыгажосць знешняму абліччу капліцы надаюць рознакаляровыя кафлі са старажытнарускай арнаментыкай. Яны, хутчэй за ўсё, выраблены на керамічным заводзе М. В. Харламава ў Пецярбургу. А метлахская кафля для падлогі ў пахавальні была прывезена з Германіі фірмай "Е. Левянштэйн з сынамі" з найвядомага керамічнага прадпрыемства "Вілеруа і Бох".



Дэталь знешняга абліччa — кафлі са старажытнарускай арнаментыкай.

Захаваную на бакавой сцяне пахавальні мазаіку з выявамі анёлаў, зробленую на аснове роспісаў Віктара Васняцова ва Уладзімірскім саборы ў Кіеве, выконвала знакамітая ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя мазаічная майстэрня Уладзіміра Фралова, што таксама прымала ўдзел у афармленні смальтавым дэкорам царквы Спаса на Крыві ў Пецярбургу.

Ва ўбранстве помніка выкарыстаны камень, які сваім доўгім захаваннем асацыюецца з вечнасцю і падкрэслівае манументальнасць збудавання. Пастаўкамі гэтага матэрыяла ў Гомель займалася кіеўская крама мармуровых, гранітных і лабрадорных вырабаў "Тузіні і Росі" (па прозвішчах уладальнікаў). Тут быў выкананы заказ на выраб гранітных прыступак і цокаля для знешняга аздаблення капліцы з пахавальняй. Па праектных чарцяжах Вегенэра ў інтэр'еры капліцы былі зроблены з лабрадарыту алтарны стол і цокаль, а таксама мармуровая падлога ў выглядзе чорных і белых квадратных кафляў з фрызам па перыметры. Запазычаная ў мастацтве XVII стагоддзя белакаменная разьба па-майстэрску выканана невядомым майстрам на ківоце алтарнага абраза на ўсходняй сцяне капліцы, які да нашага часу не захаваўся. Мы можам параўнаць яе з мармуровым дэкорам у Кірылаўскай царкве і Уладзімірскім саборы ў Кіеве, куды таксама пастаўлялі свае вырабы Тузіні і Росі. Разны мармур выкарыстаны і для імітацыі Залатой брамы, якую можна бачыць на бакавой сцяне ў пахавальні. Тонкія арнаментальныя карункі ўпрыгожваюць іх зводы, а цэнтр займае выява ліліі, выкананая ў стылістычнай манеры мадэрна.

Абліцоўка ўнутраных скляпенняў пахавальні выканана керамічным матэрыялам з палівай і глазурай са шклянога завода, які ў той час змяшчаўся ля месца сучаснай вёскі Наспа Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці; з выгляду ён нагадвае колаты камень. Акрамя Зімовага сада, гроста і склепаў-леднікоў у сядзібе Паскевічаў, такі выгляд унутранага афармлення не мае аналогій. У будаўніцтве капліцы-пахавальні таксама ўдзельнічалі мясцовыя майстры: прараб Алерт, муляр Красніцкі, сталяр Зудзіцкі.

Вакол мемарыяльнага комплексу была ўсталявана металічная агароджа з цаглянымі слупамі, да капліцы з боку палаца вяла алея піраміда льных таполяў.

У пахавальні знаходзяцца рэшткі 8 прадстаўнікоў сям'і Паскевічаў, у тым ліку генерала-фельдмаршала Івана Фёдаравіча Паскевіча, яго жонкі Лізаветы Аляксееўны Паскевіч, народжанай Грыбаедавай, бацькі фельдмаршала Фёдара Рыгоравіча Паскевіча і яго маці Ганны Восіпаўны Паскевіч, дачкі Настассі Іванаўны Лабановай-Растоўскай і Ганны Іванаўны Валконскай, праўнучкі Аляксандры Мікалаеўны Балашавай і сына Фёдара Іванавіча Паскевіча.

Інтэр'ер падземнага склепа аздаблялі шматлікія абразы, а таксама панікадзіла, падсвечнікі і лампады з пазалочанай бронзы і серабра, ліхтары, сярэбраныя і фарфоравая вянкі на надмагіллях, мармуровыя вазы ў выглядзе пахавальных урн, якія да нашых дзён не захаваліся.

Сур'ёзную шкоду пацярпеў помнік падчас Вялікай Айчыннай вайны. У 1945 — 1949 гадах былі зроблены абмеры і фотафіксацыя з мэтай вызначэння нанесеных страт. У 1953 годзе Пастанаўленнем Савета Міністраў БССР капліца-пахавальня была ўзята пад ахову дзяржавы як помнік архітэктуры рэспубліканскага значэння. У 1969 — 1976 гадах Спецыяльнымі навукова-рэстаўрацыйнымі вытворчымі майстэрнямі (г. Мінск) была праведзена яго рэстаўрацыя, пасля чаго аб'ект паступіў на баланс музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. У 1980-я спецыялістамі БСНРПО "Белрэстаўрацыя" былі пазалочаныя купалы, крыжы і элементы, імітуючыя жгуты, на шатровым даху капліцы. З 2008 года па праектна-каштарыснай дакументацыі ПРУП "Праектрэстаўрацыя" і інстытута "Гомельграмадзянпраект" пачаўся новы этап рэстаўрацыйных работ, якія працягваюцца і цяпер.

Будучы цудоўным кампазіцыйным завяршэннем гістарычнай тэрыторыі парка с паўночнага боку Гомельскага палацава-паркавага ансамбля і яскравым узорам архітэктуры "рускага стылю", капліца-пахавальня князёў Паскевічаў з'яўляецца месцам апошняга прытулку членаў гэтай сям'і, а таксама красамоўным помнікам тым, хто на працягу 19 гадоў будаваў і аздабляў гэта найскладанае сакральна-культавае збудаванне.

Капліца-пахавальня князёў Паскевічаў у Гомельскім палацава-паркавым ансамблі.

Таццяна ЛІТВІНАВА,
кандыдат мастацтвазнаўства, загадчык мастацкага аддзела музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 3.)

Музей-карабель, або Вандроўка па 12 прычалах

Старадаўняя Тора, каменны крыж і бронзавы складзень: колькі словаў пра новую ўстанову культуры Верхнядзвінска

Што і казаць, увага музейшчыкаў Верхнядзвінска да брэндаў, тым больш мясцовага і вясковага ўзроўню, не можа не радаваць: менавіта такі падыход і дазваляе прыцягнуць увагу турыстаў, спешчаных турэцкім ці іспанскім сонцам, да цікавостак роднай зямлі. З вопыту камандзіровачных выездаў магу сказаць, што так паступова пачынаюць рабіць і ў іншых раёнах Беларусі. Так што трэнд да брэндавасці ў айчынных музейшчыкаў сёння — навідавоку.

Планы і перспектывы

Па словах Антона Бубалы, час ад часу іхнія калекцыі працягваюць папаўняцца новымі экспанатамі. Тымі ж арабскімі дырхемамі, рытуальнымі нажамі і сякерамі жалезнага веку, старадаўнімі жаночымі ўпрыгожваннямі, іконамі, бронзавымі крыжамі ды нават планам генеральнага межавання горада Дрыса 1780 года… Ды і самі музейшчыкі не спяць у шапку: плануюць у хуткім часе арганізаваць раскопкі на замчышчы Сокал разам з Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук ды папоўніць сваю калекцыя выяўленымі артэфактамі. Так што ў будучыні "плаваць" па віртуальнай музейнай Дрысе ды "спыняцца" на яе шматлікіх прычалах будзе яшчэ больш цікава…



Адзін з "прычалаў" музея.

Яшчэ адной "знаходкай" — праўда, ужо не на раскопках, а ў самім музеі, — сталася для ўстановы культуры сёлетняя музейная Ноч, у якой прынялі ўдзел не толькі самі музейшчыкі, а і супрацоўнікі раённага Дома рамёстваў ды мясцовай школы мастацтваў. Падчас традыцыйнай міжнароднай акцыі ладзіліся выступленні дзіцячых калектываў, флэш-мобы і квэсты, майстар-класы і выставы майстроў народнай творчасці. Як кажа Маргарыта Бембель, іхняя акцыя зацікавіла многіх жыхароў горада, таму падобны крэатыў у музеі плануецца ладзіць як мага часцей…

З больш аддаленых планаў — усталяванне ў музеі найноўшага тэхнічнага абсталявання, аўдыягідаў, QR-кодаў ды размяшчэнне салона-крамы па продажы сувенірнай прадукцыі. Маргарыта Бембель сама з'яўляецца спецыялістам у сферы турызму (скончыла адпаведны факультэт у Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце), таму і без маіх тлумачэнняў адзначыла, што сувеніры ў яе ўстанове ў хуткім часе павінны быць прадстаўлены ў як мага большай колькасці. Ды і план платных паслуг, натуральна, для музейшчыкаў ніхто не адмяняў…

Дадам, што сама Маргарыта Бембель працуе на сваёй пасадзе толькі з красавіка бягучага года, таму многіх сваіх планаў ажыццявіць яшчэ проста не паспела. Пра ўсе свае рэалізаваныя крэатыўныя праекты дырэктар музея паабяцала інфармаваць "К". Іншая справа, што затрымаць на гэтым месцы маладога і перспектыўнага спецыяліста, чыя праца, як вядома, у сферы культуры не надта добра сёння аплачваецца, будзе, на мой погляд, досыць складана. Праўда, як адзначыла Надзея Масквічова, яна будзе прыкладаць усе намаганні, каб Маргарыта Бембель засталася на сваёй пасадзе як мага даўжэй, аказваючы ёй дапамогу як у арганізатарскім, так і ў фінансавым плане, сыходзячы, натуральна, з наяўных магчымасцяў аддзела. Але ж, як кажуць, сэрцу не загадаеш: прынамсі, на мой запыт аб змене працы, дырэктар музея мне нічога не адказала. Так што пытанне пра тое, ці зменіцца кіраўнік музея ў Верхнядзвінску праз год або два, застаецца пакуль што адкрытым.

К

Фатаграфія як код і выклік

Тое, што ў Антона Прушынскага была дагератыпная майстэрня, — гаворыць пра многае. Але для мяне самым адметным у яго дзейнасці з'яўляецца магчымасць убачыць беларускую шляхту таго часу.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

На жаль, абліччы герояў паўстання 1863-га, захаваныя на фотаадбітках, пабачыць у нашым візуальным полі практычна немагчыма. Яны сустракаюцца яшчэ радзей, чым дарэвалюцыйныя партрэты заможных гараджан. Тым не менш, як сведчыць даследчыца, кандыдат гістарычных навук Вольга Гарбачова, Прушынскі не быў адзіным фатографам на беларуска-літоўска-польскіх землях, які практыкаваў патрыятычны партрэт. Варшавянін Караль Баер рабіў пасмяротныя здымкі паўстанцаў (іх сваякоў), выкарыстоўваючы выявы для ўзмацнення духу супраціўлення. Пасмяротны здымак Уладзіслава Сыракомлі таксама быў зроблены невядомым фатографам, у тым ліку ў патрыятычных мэтах. Фатаграфія Рамана Бохвіца ў нацыянальным адзенні, выкананая Валенціем Ржавуцкім у Кракаве, сталася падставай для разбірацельства і даследавання ў дачыненні апошняга з боку афіцыйных уладаў. "Альбом фотаздымкаў, падараваных У. Міцкевічу ліцвінамі з Менска ў 1861 г.", які знаходзіцца ў Польскай бібліятэцы ў Парыжы, захоўвае партрэты паўстанцаў з менскіх, навагрудскіх, горацкіх, віленскіх земляў; фонд "Архіў музея графа М.М. Мураўёва" з Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага фотаархіва ўтрымлівае, у прыватнасці, малавядомы здымак Кастуся Каліноўскага… У гэтым кантэксце нельга не ўзгадаць альбом "Партрэты паўстання" беларускіх даследчыкаў Камілы і Язэпа Янушкевічаў, выдадзены ў 2014-м і дапоўнены ў 2015-м годзе, які робіць спробу злучыць у адзін збор выявы змагароў з архіваў і калекцый Беларусі, Літвы, Польшчы. Бадай, адна з першых работ, якая папулярызуе гэту каштоўную візуальную спадчыну і для беларусаў.

Як можам заўважыць, крыніцы для даследавання і раскрыцця аблічча беларускага (ліцвінскага) патрыёта ёсць. І работы Антона Прушынскага займаюць тут адно з пачэсных месцаў. Фатаграфія не толькі як "вобраз" на памяць, але як пэўны код і выклік. Як знак, які разумеюць не толькі свае. К

Класік з патрыятычнай пазіцыяй

(Заканчэнне.

Пачатак на старонцы 1.)

Часцей за ўсё ў фатаграфічнай майстэрні Прушынскага вырабляліся партрэты. Менавіта яны прыносілі фатографу асноўны прыбытак. Таксама тут выконваліся рэпрадукцыі з карцін, абразоў. Незадоўга да паўстання 1863 года Антон Прушынскі ў сваёй фотамайстэрні вырабляў партрэты, якія мелі выразны патрыятычны змест. Трэба адзначыць, што ў гэты перыяд у свядомасці даволі значнай часткі насельніцтва заходніх губерняў працягвала жыць надзея на аднаўленне ў ранейшых межах іх былой радзімы — Рэчы Паспалітай. Фатаграфія была для Прушынскага сродкам, які дапамагаў не толькі выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю, але і абудзіць, падтрымаць патрыятычныя пачуцці ў іншых. Для гэтага фатограф карыстаўся рознымі метадамі. Ён мог здымаць сваіх кліентаў у характэрным адзенні, напрыклад шляхецкай чамарцы, альбо ўключаць у кампазіцыю здымка пэўныя прадметы-сімвалы, якія ўскосна распавядалі нам аб перавагах мадэлі. Дзякуючы рэпутацыі Прушынскага, у яго было і сваё, адмысловае кола кліентаў-аднадумцаў, якія таксама падтрымлівалі вызваленчы рух.

Усе вышэйназваныя элементы прысутнічаюць ва ўжо хрэстаматыйным фатаграфічным партрэце Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Ён выкананы Прушынскім у класічных традыцыях патрыятычнага здымка. Апрануты ў чамарку — шляхецкае адзенне, папулярнае ў Рэчы Паспалітай у XVIII стагоддзі, якую актыўна, у знак пратэсту, сталі насіць мужчыны Мінска ў 1861 — 1862 гадах, Дунін-Марцінкевіч трымае ў руцэ згорнуты ў некалькі разоў друкаваны аркуш. Цікава, што загаловак выдання па-зней быў сцёрты з эмульсійнага слою рукой рэтушора. Па адным з меркаванняў, Дунін-Марцінкевіч трымае ў сваіх руках нумар першай беларускай нелегальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай газеты "Мужыцкая праўда".

У фотамайстэрні Прушынскага таксама мелася выраблене па адмысловай замове крэсла. Калі ў пачатку 1863 года Антон Антонавіч быў арыштаваны, у следчай справе адным з фактаў, прадстаўленых абвінавачваннем, быў той, што Прушынскі ў сваёй дагератыпнай майстэрні выкарыстоўваў пры здымках крэсла з высокай спінкай, наверсе якой знаходзіліся малюнкі "Арла" і "Пагоні" (герб Рэчы Паспалітай — **Н.С.**). Гэтае крэсла фігуравала на следстве і як рэчавы доказ. Шэраг такіх партрэтаў (напрыклад, прапаршчыка М. Цюндзевіцкага) быў канфіскаваны паліцыяй падчас рэвізіі фотамайстэрні Прушынскага і служыў доказам яго прыналежнасці да патрыятычнага руху. Па прыгаворы суда 1863 года Антон Прушынскі быў адпраўлены на пасяленне ў Томск. Разам з Прушынскім у далёкае выгнанне выправілася і яго сям'я — жонка і трое дзяцей. У Томску ён зноў, як калісьці ў маладосці, зарабляў на жыццё ўрокамі музыкі, а ў 1864-м адкрыў невялікую фатаграфічную майстэрню, валодала якой фактычна яго жонка Пелагея.

У 1873-м сканчваецца тэрмін высылкі і разам з ёю суровыя выпрабаванні, якія выпалі на долю гэтай дружнай сям'і. Прушынскія з'язджаюць у Варшаву. Там на вуліцы Nowy Swiat, 34, а затым на Chmielnej, 25 Антон Прушынскі адчыняе ўласнае фотаатэлье. Спачатку пад шыльдай "Афтаназий Пуцята" (па прозвішчы цесця свайго сына), а з 1892 года ўжо пад уласным імем.

На сёння арыгінальныя адбіткі, выкананыя ў мінскай і варшаўскай фатаграфіях Прушынскага, захаваліся ў асноўным на тэрыторыі Польшчы. Сямейныя фатаграфіі Прушынскіх былі выяўленыя ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве (беларускім гісторыкам У.М. Дзянісавым). Дзве фатаграфіі — партрэт Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і партрэт Уладзіслава Гаціскага — захоўваюцца на тэрыторыі Беларусі. Першая — у Мінску, у Нацыянальным гістарычным, другая — у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеях.

1860 — 1862 гг. Партрэт В. Дуніна-Марцінкевіча Антона Прушынскага.

1858 г. "Партрэт маці" — пакуль першая беларуская фатаграфія.

"Замах" на жывапісны партрэт

Пачатак фатаграфіі — рамантычнае XIX стагоддзе. Але і яно ўсё часцей адгукалася на выклікі тэхналагічнай рэвалюцыі. Вынаходзілі ўсе і ўсё. Ідэя новага выяўленчага сродку, здольнага ўлоўліваць і фіксаваць рэчаіснасць з дапамогай светлавога промня і лінзы, літаральна вісела ў паветры. Над гэтым працавалі лепшыя розумы Еўропы і Амерыкі. Бліжэй за ўсіх былі немцы і англічане, але першым удалося атрымаць вынік французам.

Юрый ВАСІЛЬЕЎ

Самая старадаўняя фатаграфія, якую захавала чалавецтва, зроблена ў 1826 годзе адстаўным ваенным Нісефорам Ньепсам. Сваю "геліяграфію", так называлася вынаходніцтва, Ньепс стварыў з дапамогай знакамітай "камеры абскура" — прататыпу сучаснага фотаапарата і алавянай пласціны, пакрытай тонкім слоем асфальту, апрацаванага лавандавым маслам. Аб'ектыў камеры, выстаўлены на падаконніку ў майстэрні, быў адкрыты больш за дванаццаць гадзін. Для практычнага выкарыстання вынік аніякі, але сама магчымасць атрымання выявы такім чынам усяляла надзею і нават упэўненасць. Здымку хутка споўніцца дзвесце гадоў.

Вопыты Ньепса прадоўжыў іншы француз — Луі Жак Дагер. Мастак і прадпрымальнік, ён шукаў рэальную выгоду ад вынаходніцтва. Дагер удасканаліў вынаходніцтва Ньепса. У якасці адчувальнага слою ўпершыню выкарыстоўваецца серабро, апрацаванае парамі ёду. У той час з'явілася больш якасная оптыка для камеры, і ўсё разам дазволіла скараціць час экспазіцыі да 8 — 10 хвілін. Яшчэ шмат, але ўжо прымальна.

Далей — працяглы перапынак, падчас якога шукаліся шляхі, як захаваць прыярытэт Францыі ў гэтым адкрыцці. Па сутнасці, яно было настолькі простым, што пасля апублікавання ні аб якой ліцэнзіі не магло быць і гаворкі. Без апублікавання яно не магло лічыцца дзейным адкрыццём. У гэтай сітуацыі французскія ўлады вырашылі набыць права на выкарыстанне фатаграфіі і прызначыць Дагеру і яго кампаньёну Ісідору Ньепсу (сыну і спадкаемцу Ньепса) пажыццёвыя дзяржаўныя пенсіі. Цікавы факт. Французскі ўрад не быў бы французскім урадам, каб не паклапаціўся аб жонках вынаходнікаў. Тым у выпадку страты сужонкаў пенсіі захоўваліся пажыццёва ў палавінным памеры.

Дагер у паўзе, якая стварылася, пакутліва думаў, як назваць вынаходніцтва, і ў гэтым ён паступіў не так мудра, як урад. У пэўнай меры ён узурпаваў уклад першаадкрывальніка Ньепса і назваў вынаходніцтва сваім імём — "дагератыпія". Цяпер усе праблемы былі вырашаны, і 19 жніўня 1839 года вынаходніцтва было апублікаванае і гэтым жэстам падараванае свету.

Менавіта дагератыпную майстэрню і адкрыў у Мінску на вуліцы Францысканскай у 1850 годзе Антон Прушынскі праз 11 гадоў пасля апублікавання вынаходніцтва Дагера. Што ж гэта быў за працэс — "дагератыпія"? На той час ён быў самы небяспечны і працаёмкі. Для праяўкі выкарыстоўваліся пары ртуці і іншыя шкодныя элементы. У ім былі задзейнічаны паліраваныя металічныя пласціны, у тым ліку з каштоўных металаў. Яму ўласцівыя доўгія вытрымкі пры здымках, калі міргаць было можна, але рухацца нельга; менавіта таму дзяцей пры фатаграфаванні прыходзілася нават прывязваць. Тое быў і самы дарагі працэс, з выкарыстаннем золата і серабра, якія і складаюць сутнасць дагератыпіі.

Але, нягледзячы на ўсе гэтыя цяжкасці, дагератыпія імгненна захапіла свет. Прыгажосць і вытанчанасць выявы, напоўненай аптычнымі падрабязнасцямі ў дэталях, з матавымі водбліскамі ў паўтонах, якія серабрацца, заклалі з першых крокаў у фатаграфіі асаблівую непаўторнасць новай выяўленчай творчасці. Дагератып быў не проста фотакарткай, звыклай для сучаснага свету. Гэта была пэўная рэч, афармленая ў дарагім акладзе з аксаміту, на фоне якога яна асабліва добра глядзелася, з вечкамі, якія зберагалі выяву ад прамых сонечных промняў. І на фоне ўсяго гэтага ўбранства — выява блізкага і дарагога чалавека. Гэта з'яўлялася свайго кшталту "замахам" на жывапісны партрэт. З'явіўся новы від партрэта — больш танны, дакладны, той, які зачароўвае. Гісторыя гэта вельмі хутка пацвердзіла.

Неўзабаве быў адкрыты новы, больш просты і даступны працэс — калатыпія, але дагератыпы праіснавалі, тым не менш, яшчэ сорак гадоў. У тым ліку таму, што такой містычна прыгожай выявы фатаграфія больш не будзе мець ніколі.

Вынаходнікам калатыпіі стаў англічанін Фокс Талбот. Ён літаральна стварыў прынцыпова іншую фатаграфію. Калатыпія з'явілася першым двухступенным негатыўна-пазітыўным працэсам, які выкарыстоўваецца ў фатаграфіі да гэтай пары. Пазней гісторыя аб'яднала вынаходніцтва Ньепса, Дагера і Талбота адным грэчаскім словам — фатаграфія. "Фота" — святло, "графія" — малюю. Малюнкі святлом.

На жаль, дагератыпаў беларускага паходжання пакуль знайсці не ўдалося, хоць яны, напэўна, былі. Пра гэта кажа развітое еўрапейскае грамадства. Прычын шмат. У тым ліку войны і рэвалюцыі, якія адбыліся на тэрыторыі Беларусі, дрэнная захаванасць адчувальнага слоя. Увогуле, рэч гэта рэдкая і дарагая для тых, хто іх мае. Некалькі дагератыпаў захоўваюцца ў Віцебскім краязнаўчым музеі, але яны зроблены не беларускімі фатографамі. Прадстаўлены "Партрэт маці" выкананы ў 1858-м годзе. І на сёння гэта самая старадаўняя фатаграфія, зробленая на тэрыторыі Беларусі. Захоўваецца яна ў Нацыянальнай бібліятэцы Варшавы. Да гэтага часу Прушынскі засвоіў новы мокракалоідны негатыўна-пазітыўны працэс, які выкарыстоўвае папяровы носьбіт.

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.

Выставы:

■ Выстава **"Сучасная Беларусь вачыма мастакоў"** (творы мастакоў розных пакаленняў, розных творчых памкненняў і кірункаў) — да 21 жніўня.
У рамках праекта працуе выстава **"Крохкая прыгажосць"**, на якой прадстаўлены экспанаты з калекцыі музея вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Барысаўскі хрустальны завод імя Ф.Э. Дзяржынскага", створаныя з пачатку XX стагоддзя да нашых дзён.
■ Выстава **"Школа класікаў. Беларускае і рускае мастацтва XIX–XX стагоддзяў"** (больш за 80 твораў жывапісу і графікі) — да 7 жніўня.
■ Выстава **"Рэпліка прыгожага"** (злепкі скульптуры, створаныя ў майстэрні-атэлье Луўра) — да 1 верасня.
У рамках выставы праводзіцца серыя лекцый, якія чытаюцца на працягу ўсяго лета, кожную сераду а 17-й гадзіне.
■ Выстава Мікалая Дубровы **"Зямля палеская"** (прадстаўлена больш за 20 твораў жывапісу ў жанрах пейзажа, партрэта і тэматычнай карціны з калекцыі аўтара) — да 29 жніўня.
■ На плошчы Свабоды праходзіць выстава партрэтаў легендарных мінчан **"Свабодны музей: гарадскія легенды"** (размешчана 20 рэпрадукцый шэдэўраў партрэтнага жывапісу з калекцыі музея) — да 30 верасня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
■ Выстава **"Жыццё і творчасць Мельхіёра Ваньковіча"** — да 30 жніўня.
■ Выстава літаграфій **"Памятныя мясціны Беларусі ў творчасці Напалеона Орды"** з фондаў музея — да 30 жніўня.
■ Кожную пятніцу і суботу з 17.45 да 21.00 у дворыку дома-музея адбываецца танцавальны Open air і бясплатны майстар-клас для пачаткоўцаў "з нуля".

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Давыд-гарадоцкі роспіс"** з прыватнага збору А.М. Арлова, аднаго з першых даследчыкаў феномену "цікетак" — да 4 верасня.
■ Кожную суботу ў 12.00 у музеі праходзяць майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў, саломкапляценні і роспісе яек.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Выставачны праект **"Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля"**.
■ Выстава фотамастачкі Марыны Бацюковай **"Сула. Непарыўнае"** — да 11 верасня (у дворыку музея).
■ Фотавыстава **"Кола часу"** (Беларуская вёска. 60 — 90-я гады XX стагодзя) — да 7 жніўня.
■ Выстава мініяцюрных скульптур Маргарыты Дабрынінай **"Карабель дурняў"** — да 2 верасня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Выстава **"Свет савецкіх салдацікаў"**.
■ Выстава **"1950 — 1960: адценні чырвонага"**, прысвечаная савецкаму перыяду ў гісторыі нашай краіны, — да 14 жніўня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Персанальная фотавыстава Аляксандры Пяхота **"Падарожжа дадому"** — да 5 верасня.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.
■ Незвычайны атракцыён **"Стужкавы лабірынт"** — да 31 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выставы:

■ Выстава **"Напышлівыя кветкі"** — да 31 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
■ Выстава **"Старыя героі — новы свет. Героі беларускіх казак, міфаў і легенд"** — да 28 жніўня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава серыі карцін **"Лічбы на сэрцы"** Героя Беларусі, народнага мастака СССР і Беларусі, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Міхаіла Савіцкага.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Археалагічныя знаходкі палаца вялікіх князёў літоўскіх. Штодзённасць Віленскага двара"** з фондаў Музея-палаца вялікіх князёў літоўскіх (Вільня) — да 11 верасня.
■ Выстава **"Час. Рэчы. Прасы"** — да 18 верасня.
Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
■ Выстава **"Падарожжа"** — да 4 жніўня.
Слуцкая брама
■ Інсталяцыя **"Застыўшыя хвіліны цішыні"** — да 30 верасня.
Ратуша
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** — да 5 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"**.
■ У дні летніх канікул музей запрашае на праграму культурна-адукацыйных мерапрыемстваў **"Канікулы ў Доме Коласа"** (па папярэднім запісе).
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"** (праводзіцца па заяўках; маршруты могуць змяняцца ў адпаведнасці з пажаданнямі экскурсантаў).
■ Выстава работ Міколы Купавы **"Алаіза"** да 140-годдзя Алаізы Пашкевіч (Цёткі).

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава **"Горад, які мы не бачылі. Мінск на малюнках 1940 — 1950-х"** (прадстаўлена больш за 50 работ выбітных дойлідаў, якія сфарміравалі вобраз сучаснага Мінска) — да 11 верасня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Рэканструкцыя інтэр'ераў былога сядзібнага дома **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выстава аўтарскіх лялек **"Маленькая казка Настассі Адамовіч"** — да 31 ліпеня.
■ Выстава жывапісу і скульптуры Спартака Аруцюняна **"60 адценняў чырвонага"** — да 31 ліпеня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

■ Выстава твораў мінскага мастака Алега Ладзісава **"Ад плюса да мінуса. І назад"** — да 28 жніўня.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

■ Выставачна-адукацыйны праект **"Па слядах мамантаў"** — да 30 верасня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня"**.
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея"**.
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:

■ Выстава жывапісных работ Алеся Сушы **"Беларусь, мая шыпшына..."** — да 31 ліпеня.
■ Выстава **"Ад класікі да фэнтазі"** — да 28 жніўня.
■ Выстава **"Паралельны свет, або Міфы пра дамавікоў і лесавікоў"** — да 25 верасня.
■ Выстава **"Міранда. Двухсотгоддзе. Мінулае і сучаснасць барацьбы за незалежнасць"** (памяці нацыянальнага героя Венесуэлы Францісіка дэ Міранды) — да 31 ліпеня.
■ Выстава **"Атлантыда. Мігатлівыя скарбы Ёнагуні"** (аўтарскі праект даследчыка японскай культуры Уладзіслава Фаміна-Асака) — да 25 верасня.
Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.

Выставы:

■ **"Родны край, навек любімы"** — мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў (з фондаў музея), — да 31 ліпеня.
■ **"Мудрая думка"** — выданні ўсходняй літаратуры другой паловы XX ст. — да 31 жніўня.
■ **"Вытокі фэнтазі"** — да 1 верасня.
Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.
Зімовы сад
■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл"**.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"І памяць сэрца гаворыць"**.
■ Выстава **"Мы ўспомнім зноў мінулую вайну..."**
■ Выстава **"Зброя для моцных духам"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**, прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

г. Іўе, вул. 17 верасня, 9.
Тэл. (8-01595) 2-68-96

■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Яўрэйская культура і рэлігійныя традыцыі"**, **"Вачыма тых, хто быў у баі"**.
■ Фотавыставы **"Фарбы Беларусі"** Віталя Раковіча, **"Сучасны партрэт"** Крысціны Фацеевай.
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка", паслуга "Дні нараджэння ў музеі".

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава па выніках Міжнароднага пленэра жывапісу памяці выдатнага мастака, акадэміка Расійскай імператарскай акадэміі мастацтваў Станіслава Жукоўскага — да 7 жніўня.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

■ Юбілейная выстава Леаніда Данеліі, прымеркаваная да 70-годдзя мастака — да 8 жніўня.
■ Юбілейная выстава Мікалая Драненкі, прымеркаваная да 70-годдзя мастака — да 8 жніўня.
■ Юбілейная выстава Лявона Грышука, прымеркаваная да 65-годдзя мастака — да 8 жніўня.
■ Юбілейная выстава Аляксандра Грэся, прымеркаваная да 65-годдзя мастака — да 8 жніўня.
■ Выстава памяці мастака Анатоля Ізаіткі — да 8 жніўня.

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41,
альбо пішыце на электронны адрас
kultura@tut.by!